№ 32 (390) 27 жніўня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Аляксей Янукевіч**
Новая гутарка з сэрыі «пакаленьне next». старонка 4

**Чалавек у ролі Бога**
Ліцэнзія на кланаваньне і біябясьпека Беларусі. старонка 9

**Паліхромная Брытанія**
Эсэ Ўладзімера Арлова. старонкі 14–15



### Увага!

Ідзе падпіска на чацьверты квартал. «Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага жыцьця на 16 старонках без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — 2700 рублёў на поштах або 2500 рублёў на шапікі «Белсаюздруку» ў Менску.

З УСЁЙ КРАІНЫ

### Кручкоўскі супраць Мілінкевіча

Інтрыгаю выбараў у Шчучынска-Воранаўскай акрузе стала вылучэньне старшыні Саюзу палякаў Тадэвуша Кручкоўскага. Акрамя яго, нефармальнаму лідэру дэмакратаў Гарадзеншчыны Алесю Мілінкевічу будзе супрацьстаяць прэзыдэнцкі інспэктар па вобласьці, былы кіраўнік Шчучынскага раёну Вінцэнт Казяк.
Іншыя паведамленьні з усёй краіны — **старонка 5.**

МОВА

### Анкета: клясычны правапіс

Набліжаецца да заканчэньня праца над Зводам правілаў беларускага клясычнага правапісу (тарашкевіцы). Шэраг пытаньняў, якія паўсталі перад сябрамі працоўнае групы, выклікае дыскусіі, таму працоўная група вырашыла зьвярнуцца да грамадзтва з анкетаю. **Старонка 9.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Да новых перамог

Збожжа ўсё больш, волі ўсё менш

**Старонка 2.**

АЛІМПІЯДА-2004

## Наша золатка



AP

Другая палова мінулага тыдня прынесла беларусам доўгачаканыя мэдалі. Цэлых адзінаццаць. Зь іх два — залатыя. Зьявілася і гераіня гульняў — самая хуткая жанчына плянэты. Юлія Несьцярэнка адказвае на пытаньні — **старонка 3.**

## Ліцэй набраў першакурсьнікаў

**Сёлета Беларускі ліцэй набраў толькі адну групу першакурсьнікаў. Ахвоту пачаць навучаньне на першым курсе выказалі 9 чалавек. Яшчэ 5 навучэнцаў дадаліся на іншыя курсы.**

Лявон Баршчэўскі ў размове з карэспандэнтам «НН» быў крыху расчараваны: чакаў, што ў Менску больш азвецца беларускамоўных бацькоў. Аднак ён не губляе аптымізму і спадзяецца, што да пачатку верасьня колькасьць першакурсьнікаў павялічыцца. Прычынай такой малой актыўнасьці Баршчэўскі лічыць адсутнасьць сталага памяшканьня: бацькам страшнавата адпускаць дзяцей 8—9-х клясаў «боўтацца» з кватэры на кватэру. 10—11-клясьнікам бацькі давяраюць болей. Магчыма, у будучыні Ліцэй пяройдзе на набор толькі дзьвюх старшых паралеляў.

Сёлетнія прэтэндэнты на званьне ліцэістаў здавалі іспыты па беларускай мове (пісьмовы тэст) і замежнай мове (тэст і сумоўе). Ад традыцыйнага для Ліцэю экзамэну па гісторыі Беларусі выкладчыкі вырашылі адмовіцца: умовы не спрыялі.

**Працяг на старонцы 10.**

ВЫБАРЫ

## Канаплёў у няласцы?

Кіраўніца «Беларусбанку» Надзея Ермакова можа стаць кандыдаткай у дэпутаты палаты прадстаўнікоў па Шклоўскай акрузе №75. Яе гатовыя вылучыць калектывы адразу некалькіх прадпрыемстваў раёну. У такім разе яна будзе процістаяць цяперашняму віцэ-сьпікеру палаты і сябру дэпутацкай групы «Рэспубліка» ... цінства А.Лукашэнкі Ўладзімеру Канаплёву.

Гэты факт ускосна пацьвярджаецца тым, што супрацоўнікі штабу У.Канаплёва прапаноўвалі некалькім сябрам апазыцыйных партый з Шклова зьбіраць подпісы за свайго шэфа. Усе адмовіліся, дарэчы.

Акруга №75 незвычайная. У яе ўваходзяць аж тры раёны: Шклоўскі, Бялыніцкі, Круглянскі. Ад БНФ у ёй мае стартаваць лідэр магілёўскае арганізацыі Рыгор Костусеў.

**Мікола Бугай**

ХАРЭЎСКІ




**Аляксандар Лукашэнка ўзнагародзіў ордэнам Скарыны пасла Расейскай Фэдэрацыі ў Індыі Вячаслава Трубнікава.**



## Заходнікі наперадзе

Намалоты ў абласьцях на 25 жніўня, ц/га

| | |
|---|---|
| Горадня | 44 |
| Берасьце | 34,7 |
| Менск | 31,9 |
| Магілёў | 31,8 |
| Віцебск | 28 |
| Гомель | 28 |

# Ахвяры бітвы за ўраджай

У савецкія часы папулярнай была гісторыя пра піянера-героя, які склаў сваю галаву ў бітве за ўраджай. Машына на калгасным полі падчапіла разам з бульбаю старую бомбу. Піянер ня даў лататы — як каршун ён кінуўся да аб'екта свайго подзьвігу, прытуліў да цела. Бомба ня вытрымала такой увагі і падарвалася. Агітатаркі падкрэсьлівалі, што сваім ахвярным учынкам піянер-герой выратаваў (рэліктавую) калгасную тэхніку — што дазволіла пасьля перавыканаць плян уборкі.

Штогод мыператвараемся ў ахвяраў бітвы за ўраджай. Ураджай адстрэльваецца, агрызаецца з акопаў, а стомленыя камбайнэры бяруць закладнікаў. Штогод журналісты на каманду Галоўнакамандуючага лезуць пад карову, мацаюць зерне і абвяшчаюць перамогу над злосным ворагам.

Вось толькі эканамічных падстаў для такой бітвы няма. У Злучаных Штатах ці ў Канадзе з ураджаем чамусьці не змагаюцца — а ўбіраюць і прадаюць, і ня ведаюць нават куды падзець.

Ёсьць палітычныя падставы для вайны. Калгасы прагнілі дазваньня, але зьяўляюцца крыніцаю рабства і — паводле прызнаньня кіраўніка дзяржавы — хрыбтом дыктатуры на вёсцы. Калгасна-вайсковае змаганьне ёсьць дадатковым апраўданьнем спарахнелай сыстэмы. Рукі ў людзей занятыя.

Ёсьць — акрамя навязьлівых настальгічных комплексаў галоўнага экспэрта па саўгасах — і сымбалічныя прычыны вайны. Любая ўлада трымаецца на сымбалях, але ў выпадку зь сёньняшняй беларускай сыстэмай гэтыя сымбалі надзвычай архаічныя.

Як у хворай на Кім Ір Сэна Паўночнай Карэі і як у часы Сталіна, кіраўнік на жытнёвым полі — гэта забыты Бог-апладняльнік, які згвалтаваў зямлю, узяў яе і стаў сымбалічным Бацькам усяго жывога. Усё жывое — ахвяра бітвы за ўраджай — і мусіць дзякаваць новапрызначанаму стваральніку за існаваньне.

Ды толькі ў постіндустрыйныя часы аграрная архаіка блякне. Бітва за ўраджай не канкурэнт «Doom'у», яна ня здольная цягацца па папулярнасьці з галівудзкімі шоў. Гэта інэрцыя безнадзейна памерлага, якая ператварае саміх стваральнікаў і замоўцаў у ахвяры.

Ахвяры архаічныя, недарэчныя, сарамліва-сьмешныя — і даўно ўжо нікому не патрэбныя.

**Андрэй Расінскі**

# Шлюб па-беларуску



**Маладыя гамельчукі Юнэля Сальнікава й Віталь Крупенька (на фота) прыйшлі ў ЗАГС зарэгістраваць свой шлюб. Па-беларуску, вядома, — на мове штодзённых зносін. Аднак у аддзеле ЗАГС Савецкага раёну Гомелю ім адмовілі. Маўляў, «тэксты беларускамоўных сцэнароў пасьля рэфэрэндуму 1995 г. згубленыя», а праводзіць цырымонію па-беларуску будзе мэтазгодна, калі хоць некалькі маладых пар у адзін дзень запатрабуюць гэтага. Літаратуразнаўка Ю.Сальнікава і яе будучы муж, студэнт ГДУ, палічылі справу прынцыповай. І дабіліся свайго! 20 жніўня з Адміністрацыі Савецкага раёну Гомелю прыйшоў пазытыўны адказ на іх скаргу.**

**Такім чынам, у гомельскім ЗАГСе будзе важны прэцэдэнт. Дарэчы, у Менску беларускамоўныя шлюбы заключаюць ва ўсіх ЗАГСах, чамусьці акрамя толькі Фрунзэнскага. Тое самае і ў Горадні.**

**«НН» зычыць маладым ладу ў сям'і і шмат дзетак!**

Ваша кампутарная крама Formoza

**Кампутары** (гатовыя мадэлі на складзе, гарантыя 36 месяцаў)
**Камплектуючыя**
Вялікі выбар **кампакт-дыскаў**
**Запраўка** картрыджаў
**Рамонт** і абслугоўваньне
Прыём на **камісію** ўжываной тэхнікі

**вул.Прытыцкага, д.62, корпус 2**
Пн—Пт 9.00— 9.00, Сб 10.00—16.00
**Т.: 253-57-86** Ліцэнзія №413 ад 19.09.2003

АД РЭДАКЦЫІ

## Памажыце «Нашай Ніве»

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» зьвяртаецца да чытачоў «НН», суродзічаў, беларускіх арганізацый з просьбай аб фінансавай дапамозе. Крызыс, што паўтараецца штолета праз сэзоннае паніжэньне продажу, сёлета асабліва цяжкі — прычыны ў незвычайнай фінансавай дыскрымінацыі газэты дзяржаўнымі манапалістамі. Газэта патрабуе Вашай тэрміновай падтрымкі, каб застацца якаснаю. Т.: 284-73-29, 613-32-32, 707-73-29. E-mail: nn@promedia.by. Адрас: 220050. Менск, а/с 537.

# Памысны крок

## У Мастацкім музэі — выстава да 150-годзьдзя Юдаля Пэна



Прэзэнтацыю твораў Пэна, што заняла невялікі куток у адной з заляў галоўнага мастацкага музэю краіны, цяжка назваць выставаю. Апроч трох твораў мастака, што экспануюцца тут стацыянарна, вывешаны яшчэ дзясятак яговых рэчаў. Але насамрэч мастакоўская спадчына Пэна захавалася фрагмэнтарна — усяго 200 работ, расьцярушаных па розных зборах, пераважна ў Віцебску й Менску. Бальшыня ж ягонага даробку загінула незваротна. Таму азнаямленьне з калекцыяй Мастацкага музэю Беларусі можна лічыць унікальнай магчымасьцю. Гэта памысны першы крок.

Апроч партрэтаў і краявідаў тут выстаўлена й колькі эцюдаў і шкіцаў. Яны даюць больш грунтоўнае ўяўленьне пра творчую эвалюцыю мастакоўскіх прыёмаў Пэна — ад рэалістычнага анэмічнага акадэмізму да ўласнай імпэтнай манеры. Некаторыя з твораў, напрыклад «Дом з козачкай» ці «Купаньне каня», змушаюць прыгадаць стыль Шагала. Дарэчы, творы апошняга экспануюцца гэтымі днямі тамсама.

Супрацьпастаўленьне Пэна Шагалу відавочна штучнае. Гэтая традыцыя цягнецца ад савецкіх часоў, калі творчасьць Шагала падлягала астракізму, а Пэна — паблажліваму ўхваленьню. Але насуперак усяму сёньня мы ведаем Пэна найперш як любімага настаўніка Шагала, якога той ледзьве не абагаўляў.

Нарадзіўшыся на сумежжы Літвы, Латвіі й Беларусі ў шматдзетнай жыдоўскай сям'і, Пэн стаў ня толькі выказьнікам ідэяў і ідэалаў свайго роднага асяродзьдзя, але найперш настаўнікам вялізарнае генэрацыі беларускіх творцаў. Яму, аднак, з прызнаньнем пашчасьціла куды меней, чым бальшыні ягоных вучняў. Мы мала што ведам пра гэтага чалавека. Нават ягоная сьмерць ахутана таямніцаю. У ноч з 1 на 2 красавіка 1937 г. Юдаль Пэн быў па-зьверску забіты ва ўласнай хаце. Забойства тое, на першы погляд, абсалютна бессэнсоўнае, дагэтуль не раскрыта. Абвінавачаныя былі сваякі ахвяры: маўляў, ім спатрэбіліся грошы. Але куды было падзець тыя грошы за Саветамі ў 37-м? Пагатоў, менавіта сваякі й мусілі ведаць, што ў Пэна грошай не было… Настаўнік такіх мастакоў, як Шагал, Лісіцкі, Цадкін ды яшчэ соцень, сышоў з жыцьця брутальна й цёмна. Гэтак журботна скончылася кароткая, але вялікая эпоха віцебскае школы.

**Сяргей Харэўскі**

Мастак Уладзімер Ракіцкі пра Пэна й Шагала — **старонка 12**.

# Яшчэ адзін нож у сьпіну СССР

## 50-годзьдзе Лукашэнкі

Аматар песень Пахмутавай, савецкіх тэмпаў разьвіцьця эканомікі і школьнай дзесяцігодкі Аляксандар Лукашэнка ня можа справіць свой 50-ы бёздник адпаведна савецкім канонам. Ганьба!

«Вярні маю краіну, чувак». Гэтак называецца кніжны блякбастэр левага рэжысэра Майкла Мура. На яго старонках ляўрэат Канскага фэстывалю абвінавачвае Буша-юніёра ў здрадзе духу добрай старой Амэрыкі часоў welfare state. На месцы фаната рэанімацыі саўка я б напісаў нешта падобнае на адрас ППРБ: «Вярні маю краіну, Лука».

Калі б сапраўды АРЛ намагаўся аднавіць Саюз, усё было б інакш у гэтыя апошнія дні жніўня. Якая цудоўная атмасфэра дамінавала б ва ўсіх офісах краіны, і ў прыватнасьці на Карла Маркса, 38! Зранку прафсаюзьніца Шура арганізавала б каля ўваходу ў ліфт палюдзьдзе: «Так, Навумаў, вы ведаеце, што сёньня ў шэфа палцыньнік? З вас пяць рублёў на торт!» — «Я ўжо здаваў». — «Як жа, здаваў! У мяне ўсё памечана. Так, а вы куды паперліся, Навіцкі?»

Праца ва ўсёй краіне перайшла ў рэжым аўтапілёта. Бамбардавальнікі NATO раз за разам залятаюць з боку Літвы ў нашу прастору — з боку МЗС ніводнага пратэсту. Апазыцыянэры, якія пабудавалі дзяжурны ланцуг неабыякавых людзей вакол замку «чырвона-зялёнага Дракулы», зьдзіўляюцца, што іх ніхто не вінціць. Адзінокі мент, які сачыў за імі, устаў і хутка зьбег: паслалі ў «Цэнтральны», бо, як заўсёды, рыхтуючы фуршэт, забыліся пра запівон. Усе спробы наладзіць сэлектарную сувязь з калгасамі праваліліся: там адзначаць сьвята пачалі з абеду.

Адміністрацыя глядзіць на гадзіньнік. Нарэшце у кабінэт АРЛ уваходзіць дэлегацыя прафкаму і запрашае на «сьціплы вечар». Сам гарант ужо падрыхтаваўся да вечарыны і трымае ў сэйфе (побач з чарнавіком заявы пра рэфэрэндум аб трэцім тэрміне) скрыню «Johnnie Walker». «Не, мне больш нельга», — кажа ён пасьля сымбалічнай і адпраўляецца ў Палац Рэспублікі на атрыманьне ордэна за заслугі імя Лукашэнкі першай ступені.

На вуліцах натоўпы. Не таму, што ўсе лукашысты. Проста 1 верасьня — памежная дата ў нашым календары, як Новы год або 1 траўня (калектыўны выхад на дачу). Усе так ці інакш яго сьвяткуюць, а тут яшчэ халява ў выглядзе канцэрту «Любэ» «Бацяня-прэзыдэнт». Потым — салют і бойка з п'янымі на раёне.

І што мы маем замест усяго гэтага? Фігу. Вось табе і 50 гадоў!

Куды мы ідзём, ня ведаю. Але відавочна не ў савок. Пачынаю падазраваць, што бацька — сябар пратэстанцкай сэкты пяцідзясятнікаў або шпіён.

**Лёлік Ушкін**

# Героі і антыгероі Алімпіяды

Другая палова мінулага тыдня прынесла беларусам доўгачаканыя мэдалі.

Ігар Макараў завяваў найвышэйшую ўзнагароду ў дзюдо. Пасьля бою 19 жніўня старшыня Гомельскага аблвыканкаму Аляксандар Якабсон «тэлеграфаваў» у Атэны, каб павіншаваць земляка ад імя ўладаў Гомельшчыны. Нібы загладзіць віну за тое, што доўгія гады на Ігара ніхто не зважаў у абласным цэнтры. Цягам некалькіх гадоў Макарава карміліі абяцанкамі пра кватэру, а аднойчы нават выселілі з інтэрнату.

Лішні раз пераконваешся, што ў нашай краіне спартоўцы залатымі ўзнагародамі перадусім ствараюць свой дабрабыт. А да нечэмпіёнаў і непрызёраў дзяржаве няма ніякае справы. За алімпійскае золата Макараву, апрача 60 тыс. даляраў і Ордэна мужнасьці, абяцана кватэра ў любым месцы Беларусі.

Напэўна, вырашыць свае жыльлёвыя праблемы і алімпійская чэмпіёнка Юлія Несьцярэнка, якая жыве з мужам у маленькім пакойчыку ў берасьцейскім інтэрнаце. Галоўнае, каб допінг-спроба дала адмоўны вынік.

Барацьба з допінгам на Алімпіядзе набірае абароты.

Не абышлося, на жаль, і безь беларусаў. На допінгу засьпелі скакуна ўгару Аляксея Лясьнічага. Праўда, недазволеныя прэпараты яму не дапамаглі: хлопец не прайшоў нават кваліфікацыі. Трэнэра зборнай Індыі па цяжкай атлетыцы Леаніда Тараненку прагналі з шэрагаў тамтэйшай алімпійскай зборнай. На думку міністра спорту Індыі, Тараненка прымушаў спартоўцаў ужываць забароненыя прэпараты.

Чэмпіёнка ў штурханьні ядра — расіянка Ірына Каржаненка, якую пазбавілі «золата» за ўжываньне допінгу, адмовілася вяртаць мэдаль, спаслаўшыся на тое, што ўзнагароду пераслала дамоў. Ня могуць нашы ўсходнія суседзі без скандалаў. У Масквы, між іншым, таксама ёсьць плян — 30 залатых мэдалёў, да выкананьня якога яшчэ вельмі-вельмі далёка.

Ад іх якасна адрозьніваюцца нашы паўночна-заходнія суседзі — літоўцы. Як у той песьні, бяз гучных слоў. У суботу літоўскія баскетбалісты праводзілі матч з амэрыканскай «dream team». Матч, дастойны фіналу. Унікальнасьць сытуацыі была ў тым, што літоўцам на ўсякі выпадак было зручней прайграць, каб потым разьмінуцца з амэрыканцамі ў паўфінале. Але жаданьне адпомсьціць за паразу ў другім паўфінале — Сыднэю-2000, а таксама за судзейскае самавольства было надта вялікае. Нягледзячы на тое, што арбітры зноў гарой былі за амэрыканцаў, літоўцы сьціснулі зубы, мабілізаваліся і перамаглі — 94:90. Нават уся заля пад канец матчу пачала скандаваць «Lie-tu-va». «Dream team» толькі скрыгатала зубамі. Вось яны, героі Алімпіяды: Ясікявічус, Штромбэргас, Шышкаўскас, Яўтокас… Новае пакаленьне літоўскага баскетболу, што пасьпяхова зьмяніла «дзядоў». Глядзіш на суседзяў — і зайздрасьць бярэ. Куды мы, беларусы, разбазарылі свой баскетбольны патэнцыял? Выйгралі ж у 1994 годзе моладзевы чэмпіянат Эўропы. А цяпер нават дарослай кваліфікацыі па-людзку прайсьці не маглі.

Напрыканцы яшчэ пра адных героў. Сапраўдны подзьвіг зьдзейсьніла футбольная зборная Іраку, нягледзячы на вайну, разруху ды безьліч праблем. Каманда перад Алімпіядай трэніравалася на пашы, дзе пасьвілі авечкі! Але ірацкія футбалісты спачатку выйшлі з падгрупы і спыніліся толькі ў паўфінале, саступіўшы парагвайцам.

Тры з паловай дні Гульняў — і будзе ўзяты перапынак на паўтара году, да Белае Алімпіяды ў Турыне. Чамусьці ў гэтыя апошнія дні хочацца як мага болей нагледзецца тэлевізара. Напэўна, каб хапіла на доўгія 18 месяцаў.

**Алег Раявец**



AFP

**Шарунас Ясікявічус закінуў трохбальны гол у гульні з амэрыканцамі.**

## Юлія Несьцярэнка:
# «Не памяняю Берасьця на Менск»

**— Цяжка быць пасьпяховым спартоўцам не ў сталіцы, а ў абласным горадзе, такім, як Берасьце?**

— Безумоўна, усё найлепшае ў сталіцы. Але я не хачу жыць там і ніколі не памяняю Берасьця на Менск.

**— Перад стартам Вы перахрысьціліся. Вы верыце ў Бога?**

— Так. І гэтая вера яшчэ болей узмацнілася: Бог даў мне сілы перамагчы.

**— Юля, Вам удалося трохі пагледзець на Афіны?**

— Я бачыла Афіны толькі з акна аўтобуса, калі езьдзілі на стадыён і адтуль. А так бачыш толькі алімпійскую вёску і стадыён. Вакол вёскі толькі горы. Тут такая сьпёка, што нікуды ня хочацца выходзіць. Тым болей, настройвалася толькі на бег, усе думкі былі толькі аб ім. Нікуды не хадзіла, нічога ня бачыла, нічога не купляла — усё пакінула на апошні дзень, пасьля бегу.

**— А калі дадому?**

— Квіток у мяне на 1 верасьня. Але я паспрабую вырвацца раней, адразу пасьля эстафэты. Вы не ўяўляеце, якая тут «лазьня». Проста хочацца хутчэй прыехаць дадому.

**— Ёсьць надзея на посьпех у эстафэце?**

— Надзея заўжды ёсьць. Бо няшмат хто верыў у маю перамогу. Мы будзем старацца — нам бы крыху посьпеху, каб мы не перахваляваліся.

**Паводле «Вечернего Бреста»**



AP

**Юлія Несьцярэнка** (дзявочае прозьвішча — Барцэвіч) нарадзілася 15 чэрвеня 1979 у Берасьці. Выхаванка СШ №14 (цяпер — гімназія №2) Берасьця і вучылішча алімпійскага рэзэрву ў Менску. Першы трэнэр — Сяргей Саламановіч, цяпер трэніруецца ў Віктара Ярашэвіча. Прадстаўляе спартовае таварыства «Дынама». Майстар спорту міжнароднай клясы. Рост 173 см, вага 60 кг. Найвышэйшыя дасягненьні — перамога на этапе «Залатой лігі IAAF» і трох турніраў сусьветнай сэрыі Гран-пры (на іх паставіла рэкорд Беларусі ў бегу на 100 мэтраў — 11,02 секунды). Жыве ў Берасьці. У 2001 скончыла факультэт фізвыхаваньня БрДУ. Муж Зьміцер таксама займаецца лёгкай атлетыкай.

**Зьміцер Несьцярэнка,** муж Юліі:

— Ужо ўвесну было зразумела, што калі ня будзе траўмаў і прастуд, то мы гарантавана трапляем у алімпійскі фінал. А залаты мэдаль — гэта нешта надзвычайнае. Гэта вяршыня, зь якой цябе ўжо ніхто і ніколі не скіне.

**Сяргей Саляманovіч,** першы трэнэр чэмпіёнкі, заслужаны трэнэр БССР:

— Яна зьвярнула на сябе ўвагу зь першых клясаў. Першыя яе спаборніцтвы былі ў Высокім. І яна стала там двухразовай пераможцай — у бегу на 60 мэтраў і ў скачках у даўжыню. Гэта было ў 10 гадоў. Чэмпіёнскі характар у Юлі пачаў праяўляцца яшчэ тады. Рызыкну ўявіць, што на Алімпіядзе нас можа чакаць адна прыемная нечаканасьць. Бо першай у эстафэце пабяжыць Несьцярэнка. Так што трэцяе месца яны цалкам здольныя заняць (каманды Ямайкі і ЗША патэнцыйна пакуль мацнейшыя).

**«Вечерний Брест»**

**Наступны старт Юліі ў Атэнах у эстафэце 4х100 м**
**26 жніўня. Паўфіналы. Пачатак а 20.00.**
**27 жніўня. Фінал. Пачатак а 20.45.**

АЛІМПІЯДА Ў ЛЮСТЭРКУ ХМАРАЧОСАЎ

# Краіна самай хуткай жанчыны

Перадапошні ўік-энд лета можна па праве назваць гістарычным на ўзаемаадносінах двух народаў — амэрыканскага й беларускага. І спрычыніліся да таго зусім не прэзыдэнты Буш ці Лукашэнка і дакладна не «беларускія» сэнатары Сьміт і Маккейн. Найлепшая беларускага дыпляматка завуць Юля Несьцярэнка — яна за 11 сэкундаў нанава адкрыла для амэрыканцаў незнаёмую ім дзяржаву ў цэнтры Эўропы.

«Беларусь здаўна вядомая сваімі легендарнымі гімнастамі. Цяпер тамака жыве й самая хуткая жанчына плянэты», — паведаміў гледачам адзін з самых рэйтынгавых спартовых тэлевядоўцаў Амэрыкі Боб Костас з NBC. «Яна прыйшла зьніадкуль», — сьцьвярджала «Los Angeles Times». «Яшчэ два тыдні таму імя практычна невядомай беларускі і блізка не трапляла ў зону прагнознага радара адмыслоўцаў», — зьдзіўлялася «USA Today».

Нават адукаваныя амэрыканцы слаба ўяўляюць сабе, што гэта за краіна такая — Беларусь. Адкуль ведаць, калі за апошнія два месяцы ніводзін аўтарытэтны амэрыканскі СМІ нават не згадаў пра Беларусь. Ні пра скандал зь Сіваковым, ні пра разгон апазыцыйнай акцыі ў Менску, ні пра адмову Маккейну ў выдачы візы. Перамога Несьцярэнкі сталася сапраўдным прарывам у інфармацыйнай «блякадзе».

Вынік гэтага я назіраў у нядзелю ў самым цэнтры кансэрватыўнага Бостану. Мужчына гадоў 35 са сьвежым нумарам «The Boston Globe», разгорнутым на здымку Несьцярэнкі, тлумачыў сваіму сыночку, што «Беларусь — былая рэспубліка СССР, якая месьціцца між Польшчай і Расеяй, дзе жывуць 10 мільёнаў і самая хуткая жанчына плянэты, якая перамагла ўсіх амэрыканак — упершыню за 20 гадоў».

А напярэдадні ўвечары, спыніўшыся ў матэлі невялічкага гарадка Дэнвэрс (штат Масачусэтс), у кампаніі амэрыканскіх літоўцаў мы сьвяткавалі двайную перамогу — літоўскую баскетбольную і нашу спрынтэрскую. І так было радасна ад таго, што на другім канцы сьвету тае спрадвечныя суседзі могуць падзяліцца з табой уласным шчасьцем, а ты можаш падзяліцца зь імі сваім.

**Кастусь Лашкевіч, Бостан—Нью-Ёрк**

НАВІНЫ

## 12-ы мэдаль алімпійцаў

25 жніўня ў беларускую скарбонку дадаўся бронзавы мэдаль Вячаслава Макаранкі (грэка-рымская барацьба, вага да 84 кг). Перад ім на п'едэстале ўсталі расеец Аляксей Мішын і швэд Ара Абрахамян. Беларусы займаюць 14-ы радок сярод нацый па колькасьці заваяваных мэдалёў, маючы на рахунку 2 залатыя, 3 срэбныя і 7 бронзавых.

## «Газпром» прапануе

«Газпром» прапануе Беларусі ў 2005 г. абысьціся без альтэрнатыўных пастаўшчыкоў. Расейскі канцэрн гатовы паставіць 19,1 млрд кубоў газу коштам 46,68 даляраў за 1000 кубамэтраў. Беларускі бок настойвае на дывэрсіфікацыі закупак газу, каб частку патрэбаў пакрывалі іншыя пастаўшчыкі.

## Беларуская «пральня» для Садама

Міністэрства фінансаў ЗША абвінавацíла беларускі «Інфабанк» у адмываньні грошай Садама Хусэйна й парушэньні санкцыяў ААН. Амэрыканцы таксама вінавацяць у адмываньні грошай «Першы гандлёвы банк» з Паўночнага Кіпру. Фінансавы дэпартамэнт Амэрыкі рэкамэндаваў спыніць супрацоўніцтва зь імі й зачыніць іх карэспандэнцкія рахункі ў банках ЗША. Гэта, аднак, не падарве фінансавага стану банку.

35% акцыяў «Інфабанку» належаць «Лібійскаму арабскаму замежнаму банку». Некаторыя экспэрты лічаць «Інфабанк» адным з самых непразрыстых банкаў Беларусі.

## Партыя БНФ у судзе

Вярхоўны суд не скасаваў папярэджаньня Міністу, якое асьпрэчвала Партыя БНФ. Папярэджаньне вынесенае за тое, што партыя заклікала ўзяць удзел у несанкцыяваным «Ланцугу чытачоў» у абарону «Народнай волі». Паседжаньне вялося па-беларуску.

## Земляковы супраць КДБ

У судзе Цэнтральнага раёну Менску пачаўся працэс супраць упраўленьня КДБ па Менску й Менскай вобласьці. Бацька былога «краёўца» Юрася Землякова Міхал патрабуе, каб КДБ вярнула рэчы, незаконна сканфіскаваныя ў сына ў жніўні 2001 г. На сумоўі паміж бакамі 25 жніўня прадстаўнік КДБ прызнаў канфіскацыю, але адмовіўся вяртаць: рэчы далучаныя як доказы да справы «краёўца» Андрэя Жарнасека, які дагэтуль знаходзіцца ў вышуку. Першае судовае паседжаньне судзьдзя Натальля Вайцяховіч прызначыла на 9 верасьня.

## Непрадажная прэса

Некалькі менскіх супэрмаркетаў уваднача́с адмовіліся гандляваць незалежнымі газэтамі. Журналісты «Белорусского рынка» цьвердзяць, што такую рэкамэндацыю далі чыноўнікі з гарвыканкамаўскай управы спажывецкага рынку.

## Сьмерць на ролернай трасе

Дэпутат палаты прадстаўнікоў Уладзімер Зяневіч, катаючыся зь дзецьмі на лыжаролернай трасе на праспэкце Машэрава, паваліўся й пакалечыўся: атрымаў чарапную траўму і пашкодзіў хрыбет. Не прыходзячы ў прытомнасьць, памёр за тры дні ў больніцы.

## Чэхі па-беларуску

У чэскім выдавецтве «Альбатрос» выйшлі дзіцячыя кнігі па-беларуску — «Кніжка Ферды Мураша» Ондржэя Сэкары ды «Мах і Шэбестава вандруюць па сьвеце» Мілаша Мацоўрака. Пераклады зрабіў Сяргей Сматрычэнка. У «Альбатроса» гэта першае выданьне на беларускай мове, хаця выдавецтва даўно друкуе кнігі на замежных мовах.

## У Зымбабвэ байкот

Рух за дэмакратычныя перамены Зымбабвэ абвясьціў байкот парлямэнцкім выбарам. Асноўнае патрабаваньне партыі: прэзыдэнт Робэрт Мугабэ павінен правесьці рэформу выбарчай сыстэмы, што гарантавала б роўныя правы апазыцыі. Выбары павінны адбыцца ў сакавіку 2005 г.

**МБ; БелаПАН, gazeta.pl**

# Аляксей Янукевіч: Праца дзеля нацыянальных каштоўнасьцяў ніколі ня будзе марнай

**«НН»: Я думала, з Вашаю спэцыяльнасьцю эканаміста-міжнародніка тут рабіць няма чаго.**

**АЯ:** З майго курсу шмат людзей зьехала. Але я для сябе ня бачу магчымасьці рэалізацыі за мяжою. Калі жывеш тут, маеш магчымасьць удзельнічаць у грамадзка-палітычных працэсах. А гэта найпершая сфэра жыцьця, якая мяне цікавіць і ў якой я хачу рэалізавацца. Там можна багацей жыць, больш магчымасьцяў для вольнага часу і вандровак, але для мае працы тут заставацца цікавей.

**«НН»: Гэта вялікае пытаньне — пра самарэалізацыю ў палітыцы. Шмат хто з палітыкаў тут кансэрвуецца, як агурок у добрай гаспадыні.**

**АЯ:** Я гэтага не баюся, хаця кансэрвацыя сапраўды адбываецца. Мы маглі б займацца сёньня пытаньнямі зусім іншага ўзроўню, чым займаемся. Пад ляжачы камень жа вада не цячэ. Некаму ж трэба працаваць тут.

**«НН»: А гэта не зацятасьць? ККДз Вашых дзеяньняў сапраўды такі, што трэба варочаць гэтыя заржавелыя падважнікі? З кожным днём усё больш сумневаў. Разумны чалавек мусіць сумнявацца пры марнай працы.**

**АЯ:** А я перакананы, што ня толькі наша пакаленьне, але й старэйшыя будуць жыць пры іншым сацыяльна-эканамічным ладзе. Трэба рыхтаваць зьмены. Нават сёньня, пры цяперашнім рэжыме кіраваньня краінай, можна рабіць шматшмат добрага.

**«НН»: Я ўчора хадзіла на апытаньне па розных раёнах Менску — дэмакратычных, багемных, чыноўніцкіх — і ўсюды задавала пытаньне: ці зьбіраюцца людзі браць удзел у выбарах у ПП НС. Ніхто ня верыць у мэтазгоднасьць удзелу, малая частка зьбіраецца. Даваяраюць толькі тым дэпутатам, якія былі дырэктарамі прадпрыемстваў ды саўгасаў і «здолелі палепшыць якасьць прадукцыі». Вас не засмучаюць вынікі?**

**АЯ:** Сам хаджу па кватэрах і сутыкаюся з такімі ж думкамі: ніхто ня верыць, што нейкі чалавек патрапіць штосьці зьмяніць. Людзі пераканаными, што кандыдаты перасьледуюць прыватныя мэты. Часта ў іх гаворыць здаровы розум. Нейкі кандыдат абяцаў нешта зрабіць, прайшоў — і не зрабіў. Зь людзьмі ўсё нармальна, ня ўсё нармальна з палітыкамі. Гэта засмучае, але нашмат лягчэй памяняць палітыкаў, чым зьмяніць грамадзтва.

**«НН»: А чым жа Вы прымусіце выбарцаў верыць — пасьля тых гаваруноў?**

**АЯ:** Адзін са слоганаў маёй дзейнасьці застаецца: «Я нарадзіўся тут, і я буду жыць тут». Ён падабаецца людзям незалежна ад сацыяльных і ўзроставых катэгорыяў. Прывабнасьць жа мая як палітыка й кандыдата найперш у тым, што людзі могуць мяне ўбачыць на парозе сваёй кватэры, паглядзець мне ў вочы і пераканацца, што я не хлушу, бо я сапраўды не хлушу. Я не абяцаю ім, а пытаюся: якія ў вас праблемы. Я не абяцаю вырашыць усе гэтыя праблемы, але кажу, што нікуды ня зьнікну з вашых арбітаў, буду жыць тут і працаваць тут дзеля вас. Пастараюся праблемы вырашыць. А паколькі я малады, веру ў сябе, маю здароўе, сілы, энэргію й добрую адукацыю, са мной каманда людзей, якія шмат на што здольныя…

**«НН»: А калі Вас спытаюць, што Вы зрабілі са сваёй адукацыяй?**

**АЯ:** Калі нейкая партыя або структура знаходзіцца ў апазыцыі, яна непазьбежна сутыкаецца з пытаньнем: «А што вы зрабілі?» І ў Брытаніі, і ў Беларусі апазыцыйная партыя ня можа сказаць, што зрабіла шмат, але можа паказаць праграму й бачаньне, як краіна павінна разьвівацца. І мы спадзяёмся, што людзі падтрымаюць нас.

**«НН»: У Вашай партыі вялікі адмоўны рэйтынг. Вы шчыра кажаце выбарцам, ад якой Вы партыі, альбо мецяце лісіным хвастом, як гэта бывала зь некаторымі кандыдатамі на мінулых выбарах?**

**АЯ:** Ужо трэцяй фразай я гавару, зь якой я партыі, і, калі бачу, што мяне не зразумелі, я паўтараю. Быць у Партыі БНФ было й заўсёды будзе гонарам для мяне. Бывае, што людзі адказваюць: «Мы БНФ не падтрымліваем», — але пасьля размовы кажуць: «Мы будзем за Вас галасаваць, вы нам падыходзіце». Гэта пытаньне нармальнае размовы зь людзьмі. Узяць старых людзей. Ім ня столькі трэба падвышэньне пэнсіяў (яны самі так кажыуць), колькі павага да іх, іхнага досьведу і працы. Ім перадусім патрэбная ўвага.

**«НН»: Народ не дурны й ня хворы?**

**АЯ:** Зусім не дурны. Хварэе хіба на адчужанасьць. Але й гэта не хвароба, а бяда. Калі людзям даць пэрспэктыву, гэты момант паддаецца вылячэньню. Мы ўсе суайчыньнікі. Мы адзін народ.

**«НН»: Як Вы прыйшлі ў палітыку?**

**АЯ:** Праз змаганьне за нацыянальныя каштоўнасьці. Бацькі і асабліва дзядзька Анатоль, які ў свой час вучыўся ў пінскай і нясьвіскай пэдвучэльнях, былі прыхільнікамі нацыянальнай ідэі. Бацька мой Антон паходзіць з Лотвічаў, што пад Баранавічамі. Ён адзін з найлепшых тэхнолягаў на абшарах былога СССР па зубарэзных апаратах, па шасьцернях. І да сёньня езьдзіць з кансультацыямі. Спакойны, справядлівы й вельмі сумленны чалавек. Усе, хто яго ведае, моцна паважаюць. Імкнуся быць падобным да бацькі. Мая маці Аляксандра праработала ўсё жыццё загадчыцай дзіцячага садка. Ад яе ў мяне мэнэджэрскія здольнасьці, напорыстасьць і мэтаскіраванасьць.

**«НН»: Праца для моцных духам людзей…**

**АЯ:** О, так, так. Муж маёй сястры вылучаўся ў гарсавет ад БНФ у 90-я гады. Я пайшоў у Партыю БНФ у 1996 г., калі адчуў, што ёсьць небясьпека для незалежнасьці краіны. Я вырашыў, што патрэбны. Спачатку я працаваў у чыжоўскай суполцы, пасьля — у «Маладым фронце», а з 2000 г. я цалкам у БНФ.

**«НН»: З тых часоў прайшло амаль 9 год. Ці ёсьць небясьпека яшчэ? Якое Ваша бачаньне будучыні? Дзеля якое Беларусі Вы працуеце?**

**АЯ:** Гэта простыя рэчы. Першае — каб незалежнасьць дзяржавы стала незваротнаю. Для гэтага трэба памяняць сыстэму органаў дзяржаўнае бясьпекі, бо цяпер нельга сказаць, што яны служаць Беларусі, а таксама ўдасканаліць сыстэму адукацыі. І вырашыць пытаньне палітычнай залежнасьці ад Расеі. Другое — каб у краіне ствараўся сярэдняя кляса людзей з уласнымі малымі, сярэднімі прадпрыемствамі.

**«НН»: Ёсьць плынь маладых палітыкаў, якія вырасьлі самі, падчас працы ў партыях, вулічнага змаганьня, сустрэч з выбарцамі. Але ёсьць і інкубатар кадраў, дзе ўлада песьціць «курянят у гарнітурах». А што калі яны будуць вызначаць будучыню краіны, а вы апынецеся наводшыбе?**

**АЯ:** Магчымы такі сцэнар, але часова. У палітыкаў майго пакаленьня, 30-гадовых прыхільнікаў нацыянальна-дэмакратычных каштоўнасьцяў, абавязкова неўзабаве зьявіцца шанец, калі мы возьмем кіраваньне ў свае рукі. Шанец зрабіць Беларусь такой, якой мы бачым яе ў сваіх марах. Не праз два гады, дык праз дзесяць. Да гэтага трэба быць гатовым, бо, магчыма, такі шанец будзе толькі адзін.

**«НН»: І ўсё ж, ёсьць шчырыя маладыя людзі, якія не прачыталі своечасова «Каласоў пад сярпом тваім», жылі недзе ў глушэчы і дагэтуль упэўненыя, што дзяржава мусіць мець сола ў разьвіцьці краіны, а плюралізм — гэта непарадак. Раптам яны і будуць кіраваць, разьяжджаць у жніво па калгасах у клятчастых тэніcках з гальштукамі?**

**АЯ:** Дык такі сцэнар сёньня й ажыцьцяўляецца. Лукашэнка цэмэнтуе гэтую пабудову. І калі гэтая цамянка аслабне, большыня палітыкаў, якія ўпэўненыя, што чым больш дзяржава зацiскае гайкі, тым больш красуе й мацуецца Беларусь, ня здолеюць скансалідавацца супраць волі народу. Праца дзеля нацыянальных каштоўнасьцяў ніколі ня будзе марнай, калі вы самі ня будзеце лічыць яе марнай. Ёсьць шмат магчымасьцяў разбудоўваць беларускі дом і ў тых умовах, якія мы маем сёньня.

**«НН»: Палітыка — брудная справа, якой варта заняцца, каб уратаваць Бацькаўшчыну?**

**АЯ:** Гэта складаная справа. Праблема апазыцыйных палітыкаў у сёньняшняй Беларусі ў тым, што ты можаш доўга працаваць і ня бачыць вынікаў свае працы. Але палітыка нічым ня розьніцца ад звычайнай сфэры дзейнасьці — тут ёсьць і махляры, і сумленныя людзі. Усё залежыць ад чалавека.

**«НН»: Не скажыце. Палітыка ўсе разглядаюць як пад лупаю й крывым люстэркам адначасова. Ёсьць нават такі тэст: «Каго вы выбераце ў кіраўнікі Сусьвету: а) чалавека, які выпівае некалькі келіхаў вэрмуту штодня, не разьвітваецца з каньяком і люлькаю, утрымлівае апрача жонкі дзьвюх каханак і кепска выказваецца пра ўласны народ; б) чалавека, які ўсё жыццё сьпіць да поўдня, любіць выпіць, не прапусьціць ніводнае спадніцы і здолеў скончыць толькі тры курсы юрыдычнага; в) героя вайны, добрага сем'яніна, які любіць дзяцей, п'е толькі піва, і тое зрэдку, у вольны ад працы час малюе і піша вершы?» Каго?**

**АЯ:** Ну і?

**«НН»: Гэта былі Чэрчыль, Лінкальн і Гітлер. Несправядліва, але Гітлера выбіраюць часьцей.**

**АЯ:** Ёсьць добры спосаб: перад тым як нешта зрабіць, трэба ўявіць, што гэта стала вядома людзям. І выбраць той варыянт, за які табе ня будзе сорамна. Гэта мой прынцып як чалавека і як палітыка.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Аляксей Янукевіч, 28 гадоў, нарадзіўся і жыве ў менскай Чыжоўцы. У 1998 скончыў факультэт міжнародных эканамічных адносінаў БДЭУ па спэцыяльнасьці эканаміст-мэнэджэр. Іграе на баяне, ударных, гітары. Умее слухаць музыку не як фон. Любіць гістарычную й мэмуарную літаратуру. Аднак асноўны занятак і выбар — палітыка.

# Новыя праекты мітрапаліта

**Мітрапаліт Філарэт выступіў супраць рэстаўрацыі гістарычнага цэнтру Менску. У сваім лісьце да старшыні Менгарвыканкаму Міхаіла Паўлава ад 27 ліпеня 2004 г. кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы просіць не ўзнаўляць гістарычнага будынку па адрасе пляц Волі, 19-21, які разьмяшчаўся каля самага Сьвятадухаўскага сабору й быў зьнесены некалькі гадоў таму.**




**Верхні горад вачыма праваслаўных. Архітэктурны праект Барыса Косьціча і Марыі Казак.**

У якасьці абгрунтаваньня Філарэт спасылаецца на «апытаньне духавенства і прыхаджан катэдральнага сабору», якія выказаліся супраць аднаўленьня будынку. Маўляў, гэта перашкодзіць вялікім зборам вернікаў, пагоршыць бясьпеку пры масавых мерапрыемствах, дый увогуле, гэты дом усё адно будзе развальвацца ад вібрацыі мэтрапалітэну.

Заміж аднаўленага будынку мітрапаліт прапануе паставіць капліцу імя князя Аляксандра Неўскага «ў гонар 60-годзьдзя Перамогі». Капліца мае паўтараць тую, што раней стаяла ў Аляксандраўскім сквэры (тамака, дзе сёньня фантан «Амур зь лебедзем»), «і гэта будзе істотным унёскам у аднаўленьне гістарычнага аблічча Менску». Тая капліца была пастаўлена ў гонар цудоўнага збаўленьня цара Аляксандра ІІ ад замаху, на сродкі «вызваленых» сялянаў у 1869 годзе — акурат пасьля крывавага задушэньня вызвольнага паўстаньня Каліноўскага. Падмуркі Аляксандраўскай капліцы захаваліся. Чаму б не паставіць яе на тым самым, гістарычна адпаведным і вольным месцы?

Калі ў царквы няма сродкаў (на што спасылаецца Філарэт), каб адбудоўваць дом № 19-21, то гэты пляц можна было б аддаць іншым інвэстарам. Ахвотных безьліч.

Падказкі тояцца ў наступнай Філарэтавай прапанове — паставіць яшчэ адну расейскую капліцу на падмурках колішняга ўніяцкага сабору Сьвятога Духа, што стаяў насупраць ратушы і быў пераасьвечаны праваслаўнымі ў гонар сьвятых Пятра і Паўла. «Гэта дазволіць узнавіць унікальную атмасфэру гістарычнага цэнтру гораду і ў той самы час захавае пэўную дыстанцыю храмавай сакральнай прасторы ад будзённага жыцьця гораду ды дазволіць бесьперашкодна ажыцьцяўляць шматлюдныя сьвяточныя царкоўныя і царкоўна-дзяржаўныя (так у тэксьце. — **Рэд.**) мерапрыемствы», — гаворыцца ў лісьце.

Мітрапаліт нагадвае, што ягоны экзархат адмовіўся ад пляцу на вуліцы Чарвякова, пагражае зборам подпісаў. Разам з праектаванай капліцаю на вяршыні парадней лесьвіцы (на верхнім малюнку — 1), такім чынам, новых праваслаўных капліц у Верхнім горадзе праваслаўныя хочуць паставіць тры. Як межавыя слупы, яны пазначаць тэрыторыю, падуладную Маскоўскаму патрыярхату ў Менску. А з другога боку пасьля вычышчэньня рэштak тага, што засталося на рагу вуліцы Гандлёвай, будзе ўзьведзены вялікі «духоўна-асьветны цэнтар», таксама пад залатымі цыбулінамі (на верхнім малюнку — 2). У прыватнасьці, стала вядома, што мяркуецца разбурыць трохпавярховы дом XIX ст. па вуліцы Гандлёвай, 27. Раней ён належаў Беларускаму фонду культуры, але вось ужо зь дзясятак гадоў лічыцца на балянсе царквы. Ужо зьнішчаныя чыгунныя бальконы, павыдзірана старая сталярка.

Дарэчы, праекціроўшчыкі — Барыс Косьціч і Марыя Казак — тыя ж, якія аздобілі горад сваёй фантазіяй у выглядзе маршаў гранітных сходаў ад Верхняга гораду да Нямігі. Таму стылістыку новабудоўляў, якімі мяркуецца ўзбагаціць складзены за чатыры стагодзьдзі барочна-клясыцыстычны ансамбль, няцяжка ўявіць.

**СХ, АШ**



**Мэр Менску Міхаіл Паўлаў і мітрапаліт Філарэт.**

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК



**Капліца ў Аляксандраўскім (Купалаўскім) сквэры, зруйнаваная ў 1929 г.**

## «Атлянты» і «карыятыды» аршанскага вакзалу

Адначасова з рэканструкцыяй аршанскага чыгуначнага вакзалу ў горадзе вялася праца па добраўпарадкаваньні прывакзальнай тэрыторыі. Суседнія вуліцы ўпрыгожылі цудоўныя кветнікі, альпійскія горкі, драўляныя альтанкі. Знайшлося месца і для скульптур. На вуліцы Пакгаўзнай паставілі дзяўчынку з чашай. Зроблена тая з бэтону ды пафарбавана ў бронзавы колер. Але чамусьці яна з надта сумным тварам ды толькі адной грудзьдзю. Да таго ж пастамэнт для «помніка» зроблены з бардзюрных плітаў. У кутку прывакзальнай плошчы пастаўлены і маленькі «атлянт» з арматурынай на целе ды нейкай кветачкай замест фігавага лістка. Праўда, аўтараў гэтых, на мой погляд, безгустоўных твораў чыгуначнікі народу не назвалі. Ці мо скульптуры часовыя?

## Ананьеў і Лоўчанкаў кандыдуюць ад Воршы

Дзесяць ініцыятыўных груп зарэгістравана ў Воршы на выбарах у ПП НС. Па Аршанскай гарадзкой акрузе №26 зьбіраюцца балятавацца ў дэпутаты тры партыйцы — галоўны рэдактар газэты «Время» Генадзь Ананьеў (АГП), інжынэр Канстанцін Анташкевіч (БСДП-НГ), спэцыяліст Інструмэнтальнага заводу, былы дэпутат ВС РБ XII скліканьня Мікалай Дзямідаў (ПКБ). Няма сумневу, на каго ў акрузе будзе ставіць улада. Гэта Людміла Анікеева, начальніца гарадзкога аддзелу адукацыі (папярэдні дэпутат па гэтай акрузе Ўладзімер Печанькоў хутчэй за ўсё застанецца ў Менску). Усе пяць кандыдатаў у дэпутаты па Аршанска-Дняпроўскай акрузе №27 — беспартыйныя. Тут зноў будзе балятавацца ў палату дзейны дэпутат Уладзімер Жвікаў. Сярод ягоных канкурэнтаў варта назваць старшыню нізавой арганізацыі свабоднага прафсаюзу мэталістаў на прадпрыемстве «Лёс» Васіля Лоўчанкава ды рэгіянальнага мэнэджэра кампаніі ЗАТ «Балтымар — Нява» (Менск) Андрэя Хіхлушку. Выконваючы жаданьне кіраўніка дзяржавы, мясцовая вэртыкаль вырашыла зрабіць стаўку на жанчын ды паслухмяных палатнікаў.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Паэт і кампазытар

12 верасьня ў Полацку пройдзе 23-е гарадзкое Скарынаўскае сьвята кнігі. Адметнасьцю сёлетняга сьвята стане адкрыцьцё дзьвюх мэмарыяльных дошак — Янку Журбу і Мікалаю Пятрэнку — на доме па вул.Камуністычнай, 21, у якім паэт і кампазытар жылі апошнія гады свайго жыцьця. Сымбалічна, што на першым паверсе гэтага дому знаходзіцца кнігарня «Сьветач». Янка Журба быў аўтарам «Нашай Нівы» пачатку XX ст. Кампазытара Мікалая Пятрэнку праславіла песьня «Ручнікі». Аўтар шыльдаў — галоўны мастак Полацку Ігар Куржалаў, а адліты яны спэцыялістамі фірмы «Вадаліў».

**Алесь Козік, Полацак**

## У Полацак па ўражаньні

Полацак усё часьцей выбіраюць для адпачынку вядомыя людзі. Сёлета ўпершыню наведала старажытную крыўскую сталіцу ўнучка стваральніка БНР і рэдактара «НН» Антона Луцкевіча Алеся Луцкевіч. Яна прыехала на адпачынак зь Вільні ў Полацак разам з мужам — мастаком Алесем Покладам і сынам Янам. Госьці знаёміліся са славутымі музэямі й храмамі. У Спаскай царкве з аднаўленымі фрэскамі XII ст. іх пазнаёміў рэстаўратар Уладзімер Ракіцкі. Алеся сказала карэспандэнту «НН», што не чакала пабачыць Полацак такім дагледжаным. Нават пасьля Вільні ён не выглядае правінцыйным, як большасьць беларускіх райцэнтраў. Віленскія госьці паабяцалі прыяжджаць на дзьвінскія берагі штогод. Алесь Поклад мяркуе налета ўзяць з сабой фарбы, каб уражаньні ад убачанага перанесьці на палотны карцін.

## Ветрыну 500 год

4 верасьня мястэчка Ветрына Полацкага раёну будзе адзначаць сваё 500-годзьдзе. Сельсавет распрацаваў адмысловую праграму мерапрыемстваў: вечарына, адкрыцьцё памятнага знаку, сустрэчы зь вядомымі ветрынцамі. Мясцовы краязнавец Віктар Карасёў напісаў кнігу пра гісторыю мястэчка. Да юбілею таксама выйдзе адмысловы паштовы канвэрт, зьявяцца сувэніры.

**Васіль Кроква, Полацак**

## Як прыходзілі к нам патрыёты…

Павялічваецца колькасьць школ з так званымі вайскова-патрыятычнымі клясамі. Ужо колькі гадоў на вуліцах Гомелю можна ўбачыць хлопцаў і дзяўчат у вайсковай форме. Сёлета ж да іх далучацца і старшаклясьнікі СШ №2, што ў Навабеліцы. З пачатку навучальнага году кожныя два тыдні асобныя клясы будуць праходзіць тэарэтычнае і практычнае мілітарнае шкаленьне. Абяцаецца азнаямленьне вучняў з сапраўднымі выбуховымі прыстасаваньнямі.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

## Сама пісаць!

Апанас Цыхун падрыхтаваў рукапіс паэтычнага зборніка «Прыняможнье — край слаўных дачок і сыноў». Гэта спроба паэтычным радком асэнсаваць рэчаіснасьць з вышыні сваіх амаль 95 гадоў жыцьця.

## Музэй Быкава ў Горадні

Удава Васіля Быкава адгукнулася на просьбу сяброў Гарадзенскага грамадзкага аб'яднаньня вэтэранаў вайны й працы ды даслала ініцыятарам стварэньня музэю рукапіс аповесьці «Сотнікаў» з аўтарскімі праўкамі, ксэракопіі білета сябра Саюзу пісьменьнікаў, працоўнай кніжкі, публікацыі пра пісьменьніка, яго дакумэнты, пісьмы, запісы розных гадоў… Жыхары Горадні, якія ведалі Васіля Быкава і былі зь ім у добрых стасунках, таксама перадалі памяткі пра пісьменьніка. Зьявілася адмысловая кававарка пісьменьніка, шарыкавыя ручкі, самавар.

**Антон Лабовіч, Горадня**

# Кніжныя навінкі восені

**Якімі навінкамі сустрэнуць пасьля летніх адпачынкаў прылаўкі кнігарань? Каб атрымаць адказ на гэтае пытаньне, карэспандэнт «НН» зьвярнуўся ў выдавецтвы «Мастацкая літаратура», «Беларуская навука», «Беларускі кнігазбор», «Тэхналёгія» і «Логвінаў».**

Да пачатку новага сэзону адмысловую падрыхтоўку вядуць толькі дзяржаўныя выдавецтвы: іхны разьлік — на Дзень беларускага пісьменства, што сёлета мае адбыцца ў Тураве. У «Мастацкай літаратуры» выйдзе кніга «Зямля Залатавуста» — пра літаратурны Тураў. У яе апрача твораў прызнаных аўтараў увайшлі вершы, апавяданьні, гістарычныя нарысы туравўчан.

Выдавецтва «Беларуская навука» падрыхтавала да сьвята гістарычныя выданьні: «Старажытнасьці Тураўшчыны» Леаніда Побаля, «Старажытны Тураў» Пятра Лысенкі (абедзьве па-расейску) і калектыўную працу «Тураў: мінулае, сучаснае, будучае».

## З Палесься да Монтэ-Касына

«Беларускі кнігазбор» рыхтуе чарговую кнігу зь «зялёнай», гістарычнай сэрыі — (1856—1936) «Рэчыцкае Палесьсе» Часлава Пяткевіча. У таміну, укладзеную Ўладзімерам Васілевічам, увайшлі этнаграфічныя працы. Па-польску апошняя кніга Пяткевіча выходзіла ў 1938 г. Паводле дырэктара выдавецтва Генадзя Вінярскага, «Рэчыцкае Палесьсе» мае стаць бэстсэлерам сэзону.

Апрача таго, выдавецтва заплянавала кнігу вершаў Ларысы Рамановай «Птушкі і рыбы», вокладка якой будзе аздоблена карцінай Алеся Пушкіна. Эсэ Ўладзімера Ліпскага «Бацька. Пісьмы сына» працягнуць радаводныя дасьледаваньні, распачатыя ў кнігах «Я: праўдзівы аповед пра мой і твой радавод», «Бацькі і дзеці».

Для аматараў гісторыі падрыхтавана выданьне «Бітва пад Монтэ-Касына» (на аснове няскончанай працы Пятра Сыча, дапісанай Вінцэнтам Жук-Грышкевічам). Для больш вузкага кола чытачоў прызначаная манаграфія эстэтыка Міколы Крукоўскага «Бляск і трагедыя ідэалу».

## Жыцьцяпіс Палуты

Галоўны рэдактар «Тэхналёгіі» Зьміцер Санько сярод навінак вылучае дзьве найбольш значныя: «Назвы населеных пунктаў Беларусі. Гарадзенская вобласьць» (першая кніга гэтай сэрыі пераплічвала паселішчы Меншчыны) і першы жыцьцяпіс Палуты Бадуновай, які выйдзе ў сэрыі «Нашы славутыя землякі», — «Пуцявінамі змаганьня і пакутаў» аўтарства гомельскай дасьледчыцы Валянціны Лебедзевай.

Дасьледаваньне Вячаслава Насевіча «Традыцыйная беларуская вёска ў эўрапейскай пэрспэктыве» мае шанец адразу ж зрабіцца раритэтам: наклад сягае толькі 1000 асобнікаў. Гэта ўнікальная праца: на прыкладзе вёскі Корань, што на Лагойшчыне, аўтар дасьледаваў гісторыю беларускай вёскі наагул — ад XIV да XX ст.

## «Жаночыя п’есы» Кавалёва

Выдавецтва Ігара Логвінава спэцыялізуецца на публікацыі літаратурнага авангарду. Ня здрадзіла сабе выдавецтва і гэтым разам: тут рыхтуюцца паэтычныя зборнікі Вікі Трэнас «Цуд канфіскаванага дзяцінства» і Вальжыны Морт «Я тоненькая, як твае вейкі» (з паэмай «Гопнікі»). Разам з прадстаўнікамі «Бум-Бам-Літу» друкуюцца ў Логвінава й «нэаклясыкі» пакаленьня «Тутэйшых». 5 верасьня мае ўбачыць сьвет кніга п’ес Сяргея Кавалёва «Навука каханьня». За ёю рыхтуецца кніга «пятрогліфаў і філялягемаў» Пятра Васючэнкі «Адлюстраваньні першатвору». У больш далёкіх плянах выдавецтва — гістарычная проза Ўладзімера Арлова, кніга лімэрыкаў Андрэя Хадановіча, зборнік вершаў Леры Сом.

## Ад Барадуліна да Чаргінца

Галоўны рэдактар «Мастацкай літаратуры» Віктар Праўдзін пачынае свой пералік зь дзіцячых кніг: толькі што выдавецтва атрымала сыгнальныя асобнікі кнігі вершаў і загадак Івана Курбекі «Хітрыя літары» («З добрым гумарам і добра аформленая», — кажа Праўдзін) і вершаў Валянціна Лукшы «Адзін у сьвеце край».

Гісторык Сяргей Тарасаў напісаў тэкст, а Мікола Купава зрабіў ілюстрацыі да гістарычнай кнігі «Фрэскі». «Гэта настолькі нечаканая кніга, што, хоць яна прызначаецца для малодшых школьнікаў, чытаць яе будуць усе. Гэта тое, чаго нам не хапае», — адзначае Праўдзін і дадае, што гэтая кніга павінна быць у кожнай сям’і.

У сэрыі «Зямля мая» для дзяцей маюць выйсьці навукова-папулярныя кнігі «Расьліны», «Жывёлы», «Падарожжы па Беларусі» (рыхтуецца таксама кніга пра зоркі, птушак і г.д.). Для дзяцей выйдзе таксама вершаваная кніга «Аз-букі», якую склалі вершы больш чым тузіна беларускіх пісьменьнікаў — ад Рыгора Барадуліна да Ўладзімера Мазга. «Па-мастацку якасна аформленая і з нашым беларускім калярытам», — ганарыцца Праўдзін. Падрыхтавана й дзьвюхмоўнае (па-беларуску й па-ангельску) выданьне «Беларускія народныя казкі». Ангельскую цяпер школьнікі вывучаюць зь першае клясы, а з гэтай кнігай вывучаць замежную мову будзе прасьцей.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Дырэктар «Кнігазбору» Генадзь Вінярскі рыхтуе бэстсэлер сэзону.**

Па-расейску выйшаў раман генэрала-сэнатара Мікалая Чаргінца пра савецка-нямецкую вайну «Вам — заданьне». Кніга мелася зьявіцца адначасова з аднайменным фільмам, але кінастужка чамусьці забавілася. Аднак кадры з будучага фільму (са здымачнай пляцоўкі) ужо ўпрыгожваюць выданьне.

У жніўні мае выйсьці кніга Янкі Крука «Зімовыя сьвяткі. Беларускі народны каляндар». Убачыў сьвет зборнік вершаў Васіля Сахарчука (пасьмяротна). У сэрыі «Проза XX стагодзьдзя» зьявілася кніга Георгія Марчука.

Падрыхтаваны 5-ы том Збору твораў Івана Шамякіна, 6-ы — і апошні — том Збору твораў Кандрата Крапівы, куды ўвайшлі ня толькі творы, раней не вядомыя чытачам, але і ліставаньне клясыка беларускай савецкай літаратуры.

## Шматтомнікі й перавыданьні

Выдавецтва «Беларуская навука» да новага сэзону падрыхтавала шмат перавыданьняў. Скончаецца перавыданьне «Гісторыі беларускай літаратуры XX ст.» — гэтым разам кніга будзе ў 4 тамах (5 кнігах). У сэрыі «Беларуская народная творчасьць» (дзе выйшла ўжо 60 тамоў) зьявіцца перавыданьне «Загадак». Падрыхтаваны пашыраны варыянт «Паэтычнага слоўніка» Вячаслава Рагойшы. Накладам 2000 ас. выйдзе перавыданьне «Слоўніка ўласных імёнаў» Міхаіла Судніка, якім карыстаюцца ўсе ЗАГСы.

Неўзабаве чакаецца кніга Юр’я Чантурыі «Горадабудаўнічае мастацтва Беларусі (2-я палова XVI — 1-я палова XIX ст.)». Пасьля доўгага перапынку выйдзе чарговы, 9-ы том «Этымалягічнага слоўніка». Рыхтуецца 4-ы том «Гісторыі беларускага кінамастацтва». У сэрыі «Беларусы» выйдзе 7-ы том, які называецца «Вусная паэтычная творчасьць».

Па-расейску выйдзе кніга У.Корсуна і А.Яфрэмава «Эратычныя травы» — «сур’ёзнае навуковае выданьне на добрым прафэсарскім узроўні», як адзначыла дырэктарка выдавецтва Людміла Пятрова.

## Новая ўскалось

Уласны выдавецкі бізнэс, як стала вядома «НН», адкрывае вядомы перакладчык Зьміцер Колас: як прыватны прадпрымальнік ён ужо зарэгістраваўся, цяпер чакае выдавецкай ліцэнзіі. Найперш Колас мае выдаць біяграфію Манэргейма і раман клясыка французскага «новага раману» Алена Роб-Грые «Праект рэвалюцыі ў Нью-Ёрку».

**Адам Воршыч**

## У кніжнай Францыі — стаўпатварэньне

Французскія выдаўцы заплянавалі на восень выхад 661 раману. Гэта трохі меней, чым у 2004 г., але ўдвая болей, чым у 1994-м. У адрозьненьне ад Беларусі, дзе новы раман паяўляецца гады ў рады і амаль выключна на старонках часопісаў-чарапахаў, у Францыі друкуецца шмат кніг і зусім няма «тоўстых неілюстраваных літаратурных часопісаў».

Чытаюць, праўда, меней, чым выдаюць. Ня кожнаму аўтару, асабліва з маладых, удаецца прадаць свой раман вялікім накладам. Каб зьвярнуць на сябе ўвагу, выдаўнічка Віўяна Амі вырашыла... не прэзэнтаваць новых кніг у другой палове году. Яна спадзяецца, што такім чынам чытачы змогуць лепш «пераварыць» папярэднія выданьні гэтага якаснага выдавецтва, сярод аўтараў якога — папулярны ў Францыі Фрэд Варгас.

**МБ**

## Амэрыканскія бэстсэлеры

Дзесятка кніг, самых папулярных у пакупнікоў сеткі кнігарань «Barnes&-Noble»

1. **Заключная справаздача Нацыянальнай камісіі па расьсьледаваньні падзей 11 верасьня 2001 году пра тэрарыстычныя атакі на Злучаныя Штаты** / The 9/11 Commission Report: The Final Report of the National Commission on Terrorist Attacks upon the United States. Камісія, заснаваная ў 2002 г. пастановамі Кангрэсу і прэзыдэнта ЗША для праверкі фактаў, высьвятленьня абставін тэрарыстычных атак, завяршыла сваю работу ў ліпені 2004 г. Чытаць справаздачу і захапляльна, і актуальна.
2. Раман **«Нататнік»** Нікаласа Спаркса / «Notebook» by Nicholas Sparks — гісторыя маладога чалавека, які вярнуўся дамоў з Другой сусьветнай і сустрэў жанчыну, у якую ён быў закаханы ў юнацтве. 80-гадовы стары перачытвае ўласную запісную кніжку — гісторыю свайго даўняга каханьня.
3. **«Код да Вінчы»** / «The Da Vinci Code» — прыгодніцкі дэтэктыў Дэна Браўна (Dan Brown), напісаны ў стылі Ўмбэрта Эка. Расьсьледаваньне забойства пераплецена з гісторыяй рэлігіі, архітэктуры; інтрыга раману будуецца вакол карцінаў Леанарда да Вінчы і Сьвятога Граалю.
4. Працяг «Нататніка» — раман **«Вясельле»** / «The Wedding» Нікаласа Спарка. Гісторыя каханьня дзяцей галоўных герояў «Запісной кніжкі».
5. Цікавасьць да ранейшага раману Дэна Браўна **«Анёлы і дэманы»** / «Angels and Demons» шмат у чым выклікана папулярнасьцю «Коду да Вінчы». У «Анёлах...» той самы гарвардзкі прафэсар знаходзіць сьведчаньне немагчымага — адраджэньня старажытнага таемнага Таварыства ілюмінатаў. Мэта ілюмінатаў — зьнішчыць Каталіцкі касьцёл. У катакомбах Ватыкану закладзена бомба, выбух прадухіліць немагчыма...
6. **«Купаньне галяком»** Карла Хіясэна / «Skinny Dip» by Carl Hiaasen — сатырычны крымінальны раман пра пасрэднага навукоўца, які прыншоў у біялёгію, каб забіваць. Аднак у ягоныя лёхія задумы ўмешваецца жонка. Некаторыя рэцэнзэнты параўналі аўтара з Маркам Твэнам.
7. **«Р як рыкашэт»** / «R Is for Ricochet». Аўтар Сью Грэфтан (Sue Grafton). Гісторыя жыцьця маладой жанчыны, якую ў раньнім дзяцінстве кінула маці, пра ўзаемаадносіны дачкі з бацькам, пра тое, як у 22 гады яна была асуджаная за крадзеж і пасьля турмы спрабуе вярнуцца да нармальнага жыцьця.
8. Мэмуары Біла Клінтана (Bill Clinton) **«Маё жыцьцё»** / «My Life» выйшлі напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў і, як заяўлена ў прадмове, маюць на мэце бесстароньне аценіць посьпехі і няўдачы былога прэзыдэнта.
9. Дзеяньне раману **«Правіла чацьвёркі»** / «The Rule of Four» пабудавана вакол загадкавага тэксту XV ст. «Hypnerotomachia Poliphili», што азначае «Барацьба за каханьне ў сьне». Кніга адкрывае героям сьвет забытых ведаў, дзіўных сэксуальных жаданьняў і жахлівай жорсткасьці. Аўтары раману Ян Колдвэл (Ian Caldwell) і Дасьцін Томасан (Dustin Thomason) — студэнты Прынстанскага ўнівэрсітэту, якія кінулі вучобу для працы над кнігай.
10. **«Дыета Паўднёвага пляжу. Смачны, складзены доктарам, надзейны плян для хуткага і здаровага пахудзеньня»** / «The South Beach Diet. The Delicious, Doctor-Designed, Foolproof Plan for Fast and Healthy Weight Loss» напісана доктарам Артурам Агетстэнам (Arthur Agatston). Паўднёвы пляж — гэта мясцовасьць у Фларыдзе, дзе, як лічыцца, можна сустрэць людзей толькі з прыгожымі фігурамі. Кніга апісвае адну зь нізкавугляводных дыет, якія апошнім часам склалі канкурэнцыю папулярнай дыеце доктара Эткінса.

# Верш на «Свабоду»

**Супрацоўнікі КГБ вывучалі лісты, дасланыя ў «ЛіМ» пасьля Сачанкавага артыкулу, і знайшлі падабенствы ў 14 літарах з почыркаў Голуба і «Кліноўскага». Аднак Голуб не прызнаўся...**

Валер Голуб ня піша вершаў ужо амаль паўстагодзьдзя. Два свае вершы ў 1954-м ён паслаў на радыё «Вызваленьне» (цяперашнюю «Свабоду»). Адзін зь іх — байка «Асёл і мова» — выкрываў беларусафобства. У другім вершы, згадвае сп.Валер, выказвалася ўпэўненасьць, што будзе час, калі мы сядзем за адным сталом разам з эміграцыяй без камуністаў.

Вершы на той час рызыкоўныя, але ж хлопцу было толькі сямнаццаць. Праўда, досьвед жыцьця ў СССР усё ж адчуваўся нават у такія маладыя гады: адпраўляючы вершы, Валер канспіраваўся ня менш, як рэвалюцыянэры — ад паліцы. Падпісаўся прозьвішчам «Кліноўскі», пісаў зьмененым почыркам, даў фіктыўны зваротны адрас, паперу зь вершамі браў ня голымі рукамі, а толькі празь яшчэ адзін аркуш, нават капэрту голымі рукамі не чапаў — толькі праз паперу. «Ведаў, што будуць шукаць. Вядома, я сумняваўся, што ліст дойдзе. Калі б не сумняваўся, не пісаў бы зьмененым почыркам і г.д.», — згадвае сёньня Голуб.

Ён жыў тады ў бацькоў — у вёсцы Чалюшчавічы каля Капаткевічаў Петрыкаўскага раёну (бацька быў настаўнікам беларускай мовы). Вершы, вядома, адпраўляў ня з дому — зь Менску, дзе на філфаку БДУ вучылася сястра. Падчас аднаго з прыездаў да сястры кінуў гатовы ліст у паштовую скрыню.

Вершаў не паказваў нікому. Копію чатыры гады хаваў у хляве ў бацькоў, пад стружкай. Значна пазьней, калі ўжо служыў у войску, атрымаў ліст ад бацькі, што быў моцны вецер і «паматляў страху». Падумаў: можа, і мае вершы выкінула?.. І як толькі прыехаў, зьнішчыў паперы. І з таго часу больш вершаў не пісаў.

Ягоныя творы на замежнае радыё так і ня трапілі — аселі ў КГБ. Даведаўся пра гэта Валер толькі ў 1958 г., калі сам трапіў да сьледчых гэтай установы. Да таго часу ён пасьпеў паступіць у Менскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум і амаль скончыў яго…

У сьнежні 1957 г. у «ЛіМе» зьявіўся артыкул Барыса Сачанкі супраць русіфікацыі «Шанаваць родную мову», што выклікаў вялікую дыскусію. Газэта двойчы друкавала водгукі чытачоў на артыкул. Голуб пазнаёміўся з Сачанкам, калі спрабаваў паступіць на філфак БДУ. Потым бачыўся колькі разоў на вечарынках на філфаку, куды запрашала сястра, але блізка не кантактаваў. На артыкул адгукнуўся, бо «зачапіла» тэма. Мабыць, супрацоўнікі КГБ вывучалі лісты, дасланыя ў «ЛіМ» пасьля Сачанкавага артыкулу, і знайшлі падабенствы ў почырках Голуба і «Кліноўскага».

5 сакавіка 1958 г., напярэдадні атрыманьня дыплёму, Валера выклікалі да дырэктара тэхнікуму. Той папрасіў дапамагчы перавезьці кнігі нейкаму незнаёмцу. «Я адчуваў, што нешта ня тое, — прыгадвае сп.Голуб. — Знаходзіўся я далёка ад дырэктаравага кабінэту. Можна было б узяць першага стрэчнага. Але ж не — мяне паклікалі!» Незнаёмец быў на машыне — з кіроўцам і яшчэ адным суправаджальнікам. Машына заехала ў вядомы ўсяму Менску будынак КГБ.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Валер Голуб, 2004 год.**

Пыталіся шмат. Як вучышся? Хто твой бацька? Што робіць маці? А потым паказалі капэрту зь вершамі: твае? Экспэрт-графоляг сказала, што знайшла падабенствы почыркаў у 14 літарах. Аднак Голуб не прызнаўся: «Думаю, вы правяралі не аднаго мяне. У кагосьці, мяркую, знайшлі менш падабенства — у шасьці або васьмі выпадках. Дык чаму спыніліся на мне? Пашукайце таго, у каго падабенства будзе яшчэ больш, чым у мяне». Сьледчы зрабіў перапынак, каб абдумаць сытуацыю.

Пасьля перапынку гаворка ўжо ішла толькі пра ліст у «ЛіМ». Як адпраўляў матэрыял у газэту? Ці знаёмы з Сачанкам? Адкуль даведаўся, што ў Менску толькі 10 беларускамоўных школ з 58? Прасілі апазнаць людзей на фатаздымках, зробленых праз адтуліну для ключа. «Калі я потым абдумваў сытуацыю, мне здалося, што альбо людзі, якія мной займаліся, мелі невысокі прафэсіяналізм, альбо яны былі зацікаўленыя, каб згарнуць справу. Пагатоў, у той час Хрушчоў сказаў, што ў нас няма палітычных зьняволеных. А судзіць мяне маглі толькі як палітычнага злачынцу: я ж нідзе нічога не разьбіў, нідзе не крычаў на вуліцах антысавецкіх лёзунгаў. Мазураву (тагачаснаму кіраўніку) і КГБ гэты суд сапсаваў бы статыстыку. Праўда, гэта толькі мая пазьнейшая здагадка. Незадоўга да таго і Берыя выступіў на тэму, што Савецкі Саюз можа разваліцца па нацыянальнай прымеце, дык з гэтым трэба быць больш акуратным. Тады ж пачалася беларусізацыя, сталі ставіць беларусаў на розныя пасады. А то дайшло да таго, што ў Беларусі не было ніводнага ўчастковага-беларуса — толькі адны расейцы. Гэта прызнаў нават Берыя», — кажа сп.Валер.



АРХІЎ В.ГОЛУБА

**Барыс Сачанка і Валер Голуб (па баках) каля хімфаку БДУ. 1954 год.**

Яго пратрымалі ў КГБ крыху больш за суткі. Начаваць паклалі ня ў камэры, а на канапе ў калідоры. За той час, пакуль трымалі, правялі ператрус у яго дома. Больш за ўсё Голуб баяўся за вершы «буржуазнага нацыяналіста» Гаруна, выпісаныя зь літаратуразнаўчага артыкулу Міхася Ларчанкі, ды за цытаты з кнігі Ніны Каменскай «Утварэньне БССР»: у іх Віленшчына, Беласточчына ды Смаленшчына называліся этнічна беларускімі…

Зранку ён напісаў прызнаньне ў «буржуазным нацыяналізьме» і паабяцаў вылечыцца ад гэтай «ідэалягічнай хваробы». Пісаў, што, вывучаючы палітэканомію ў тэхнікуме, паразумнеў, што па камсамольскай пуцёўцы езьдзіў уздымаць цаліну. Увечары 6 сакавіка яго выпусьцілі, папрасіўшы ня згадваць нідзе пра гэтае затрыманьне і пры нагодзе зайсьці падзякаваць лёсу. «Калі яны падпісаліся пад пратаколам, тады я іх прозьвішчы і запомніў: Дзяргай і Сяржэўскі. Пэўт такі быў — Сяргей Дзяргай. Дык я пытаю: вы той самы Дзяргай? А ён у адказ: не, я іншы… Можа, ім ня быў патрэбны адзін чалавек. Можа, яны хацелі прасачыць за мной і «скалаціць» якую-небудзь арганізацыю», — апавядае Голуб. Пагатоў што яму некалькі разоў называлі імя дзяўчыны, у якой нібыта такія ж погляды, як і ў яго, — мабыць, спадзяваліся, што ён пачне шукаць зь ёй сустрэчы.

Аднак выпушчаны Голуб на правакацыю не паддаўся, а накіраваўся ў тэхнікум — забіраць дыплём. Апрача дырэктара, у тэхнікуме так ніхто і ня ведаў, што яго забіралі ў КГБ. Размеркаваць хацелі ў Менск. Але, баючыся, што за ім будуць сачыць, Валер папрасіўся як мага далей — яго паслалі пад Талачын.

Потым было войска, навучаньне ў Маскоўскім інжынэрна-фізычным інстытуце па спэцыяльнасьці «ядравая бясьпека». Прыехаўшы ненадоўга ў Менск, Голуб і сапраўды зайшоў у КГБ падзякаваць: калі б стала вядома пра ягонае затрыманьне — не вучыцца б яму на «сакрэтнай спэцыяльнасьці». Спытаў у вахцёра пра «Дзяргая і Сяржэўскага» і пачуў, што тут такіх ніколі й не было.

Правёўшы большую частку жыцьця ў Расеі, на пачатку 90-х Валер Голуб вярнуўся ў родную Беларусь. Працаваў у Хвайніках, у радыелягічным запаведніку. Цяпер выйшаў на пэнсію й стала атабарыўся ў Менску. Піша публіцыстычныя артыкулы. А да вершаў так і не вярнуўся.

**Аркадзь Шанскі**

ЭПІЗОДЫ

# Пыркі жывой крыві



УЛАДЗІМЕР КРУК

Станіслаў Шушкевіч: «Калі ў Менск прыехаў амэрыканскі карэспандэнт, зь ім ніхто не хацеў сустракацца. Усе на падазрэньні!»

Больш за 30 гадоў я шчыраваў тэлевізійнай Музе. Шчыраваньне гэтае не адзін раз зводзіла мяне зь людзьмі найцікавейшага лёсу. Адным зь іх быў Станіслаў Шушкевіч-старэйшы. Завітаў я да яго з тэлевізійнай камандай. Меліся мы запісаць пра ягоныя сустрэчы з Калініным. Але нечакана сапсаваўся магнітафон. Экіпа кінулася рамантаваць тэхніку, а мы тым часам разгаварыліся з Станіславам пра ягонае жыцьцё.

— …Да арышту я працаваў, — згадваў патрыярх беларускага пісьменьніцкага корпусу, — у сакрэтным аддзеле Ленінскай бібліятэкі. Езьдзіў па розных раёнах, камплектаваў бібліятэку за кошт панскіх бібліятэк. Аднаго разу паехаў у Воршу. Туды зьвезьлі з навакольных маёнткаў кнігі на макулатуру. Гэта была пераважна рэлігійная літаратура. Але сярод яе я знайшоў цэлы камплект «Мужыцкай праўды» Кастуся Каліноўскага. Камплект гэты я, вядома, забраў у бібліятэку. Дырэктар бібліятэкі Сіманоўскі быў усьцешаны такой знаходкай. Ён быў чалавек адукаваны, ведаў шмат моваў. Сказаў, каб я ніякіх кніг не пакідаў на макулатуру. Дзе-гэтых кніг маюць цікавасьць за мяжой. За іх мы будзем мець ці валюту, ці на абмен прыдадуцца. Абмен з Англіяй, Францыяй. Сіманоўскі гэта добра наладзіў.

Станіслаў Шушкевіч пачаў працаваць у бібліятэцы імя У.Леніна з 1928 году. «Гэта была пара недаверу, агульнага страху, — згадваў пісьменьнік. — Памятаю, прыехаў у Менск амэрыканскі карэспандэнт. Ён цікавіўся працай бібліятэк. Але зь ім ніхто не хацеў сустракацца. Усе ўхіляліся. Сіманоўскі таксама: сустрэнься зь ім, дык тады не адчэпішся. Усе на падазрэньні! Тады я званю ў ЦК: так і так, кажу. Мне сказалі: «Сам сустракай!» Сам дык сам. Я ж быў тады зусім яшчэ малады. Мне ўсяго якіх дваццаць! Дык што? Я бяру Бібілу, каб хоць якая сьведка была. Мала чаго пасьля могуць прыдумаць! Гаварылі мы пра Нью-Ёрскую і нашу бібліятэку. Я казаў: «У вашай бібліятэцы васямнаццаць мільёнаў. У нас — тры мільёны. Але ж наша бібліятэка маладая. Калі мы будзем так расьці, то перагонім Нью-Ёрскую!»

— Ну і чым скончылася для Вас тая сустрэча з амэрыканскім карэспандэнтам? — цікаўлюся я.

— Тады нічым. Але пасьля ўсё прыпомнілі. Арыштавалі мяне ў лістападзе 1936 г. Я атрымаў восем гадоў. А чаму? Мне пасьля адзін юрыст патлумачыў. На допыце сьледчы з размаху храснуў мне па пальцах. З пальцаў пырснула кроў, хлынула на дакумэнты допыту. А гэта ўжо было супраць сьледчага. Перапісваць няпроста было. Трэба было подпісы зьбіраць. А зьбіраць іх, мусіць, было не зусім выгодна. На тым і скончыліся мае допыты. Так мая кроў мяне і паратавала.

Пасьля здымак стары пісьменьнік зноў вярнуўся да згадак пра сваю працу ў бібліятэцы імя Леніна:

— Калі я працаваў у бібліятэцы, — сказаў ён, — адукацыя ў мяне была ўсяго толькі сярэдняя. А даводзілася весьці перапіску з замежнымі фірмамі, і я мусіў для важнасьці падпісваца «прафэсар Станіслаў Шушкевіч».

Ня ведаю, ці занатаваў дзе гэтыя свае згадкі сам пісьменьнік, але ў мяне яны занатаваныя і я іх падаю так, як чуў. Дата нашай сустрэчы з Шушкевічам у маім нататніку пазначана 17 лістапада 1987 г. на Цьнянскай, 15.

**Уладзімер Содаль**

# Чалавек у ролі Бога

## Магчымасьць рабіць сьмерць шакуе людзей менш, чым магчымасьць рабіць новае жыцьцё

Алесь Пяткевіч

Дыскусія вакол клянаваньня чалавека трывае шмат гадоў. Плёнам яе сярод іншага стала адрозьніваньне тэрапэўтычнага і рэпрадукцыйнага клянаваньня чалавечых эмбрыёнаў. Першае — клянаваньне эмбрыёнаў для навуковых дасьледаваньняў у тэрапэўтычных мэтах. Другое ставіць на мэце стварэньне новай чалавечай істоты з паўтораным геномам, нараджэньне дзіцяці — дакладнай генэтычнай копіі чалавека, які жыве ці нават ужо памёр.

У сёлетнім жніўні група дасьледчыкаў з унівэрсытэту Ньюкаслу атрымала першую ў Эўропе ліцэнзію на клянаваньне чалавечых эмбрыёнаў. Гэты дазвол стаў магчымы менавіта дзякуючы адрозьніваньню рэпрадукцыйнага і тэрапэўтычнага клянаваньня, адлюстраванаму ў брытанскім заканадаўстве. Брытанскі Закон аб чалавечай эмбрыялёгіі забараняе рэпрадукцыйнае клянаваньне і прадугледжвае да 10 гадоў пазбаўленьня волі для магчымых парушальнікаў забароны. Аднак дадатак да закону, прыняты ў 2001 годзе, дазваляе лябараторныя дасьледаваньні з выкарыстаньнем клянаваных эмбрыёнаў, якія павінны зьнішчацца па заканчэньні экспэрымэнтаў.

### Жыцьцё даўжынёю два тыдні

Клянаваныя эмбрыёны патрэбныя для атрыманьня так званых ствалавых клетак, якія могуць разьвівацца ў клеткі любых тканак чалавечага цела. Практычная мэта дасьледаваньняў брытанскіх навукоўцаў — распрацоўка новых мэтадаў лячэньня хвароб Альцгеймэра, Паркінсона, дыябэту. Тэхналёгія, якую выкарыстоўвае група навукоўцаў зь Ньюкаслу, называецца заменай клеткавага ядра: ядро донарскай яйцаклеткі замяняюць ядром клеткі чалавека (напрыклад, клеткі скуры), чый генэтычны код клянуецца. У выніку штучнай стымуляцыі яйцаклетка пачынае дзяліцца і расьці, як звычайны эмбрыён. Клянаваныя эмбрыёны будуць жыць ня больш як 14 дзён.

Забарона рэпрадукцыйнага клянаваньня мае шанец набыць статус табу, прынамсі ў той частцы сьвету, дзе ўзровень разьвіцьця навукі дазваляе праводзіць такія экспэрымэнты. Так, забарона рэпрадукцыйнага клянаваньня прадугледжвалася ў абодвух праектах рэзалюцыі пра клянаваньне, якія прапаноўваліся да прыняцьця ў ААН. Ніводны праект ня быў прыняты, бо няма згоды ў стаўленьні да тэрапэўтычнага клянаваньня.

Калі працўнікі рэпрадукцыйнага клянаваньня паўсюль складаюць бальшыню, дык тэрапэўтычнае клянаваньне не выклікае такога адназначнага грамадзкага непрыманьня.

### Запчасткі для чалавека

Спакусьлівыя пэрспэктывы атрыманьня стопрацэнтна адпаведных «запасных частак» для чалавечага цела здабываюць тэрапэўтычнаму клянаваньню шмат прыхільнікаў. Дасьледаваньні ствалавых клетак адкрываюць вялізныя пэрспэктывы. Для мноства невылечна хворых людзей і іх блізкіх гэта папросту прапанова, ад якой яны ня могуць адмовіцца. Прыхільнікі тэрапэўтычнага клянаваньня гавораць, што дасьледаваньні чалавечых эмбрыёнаў нікому ня робяць шкоды, затое могуць зьдзейсьніць пераварот у мэдыцыне. Яны таксама кажуць пра неэфэктыўнасьць забаронаў увогуле і марнасьць спробаў спыніць прагрэс — маўляў, няма сэнсу спрачацца, маральна штосьці ці не, калі яно ўсё адно адбудзецца.

Працўнікі тэрапэўтычнага клянаваньня кажуць, што амаральна штучна ствараць і пасьля зьнішчаць штосьці, што мае патэнцыял стаць чалавекам. Яны сьцьвярджаюць, што чалавечы эмбрыён — не адзіна магчымая крыніца ствалавых клетак. Падобныя да іх уласьцівасьці маюць некаторыя клеткі касьцявога мозгу дарослага чалавека, і іх дасьледаваньне — магчыма, не такі шматабяцальны, але значна менш спрэчны з маральна-этычнага гледзішча шлях.

Іншы аргумэнт супраць тэрапэўтычнага клянаваньня — тое, што вынікі такіх дасьледаваньняў, якія друкуюцца ў навуковай прэсе і ў Інтэрнэце, могуць быць выкарыстаны для спроб стварэньня дзяцей-клёнаў у тых краінах, дзе адсутнічае адпаведнае заканадаўства.

### Касьцёл супраць

Нарэшце, супраць любых экспэрымэнтаў з чалавечымі эмбрыёнамі выступаюць хрысьціянскія цэрквы. Канфэрэнцыя каталіцкіх біскупаў у Беларусі распаўсюдзіла адмысловы пастырскі ліст аб каштоўнасьці жыцьця чалавека і небясьпеках, якія пагражаюць яму ў сучасным сьвеце. З гледзішча каталіцкай царквы, недапушчальным зьяўляецца ня толькі клянаваньне, але й аборты, штучнае апладненьне, кантрацэпцыя, бо «кожнае жыцьцё даецца Богам і толькі Ён зьяўляецца яго Гаспадаром. Толькі Ён як Найвышэйшы Творца можа вырашаць, калі пачнецца і калі скончыцца жыцьцё чалавека».

### Ліцэнзія на клянаваньне

Зрэшты, чалавек верыць у тое, у што хоча. Раэліянства, заснаванае скандальна вядомым французам Клёдам Варыёнам, які пасьля «прасьвятленьня праз іншапляцэтніка» атрымаў новае імя — Раэль, мае ўжо больш за 50 тысяч прыхільнікаў у больш як 80 краінах сьвету.

Вернікі рэлігіі — зарэгістраванай уладамі Квэбэку – упэўнены, што вяршыняй разьвіцьця нашай цывілізацыі ў агляднай будучыні павінна стаць дасягненьне несьмяротнасьці, якое стане магчымым у выніку далейшых дасьледаваньняў у галіне клянаваньня. Такім чынам, прыхільнікі клянаваньня маюць дадатковы аргумэнт: забарона клянаваньня парушае свабоду веравызнаньня.

Беларускія навуковыя арганізацыі пакуль не займаюцца дасьледаваньнямі ў галіне тэрапэўтычнага клянаваньня, хоць з навукова-тэхнічнага гледзішча такія дасьледаваньні ў Беларусі магчымыя.

«Гэта больш пытаньне маральнай гатоўнасьці грамадзтва, — кажа вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага каардынацыйнага цэнтру біябясьпекі Барыс Аношанка. — Трэба даць інфармацыю грамадзтву, патрэбны адмысловыя адукацыйныя праграмы». Нацыянальны каардынацыйны цэнтар біябясьпекі рыхтуе да друку кнігу «Біятэхналёгіі. Біябясьпека. Біяэтыка», якая мае выйсьці ў верасьні і асобны разьдзел якой будзе прысьвечаны этычным праблемам клянаваньня.

### Біябясьпека Беларусі

Законаў, якія б забаранялі ці рэгляментавалі дасьледаваньні ў галіне клянаваньня чалавека, у Беларусі няма. Але гэта ня значыць, што пабач з рэклямай цэнтраў экстракарпаральнага апладненьня ў менскім мэтро можа зьявіцца рэкляма «Clonaid» — заснаванай прыхільнікамі Раэля фірмы, якая прапануе любому ахвотнаму клянаваць сябе за ладную суму грошай (паводле слоў прадстаўнікоў «Clonaid», на плянэце ўжо падрастаюць некалькі клянаваных імі немаўлят, аднак ніякіх доказаў пасьпяховасьці сваіх досьледаў фірма не дае). «Сытуацыя была іншая 5—10 гадоў таму — тады рабілі, хто што хацеў», — кажа Барыс Аношанка. Цяпер прыватныя мэдычныя ўстановы мусяць ліцэнзаваць свае праграмы ў Міністэрстве аховы здароўя.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Барыс Аношанка, спэцыяліст Нацыянальнага цэнтру біябясьпекі: «У Беларусі робіцца вельмі шмат абортаў. Калі адзін такі эмбрыён можа выратаваць жыцьцё 5-6 чалавекам, дык чаму не».

Рост падлетка-баскетбаліста часта апярэджвае тэмпы, нармальныя для чалавека. Скура не пасьпявае за ростам і лопаецца, і ў дарослага чалавека на сьпіне застаюцца гарызантальныя шнары, нібы гадавыя колы на пні дрэва. Гэткія шнары хуткага росту застаюцца і ў гісторыі зямной цывілізацыі. Навукова-тэхнічны прагрэс, эвалюцыя мысьленьня разрываюць прывычныя структуры. Пільна сочачы, каб навука не падрывала «боскіх задумаў», сярэднявечная інквізыцыя паслала на вогнішчы мноства тагачасных дасьледнікаў. Адсутнасьць забароны ўжываньня ядзернай зброі ў той час, калі гэтая зброя ўжо зьявілася, прывяла да трагедыі Хірасімы й Нагасакі.

З кожным новым дасьледаваньнем клянаваньне робіцца ўсё больш выклікам сучаснай цывілізацыі, прымушаючы фармуляваць новыя забароны, удакладняць ці перагледжваць старыя, шукаць кампрамісаў. Агульная разгубленасьць чалавецтва ў лістападзе 2003 г. адлюстравалася ў рашэньні ААН, якое на два гады адклала разгляд рэзалюцыі аб забароне клянаваньня.

### Чалавек у ролі Бога

Шакуе тое, што чалавек бярэ на сябе ролю Бога, ствараючы новае жыцьцё. Аднак у многіх з шасьці дзясяткаў краін, якія на чале з ЗША дамагаліся ў ААН поўнай забароны клянаваньня — як рэпрадукцыйнага, так і тэрапэўтычнага, — існуе сьмяротнае пакараньне і дазволены аборты — то бок узаконенае забойства істот, якія маюць ня меншыя падставы звацца людзьмі, чым чалавечыя эмбрыёны, мікраскапічныя скопішчы некалькіх соцень клетак — так выглядае эмбрыён на той стадыі разьвіцьця, калі зь яго вымаюць ствалавыя клеткі.

У Бэльгіі, якая ачольвала супраціў лягер з больш як двух дзясяткаў краін, дазволена эўтаназія. Амэрыканскія навукоўцы, ня маючы права клянаваць чалавечыя эмбрыёны, маюць права выкарыстоўваць у сваіх дасьледаваньнях, то бок забіваць, ужо наяўныя эмбрыёны. Брытанцам пасьля шэрагу скандалаў дазволена ствараць чалавечыя эмбрыёны — пры абавязковай умове іх зьнішчэньня на раньняй стадыі. Карэйскія дасьледнікі, якія сёлета ўпершыню зьдзейсьнілі тое, на што брытанцы толькі атрымалі дазвол, — клянавалі 30 эмбрыёнаў і нават давялі атрыманыя ствалавыя клеткі да пачатку спэцыялізацыі, імплянтаваўшы іх у арганізмы пацукоў, — падкрэсьліваюць, што і ў думках ня мелі, ня маюць і ня будуць мець вырасьціць чалавека з клянаванага эмбрыёна.

Выглядае, што магчымасьць рабіць сьмерць шакуе людзей менш, чым магчымасьць рабіць новае жыцьцё. Моц прывычкі. Забарона забойства даўно існуе ў разнастайных рэлігійных і грамадзкіх кодэксах і гэтак жа даўно сыстэматычна парушаецца прадстаўнікамі ўсіх цывілізацый, вернікамі ўсіх рэлігій. Забарона ствараць новае жыцьцё нейкім іншым, адрозным ад Богам ухваленага і агульнапрынятага шляху, — адносна новая рэч, бо новая сама магчымасьць. Чалавецтва яшчэ не назапасіла надта вялікага досьведу парушэньняў гэтай забароны — але працэс ужо пайшоў.

### З Пастырскага ліста Канфэрэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі

«Жаданьне мець дзяцей зьяўляецца цалкам натуральным, аднак адзіны годны спосаб зачацьця дзіцяці — акт сужэнскай любові. Штучнае апладненьне (in vivo ці in vitro), да якога зьвяртаюцца сужэнцы, пакрыўджаныя невылечнаю бясплоднасьцю, пазбаўленае гэтага асабістага дару. Дзіця становіцца прадуктам мэдыцынскіх тэхнік, прадметам. Шмат дзяцей, зачатых такім чынам, павінна памерці, каб магло нарадзіцца адно дзіця. Ненатуральная па сваёй сутнасьці тэхніка апладненьня вядзе да «вырабу» большай колькасьці чалавечых эмбрыёнаў, каб павялічыць імавернасьць удалай працэдуры. З маральнага пункту погляду, сужэнцы, якія згаджаюцца на штучнае апладненьне, робяць цяжкі грэх.

Клянаваньне нясе з сабою такія ж вынікі, як і штучнае апладненьне. Выкарыстаньне значнай колькасьці эмбрыёнаў, якія пераўзыходзяць дапушчальную колькасьць, іх зьнішчэньне для атрыманьня аднаго індывідуума, а далей пазбаўленьне дзіцяці ў біялягічным, псыхічным і юрыдычным вымярэньнях права быць зачатым і нарадзіцца ў сям'і ад бацькоў, трактаваньне яго як «прадукту» біямэдыцынскіх мэтодык... сьведчаць пра тое, што клянаваньне людзей недапушчальнае».



**Айцец Аляксандар Надсан, апостальскі візытатар для беларусаў замежжа:**
«Агульны прынцып такі: жыцьцё людзкое, няважна на якой стадыі, ёсьць сьвятое, і яго недапушчальна зьнішчаць. Я не спэцыяліст і ня ведаю, як яны ствараюць гэтыя эмбрыёны. Не разьбіраюся ў іхных тэхналёгіях, пакідаю спэцыялістам з маралі, багаслоўя і біялёгіі вырашаць, ці ёсьць гэта жыцьцём».

## Хроніка разьвіцьця клонатэхналёгій:

**1997:** Авечка Долі — першы ўдалы клон-сысун.

**1997—2000:** Навукоўцы розных інстытутаў клануюць разнастайныя віды жывёлаў.

**1998:** Амэрыканец Рычард Сід заявіў, што будзе гатовы пачаць экспэрымэнты ў клянаваньні чалавека у найбліжэйшыя тры месяцы.

**Красавік 2001:** Італьянскі доктар Сэвэрына Антынory заявіў, быццам адна зь яго пацыентак цяжарная кланаваным эмбрыёнам. Пазьней гэтая інфармацыя абвергнутая.

**Ліпень 2002:** Улады Паўднёвай Карэі расьсьледуюць заявы пэўнай кампаніі аб імплянтацыі кланаванага чалавечага эмбрыёна ў паўднёвакарэйскую жанчыну.

**Студзень 2002:** Фірма «Clonaid», заснаваная раэліянскай сэктай, заяўляе аб нараджэньні першага чалавекаклона, выклікаючы зьдзіўленьне і праклёны. Фірма так і не дала ўзораў ДНК у якасьці доказаў сваёй заявы.

**Люты 2003:** Авечку Долі усыпляюць пасьля вэтэрынарнага абсьледаваньня, якое паказвае, што Долі хворая на рак лёгкіх.

**Ліпень 2003:** Эдынбурскім навукоўцам, якія кланавалі Долі, выдаецца першая ў Вялікай Брытаніі ліцэнзія на дасьледаваньні з выкарыстаньнем тэхналёгіі, якая дазваляе атрымліваць эмбрыянальныя стваловыя клеткі з чалавечых яйцаклетак.

**Верасень 2003:** Д-р Панас Завас заяўляе аб стварэньні першага ў сьвеце кланаванага чалавечага эмбрыёна. Ён пляную імплантаваць эмбрыён у сурагатную маці да канца году.

**Кастрычнік 2003:** Кітайскія навукоўцы заяўляюць аб стварэньні блізьнятаў, якія мелі дзьвюх «генэтычных маці» і аднаго бацьку, але ў выніку экспэрымэнту дзеці не народжаныя. Адзін экспэрт назваў гэты экспэрымэнт «доказам прынцыпу» кланаваньня чалавека, але іншыя з гэтым не пагаджаюцца. Праца ня мела на мэце стварэньне генэтычных копіяў людзей.

**Люты 2004:** Паўднёвакарэйскія навукоўцы клануюць 30 чалавечых эмбрыёнаў і падтрымліваюць іх жыцьцё на працягу некалькіх дзён, да стадыі разьвіцьця, на якой зь іх можна атрымаць адмысловыя клеткі, вядомыя як эмбрыянальныя стваловыя клеткі. Дасьледнікі спадзяюцца атрымаць клеткі, якія калісьці можна будзе выкарыстоўваць у мэдычных мэтах.

## Шаноўнае спадарства!

**Набліжаецца да заканчэньня праца над Зводам правілаў беларускага клясычнага правапісу (тарашкевіцы). Шэраг пытаньняў, якія паўсталі перад сябрамі працоўнае групы, выклікаюць цяжкасьці пры іх разьвязаньні, а таму працоўная група вырашыла зьвярнуцца да зацікаўленых асобаў з анкетаю.**

**Прапануем Вам запоўніць анкету, выбраўшы пэўныя варыянты адказаў. Таксама будзем радыя атрымаць ад Вас разгорнутыя адказы, заўвагі, рэкамэндацыі з нагоды працы над Зводам.**

**Просім даслаць запоўненую анкету да 5 верасьня 2004 году адным зь пералічаных спосабаў:**

**праз пошту: Зьміцер Саўка, бульвар Шаўчэнкі, 22-51, 220068, Менск (BELARUS);**

**праз электронную пошту: artahrama@hotmail.com;**

**або затэлефанаваць: (375-17) 233-44-58.**

**Шчыра дзякуем за ўдзел у анкетаваньні.**

**Працоўная група: Юрась Бушлякоў, Вінцук Вячорка, Зьміцер Санько, Зьміцер Саўка.**

## А Н К Е Т А

**Пытаньне 1.** Пераход **і** як асобнага слова (злучнік або часьцінка) пасьля галосных у **й**.

**A.** **і** пераходзіць у **й** заўсёды. *Бацька **й** сын. Яна **й у** нас была.*

**B.** **і** пераходзіць у **й**, апроч выпадаў перад **у** (**ў**): *Яна **і ў** нас была.*

**C.** **і** пераходзіць у **й**. У становішчы перад **у** (**ў**) **і** можа захоўвацца: *Яна **й у** нас была = Яна **і ў** нас была.*

**D.** **і** можа пераходзіць у **й**: *Бацька **і** сын = Бацька **й** сын.*

**E.** **і** не пераходзіць у **й**, апроч паэтычных тэкстаў (як у наркамаўцы): *Бацька **і** сын.*

**Пытаньне 2.** Форма пазычаньняў на **-нер/-нэр**.

2.1.
**A.** інжын**е**р.
**B.** інжын**э**р.

2.2.
**A.** лайн**е**р.
**B.** лайн**э**р.

2.3.
**A.** ман**е**ра.
**B.** ман**э**ра.

2.4.
**A.** мільян**е**р.
**B.** мільян**э**р.

2.5.
**A.** піян**е**р.
**B.** піян**э**р.

**Пытаньне 3**. Ці дапусьціць захаваньне этымалягічнага ненаціскнога **о** перад зычнымі на канцы ўласных назоваў іншамоўнага паходжаньня?

**A.** Так, дапусьціць:
*Ліворно*, *Таронто* (гарады), *Вінчэ́нц**о***, *Франчэ́ск**о*** (муж. імёны).

**B.** Так, але абмежаваць толькі выпадкамі, калі **о–а** выконвае сэнсаадрозную функцыю:
*Вінчэ́нц**о*** (муж. імя) – *Вінчэ́нц**а*** (жан. імя), *Франчэ́ск**о*** (муж. імя) – *Франчэ́ск**а*** (жан. імя).
Але: *Ліворна*, *Таронта.*

**C.** Так, і нават не «дапусьціць», а зрабіць адзіным варыянтам:
*Вінчэ́нц**о***, *Франчэ́ск**о*** (муж. імёны), а таксама *Ліворно*, *Таронто.*

**D.** Не, не дапускаць:
*Вінчэ́нц**а*** (муж. і жан. імя), *Франчэ́ск**а*** (муж. і жан. імя), як і *Ліворна*, *Таронта.*

**Пытаньне 4.** Передача пачатковага **в** (**v**) у становішчы перад зычным на пачатку ўласных імёнаў іншамоўнага паходжаньня:

**A.** праз **в**: ***В**рангель*, ***В**рубель*, ***В**ладзікаўказ*, ***В**ладзівасток*, ***В**роцлаў.*

**B.** праз **в**, але назовы, што маюць беларускія адпаведнікі, — праз **у**: ***В**рангель*, ***В**рубель*, ***В**роцлаў*, АЛЕ: ***У**ладзікаўказ*, ***У**ладзівасток.*

**C.** праз **у**: ***У**рангель*, ***У**рубель*, ***У**ладзікаўказ*, ***У**ладзівасток*, ***У**роцлаў.*

**Пытаньне 5.** Форма слова *ко**н(ь)**скі*

***A.*** *ко**н**скі*
***B.*** *ко**нь**скі*
***C.*** *ко**н**скі* й *ко**нь**скі*

**Пытаньне 6.** Правапіс скаротаў ад словазлучэньняў *мэдычны інстытут*, *пэдагагічны інстытут*, *палітычная інфармацыя*:

***A.*** *мэд**і**нстытут*, *пэд**і**нстытут*, *паліт**і**нфармацыя.*

***B.*** *мэд**’і**нстытут*, *пэд**’і**нстытут*, *паліт**’і**нфармацыя.*

***C.*** *мэд**ы**нстытут*, *пэд**ы**нстытут*, *паліт**ы**нфармацыя.*

**Пытаньне 7.** Правапіс скаротаў ад словазлучэньня *Міністэства юстыцыі*:

***A.*** *Мін**ю**ст.*
***B.*** *Мін**’ю**ст.*
***C.*** *Мін**ью**ст.*

**Пытаньне 8.** Передача ангельскага **w** і папярэдніх гукаў у словах **swing**, **twid**, **twin**, **twist**:

***A.*** ***сў**інг*, ***тў**ід*, ***тў**ін*, ***тў**іст.*

***B.*** ***св**інг*, ***тв**ід*, ***тв**ін*, ***тв**іст.*

***C.*** ***сьв**інг*, ***цьв**ід*, ***цьв**ін*, ***цьв**іст.*

Для даведкі: рэфармаваны (савецкі) варыянт: *с**в**інг*, ***тв**ід*, ***цв**ін*, ***тв**іст.*

**Пытаньне 9.** Передача падваеньня зычных ва ўласных назовах:

9.1.
***A.*** *Мэ**кк**а.*
***B.*** *Мэ**к**а.*
Для даведкі: рэфармаваны (савецкі) варыянт: *Ме**кк**а.*

9.2.
***A.*** *О**тт**а.*
***B.*** *О**т**а.*
Для даведкі: рэфармаваны (савецкі) варыянт: *О**т**а.*

9.3.
***A.*** *мэ**цц**а* (іт. me**zz**o), *пі**цц**а* (іт. pi**zz**a).
***B.*** *мэ**ц**а*, *пі**ц**а.*
Для даведкі: рэфармаваны (савецкі) варыянт: *ме**цц**а*, *пі**цц**а.*

**Пытаньне 10.** Формы прыметнікаў на **-н(ь)ск-**:

***A.*** *студзе**нь**скі*, *траве**нь**скі*, *чэрве**нь**скі*, *ліпе**нь**скі*, *жніве**нь**скі*, *сьнежа**нь**скі*; *восе**нь**скі.*

**Працяг на старонцы 10.**

# Бандыты ў краіне фіёрдаў

*Я малюю ня тое,
што бачыў, але тое, што ўбачыў.*
Эдвард Мунк

**У савецкім мастацтвазнаўстве творчасьць нарвэскага мастака Мунка разглядалася выключна з эпітэтамі «хворы» й «паталягічны». Хоць, што цікава, пра яго пісалі заўсёды. Рэпрадукцыі ягоных твораў зьмяшчаліся ў падручніках. У адрозьненьне ад сотняў іншых творцаў, на чый даробак накладалася «табу». Таму мастацтва Мунка добра вядомае і ў Беларусі.**

У творах Мунка зьвяртаюць на сябе ўвагу найперш дысанантныя спалучэньні колераў і адмысловы вірападобны малюнак. Да таго ж яго лёгка можна пазнаць па змрочных сюжэтах: «Хворае дзіця», «Вампір», «Пакой чалавека пры сьмерці».

Яшчэ як Мунк быў зусім дзіцём, ад сухотаў памерла ягоная маці, затым сястра. Сам ён пакутаваў ад алькагалізму, а ў выніку — і ад цяжкай дэпрэсіі. Баяўся кантактаў з жанчынамі, што, дарэчы, яскрава відаць зь ягоных твораў. Але, незважаючы на ўсё гэта, а таксама на ягоную мізантропію й пасьлядоўнае ніцшэанства, Мунк дажыў да глыбокае старасьці й памёр выпадкова, ад запаленьня лёгкіх, калі яму было ўжо за 80. Пры тым не бракавала яму й вялікай прыжыцьцёвай славы. Яго называлі ня йнакш як піянерам экспрэсіянізму. Любы адукаваны скандынаў альбо немец ведалі яго як геніяльнага сучасьніка.



**Эдвард Мунк.**

У1893 г. Мунк напісаў свой самы славуты шэдэўр «Крык». На гэтае палатно спасылаліся, пра яго пісалі, кралі й вярталі. «Крык» натхніў стваральнікаў аднайменнага трылеру, у якім дзейнічае маньяк-забойца ў масцы. Пазьней мастак яшчэ тройчы вяртаўся да гэтага сюжэту. Такім чынам, маем чатыры вэрсіі «Крыку», адна зь якіх, разам з карцінаю «Мадонна», і была скрадзеная сёлета 22 жніўня з музэю мастака («Munch-Museum»), што ў Осла. У 1994 г. была выкрадзена першая вэрсія твору, што зьберагаецца ў Нацыянальнай галерэі Нарвэгіі. Тады выкрадальнікі запатрабавалі ад уладаў мільён даляраў за нацыянальную рэліквію. Але, паколькі ніхто не зьбіраўся весьці са зладзеямі перамовы, карціну ўрэшце знайшлі. Бо ані вывезьці яе з Нарвэгіі, ані прадаць было немагчыма.

Цяпер зьвяртаюць на сябе дзьве акалічнасьці. Найперш, наколькі бясьпечна пачуваюцца ў Нарвэгіі такія шэдэўры ды іх захавальнікі. Да карціны не было прымацавана аніякае сыгналізацыі. У музэі Мунка не было аховы. Пад руляю пісталета супрацоўніца музэю сама зьняла шэдэўры са сьценаў.

Па-другое — нахабнасьць нападнікаў. Зладзеі, якія крадуць творы мастацтва, зазвычай не паводзяць сябе як простыя бандыты-налётчыкі. Пагатоў калі карціны былі нагэтульки безабаронныя. Гэта азначае, што дзеялі неспрактыкаваныя ў такіх справах зладзеі. У сваю чаргу, гэта азначае, што яны ня мелі пэўнага замоўцы, які б «заказаў» Мунка. Бо той уяўны замоўца, які б дыспанаваў адпаведнымі апэтытамі, зьвярнуўся б да кваліфікаваных рабаўнікоў, якія ўсё зрабілі б «чыста». Таму, хутчэй за ўсё, карціны былі выкрадзены з мэтаю нейкага шантажу. На такі грубы й дзёрзкі напад, бадай, не наважыўся б хто з саміх нарвэгаў. Ня той мэнталітэт і ня тое выхаваньне, у якім асобе Мунка прысьвечана нямала месца. Хутчэй за ўсё, гэта справа рук якіх замежнікаў ці эмігрантаў. А сярод апошніх апошнім часам нямала й беларускіх уцекачоў.

Паколькі карціну ні вывезьці, ні прадаць немагчыма, то, напэўна, гэтая гучная справа будзе раскрыта ў найбліжэйшы час. Пагатоў што самі нападнікі й іхнае аўто былі сфатаграфаваныя выпадковымі нямецкімі турыстамі.

Для Скандынавіі пасьля забойстваў швэдзкіх палітыкаў гэта яшчэ адзін знак таго, што іхныя краіны ўжо перасталі быць самым бясьпечным месцам у Эўропе. І як ні адмяжоўвайся ад сьвету, сьвет усё адно пагрукаецца ў твае дзьверы. З усімі выдаткамі й выгадамі. Выгада гэтай гісторыі з Мункам палягае ў тым, што мільёны людзей на плянэце яшчэ раз зьвярнулі ўвагу на ягонае мастацтва й нарвэскую нацыянальную культуру.

**Сяргей Харэўскі**





**Скрадзеныя карціны. «Крык» (зьверху) і «Мадонна».**

## АНКЕТА

Працяг са старонкі 9.

Але: *Барань – баранскі*, *Блонь – блонскі*, *Івань – іванскі*, *Гарынь – гарынскі*, *Кобрынь – кобрынскі*, *Лань – ланскі*, *Любань – любанскі*, *Радунь – радунскі*, *Смаргонь – смаргонскі*; *Вільня – віленскі*, *Горадня – гарадзенскі*; *Астрахань – астраханскі*, *Познань – познанскі*; *Гішпанія – гішпанскі*, *Данія – данскі*, *Шампань – шампанскае*.

**B.** *студзеньскі*, *травеньскі*, *чэрвеньскі*, *ліпеньскі*, *жнівеньскі*, *сьнежаньскі*; *восеньскі*. А таксама: *Барань – бараньскі*, *Блонь – блоньскі* й *Блоньскі* (прозьвішча), *Івань – іваньскі*, *Гарынь – гарыньскі*, *Кобрынь – кобрыньскі*, *Лань – ланьскі*, *Любань – любаньскі*, *Радунь – радуньскі*, *Смаргонь – смаргоньскі*; *Вільня – віленьскі*, *Горадня – гарадзеньскі*; *Астрахань – астраханьскі*, *Познань – познаньскі*; *Гішпанія – гішпаньскі*, *Данія – даньскі*, *Шампань – шампаньскае*.

**C.** *студзеньскі*, *травеньскі*, *чэрвеньскі*, *ліпеньскі*, *жнівеньскі*, *сьнежаньскі*; *восеньскі*. А таксама: *бараньскі*, *Блоньскі* (прозьвішча), *іваньскі*, *гарыньскі*, *кобрыньскі*, *ланьскі*, *любаньскі*, *радуньскі*, *смаргоньскі*. А таксама: *астраханьскі*, *познаньскі*. Але: *віленскі*, *гарадзенскі*; *гішпанскі*, *данскі*, *шампанскае*.

**D.** *студзеньскі*, *травеньскі*, *чэрвеньскі*, *ліпеньскі*, *жнівеньскі*, *сьнежаньскі*; *восеньскі*. А таксама: *бараньскі*, *Блоньскі* (прозьвішча), *іваньскі*, *гарыньскі*, *кобрыньскі*, *ланьскі*, *любаньскі*, *радуньскі*, *смаргоньскі*. Але: *віленскі*, *гарадзенскі*; *астраханскі*, *познанскі*; *Гішпанія — гішпанскі*, *данскі*, *шампанскае*.

**Пытаньне 11.** Форма італійскіх уласных імёнаў Bertolucci, Nizza, Pavarotti.
**A.** *Бэрталюччы* (Bertolucci), *Ніцца* (Nizza), *Паварoцьці* (Pavarotti).
**B.** *Бэрталючы*, *Ніца*, *Паварoці*.

**Пытаньне 12.** Формы францускіх уласных назоваў: Balladure, Dubois, Dumas, du Pont, Tartufe, Tuilry.
**A.** *Балядзюр*, *Дзюбуа*, *Дзюма*, *дзю Пон*, *Тарцюф*, *Цюільры*.
**B.** *Балядур*, *Дубуа*, *Дума*, *ду Пон*, *Тартуф*, *Туільры*.

**Пытаньне 13.** Формы словаў *дзюза/дуза*, *дзюраль/дураль*, *дзюшэс/душэс*, *цюль/туль*.
**A.** *дзюза*, *дзюраль*, *дзюшэс*, *цюль*.
**B.** *дуза*, *дураль*, *душэс*, *туль*.

**Пытаньне 14.** Форма слова *мэтал(ь)*.
**A.** *мэтал*. **B.** *мэталь*.

**Пытаньне 15.** Форма слова *галакост/галякаўст*.
**A.** *галакост*. **C.** *галакост* і *галякаўст*.
**B.** *галякаўст*.

**Пытаньне 16.** Выбраць адзін з двух варыянтаў альфабэту.
Варыянт **A.**

БЕЛАРУСКІ АЛЬФАБЭТ

| Літара | Назоў літары | Літара | Назоў літары |
|---|---|---|---|
| **А а** | а | **П п** | пэ |
| **Б б** | бэ | **Р р** | эр |
| **В в** | вэ | **С с** | эс |
| **Г г** | гэ | **Т т** | тэ |
| **( Ґ ґ )*** | ґе | **У у** | у (складовае) |
| **Д д** | дэ | **Ў ў** | у нескладовае |
| **Е е** | е | **Ф ф** | эф |
| **Ё ё** | ё | **Х х** | ха |
| **Ж ж** | жэ | **Ц ц** | цэ |
| **З з** | зэ | **Ч ч** | чэ |
| **І і** | і (складовае) | **Ш ш** | ша |
| **Й й** | і нескладовае | **Ы ы** | ы |
| **К к** | ка | **Ь ь** | мяккі знак |
| **Л л** | эл | **Э э** | э |
| **М м** | эм | **Ю ю** | ю |
| **Н н** | эн | **Я я** | я |
| **О о** | о | | |

Варыянт **B.**

БЕЛАРУСКІ АЛЬФАБЭТ

| Літары | Назоў літараў | Літары | Назоў літараў |
|---|---|---|---|
| **А а** | а | **О о** | о |
| **Б б** | бэ | **П п** | пэ |
| **В в** | вэ | **Р р** | эр |
| **Г г** | гэ | **С с** | эс |
| **( Ґ ґ )*** | ґе | **Т т** | тэ |
| **Д д** | дэ | **У у** | у (складовае) |
| **(Дж дж)**** | (джэ) | **Ў ў** | у нескладовае |
| **(Дз дз)**** | (дзэ) | **Ф ф** | эф |
| **Е е** | е | **Х х** | ха |
| **Ё ё** | ё | **Ц ц** | цэ |
| **Ж ж** | жэ | **Ч ч** | чэ |
| **З з** | зэ | **Ш ш** | ша |
| **І і** | і (складовае) | **Ы ы** | ы |
| **Й й** | і нескладовае | **Ь ь** | мяккі знак |
| **К к** | ка | **Э э** | э |
| **Л л** | эл | **Ю ю** | ю |
| **М м** | эм | **Я я** | я |
| **Н н** | эн | | |

* Абазначае выбухны гук, выкарыстоўваецца факультатыўна; пры разьмеркаваньні словаў у альфабэтным парадку літара **ґ** роўная **г.**

** Пры разьмеркаваньні па альфабэце дыграфы **дж** і **дз** падпарадкоўваюцца агульнаму парадку.

# Пра рэальны сьвет і АМАП

**Не падманвайцеся наконт амапаўцаў, шаноўная Настасься Азарка.**

Зь цікавасьцю прачытаў нататкі Настасьсі Азаркі «Пяць дзён у рэальным сьвеце». Ня можа ня ўражваць вера ў слушнасьць сваіх ідэй. Але складваецца ўражаньне, што ўся падзея ўспрымаецца спн.Азаркай як прыгода, хоць непрыемная, але бяскрыўдная. Гэта асаблівасьць часта сустракалася ў шэрагах колішніх нефармалаў і датрывала да часоў сёньняшняга рэжыму.

Ці не адсюль дзіўная выснова, што аддания памагатыя рэжыму (КДБ, АМАП, невядомыя «людзі ў цывільным») — гэта *нашы людзі*? На жаль, прыхільнікі такой думкі ніколі не вызначаюць (хоць бы дзеля параўнаньня), хто ж тады *нянашы*. Бо калі мы ўсе «нашы», адкуль барацьба?

Людзі гэтыя *нянашы*, бо дзейнасьць іх, агрэсіўная і па большасьці супярэчная Канстытуцыі, скіравана менавіта супраць *нас*, а заадно і супраць усяго грамадзтва.

АМАП і КДБ створаны дзеля задушэньня любога іншадумства, іншым не праславіліся. Што да вызначэньня «наскасьці» гэтых людзей, то яна акрэсьліваецца толькі адзіным для абодвух бакоў грамадзянствам. Але *мы* і *яны* настолькі па-рознаму бачым, якой павінна быць дзяржава, што *яны* кідаюцца на *нас* з дубінкамі як з адзіным аргумэнтам. Дапамагаюць ім *нашы* (?) судзейскія «матроны», якія з «мацярынскай суворасьцю» прызначаюць максымальныя пакараньні і астранамічныя штрафы.

На службу гэтай справе з уласнага выбару, сьвядома, добраахвотна пайшлі «прыгожанькія Сярожкі». Калі з прызывам у войска ўзьнікаюць пэўныя клопаты, то недахопу ў «прыгожанькіх Сярожках» няма. Яны не мабілізаваныя, а нанятыя, як, прыкладам, рабочыя і служачыя, таму называць іх жаўнерамі нельга. Ня той маюць статус і абавязкі, каб залічаць іх да «дзяцей». Гэта небясьпечная памылка. Старых і маладых гэтыя «дзеці» зьневажаюць, зьбіваюць і кідаюць за краты зусім не празь дзіцячую легкадумнасьць. Калі і здараюцца зь іх боку людзкія паводзіны, то гэтае выключэньне называецца ў стасунках сам-насам.

Даруйце, спн.Настасься, але ваша пагадненьне з ахоўнікам — прыклад той самай інфантыльнасьці. Ніхто ні да кога ня мае прэтэнзій?! Бы што, злачынца? Зьдзейсьнілі антыграмадзкі ўчынак, а ён абараніў грамадзтва ад вашых злых намераў? У гэты дзень грамадзтва заплаціла яму за антыграмадзкую працу. Яшчэ ў XIX ст. славуты францускі пісьменьнік зьдзекаваўся з «суладзьдзя» ката і ахвяры на эшафоце.

Справа ня ў тым, каб шырыць біялягічную нянавісьць да паслугачоў рэжыму, а ў тым, каб аддзяляць асабістыя, выпадковыя па сутнасьці дачыненьні і ўражаньні ад палітычных высноў і зьвязанай зь імі стратэгіі грамадзкай дзейнасьці. Злачыннасьць дыктатарскіх рэжымаў звычайна пэрсаніфікуецца ў першай асобе, але не ўвасабляецца ў ёй адной і не адной ёю забясьпечваецца.

Тыя «мілыя дзеці» могуць служыць толькі адпаведна свайму сьветапогляду і засвоеным мэтадам: біць! А з часам сёньняшнія «дзеці АМАПу» пярэйдуць у шэрагі азьвярэлых адстаўнікоў, падобных да тых, якія не пускалі дэмакратычных вэтэранаў ускласьці кветкі да помніка Перамогі і якія носяцца з партрэтамі Сталіна. «Дэмакратычная» Расея яскраз стварае «кіроўную (кім?) дэмакратыю» з дапамогай падобных *іхніх*. Вынік аналягічны беларускаму.

**Аркадзь Жукоўскі, Горадня**

## ХРОНІКА

15 жніўня з-пад адміністрацыйнага арышту зьнік актывіст АГП **Аляксей Прыходзька**: з прыёмніка-разьмеркавальніка яго з падазрэньнем на апэндыцыт даставілі ў больніцу, адкуль ён уцёк. Актывіст ПБНФ, выпускнік філфаку Мазырскага пэдунівэрсытэту **Дзяніс Рабянок** падаў у пракуратуру скаргу на дыскрымінацыю: яго адмаўляюцца прымаць на працу па разьмеркаваньні, бо ён займаецца «антыдзяржаўнай палітычнай дзейнасьцю». Актывіст АГП **Леанід Судаленка**, які балятуецца ў ПП НС, 18 жніўня зьвярнуўся ў ЦВК са скаргай наконт ціску на сяброў ягонай ініцыятыўнай групы **Н.Цалуйку** і **М.Хаменку**. 18 жніўня сьледчы КДБ Аляксандар Залеўскі адхіліў хадайніцтва **БХК** пра спыненьне крымінальнай справы па факце ўхіленьня ад падаткаў, па якой Гаспадарчы суд Менску прыняў апраўдальны прысуд. Менскі гарсуд 19 жніўня адмовіўся разглядаць скаргу актывіста АГП **Уладзімера Раманоўскага** наконт працэсу фармаваньня акруговых выбарчых камісій, бо гэта «па-за межамі яго кампэтэнцыі». 19 жніўня ў Гомелі спачатку не змаглі пабрацца шлюбам па-беларуску актывісты ліквідаванага цэнтру «Гарт» **Юнэля Сальнікава** й **Віталь Крупенька**, а пасьля скаргі дабіліся свайго. Выход недзяржаўнай **«Новой газеты Сморгони»** 19 жніўня быў спынены на 3 месяцы загадам міністра інфармацыі Ўладзімера Русакевіча: выдаўцу **Рамуальду Ўлану** закідаюць, што ён ня можа выдаваць газэту, бо прадпрымальнік не зьяўляецца юрыдычнай асобай. **Аляксандар Бухвостаў**, лідэр ліквідаванай Беларускай партыі працы, 19 жніўня накіраваў наглядную скаргу старшыню Вярхоўнага суду Беларусі Валянціну Сукалу з нагоды ліквідацыі партыі. ЦВК 20 жніўня пацьвердзіў нерэгістрацыю ініцыятыўных груп **Зінаіды Бандарэнкі** (АГП), **Валер'я Шчукіна**. Сьледчы АБЭЗ Аляксандар Лянкевіч 20 жніўня наведаў бяз ордэру офіс **АГП**, каб знайсьці антыканстытуцыйную літаратуру. У Гомелі 20 жніўня суд ліквідаваў **ГА «Ініцыятыва»**. **Вадзім Болбас** быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі 20 жніўня на сустрэчы **Сяргея Антончыка** з палітычнымі й грамадзкімі актывістамі Сьветлагорску падчас праверкі дакумэнтаў: у яго не было з сабой пашпарта. 21 жніўня міліцыянты спынілі аўтамабіль, у якім ехаў **Андрэй Клімаў** з жонкай **Тацянай**, і канфіскавалі каля 200 кніг «Шпацыры з вупаром» і «Відавочныя ісьціны». У ноч на 23 жніўня ў Барысаве быў абкрадзены перадвыбарны штаб незалежнага кандыдата **Зьмітра Бародкі**. Юрыст **Аляксандар Шавель** зь Бярозы 23 жніўня быў аштрафаваны на 2 б.в.: падчас адміністрацыйнага працэсу 18 жніўня ён выказаў крытыку на адрас пракурора й быў абвінавачаны ў непавазе да суду. 23 жніўня да актывіста «Маладога фронту» **Аляксея Шэіна** (Ракаў) зьявіўся ўчастковы, які абвясьціў, што Шэін у вышуку, бо не сплаціў 1 млн 125 тыс. руб. штрафу. 23 жніўня пачаўся судовы працэс: **ПБНФ** патрабуе адмяніць папярэджаньне, вынесенае Мінюстам за ўдзел у акцыі «Ланцуг неабыякавых чытачоў». 23 жніўня прафсаюз **РЭПАМ** падаў скаргу на рашэньне Мінюсту аб адмене рэгістрацыі арганізацыі. На 26 жніўня ў Горадні прызначаны пачатак суду над **Валер'ем Леванеўскім**.

**АШ**

# Ліцэй набраў першакурсьнікаў

Працяг са старонкі 1.

Сёлетнія выпускнікі Ліцэю падтрымліваюць кантакты з навучальнай установай, прыходзяць на штотыднёвыя ліцэйскія сходы ў чацьвяргі. Усе яны цяпер студэнты — як беларускіх ВНУ, так і ўстаноў Чэхіі, Літвы, Польшчы, Нямеччыны. Толькі адна дзяўчына, якая падавала дакумэнты ў Акадэмію мастацтваў, не прайшла па конкурсе.

Паехаць жа за мяжу па ліцэйскай праграме яна ня здолела, бо сваім часам вырашыла не здаваць ліцэйскіх іспытаў.

Ліцэйскія сходы каля старога будынку аднавіліся з пачатку жніўня. Прыходзяць настаўнікі (аніхто зь іх не сышоў), бацькі, вучні. Знаёміцца з навенькімі, распавядаюць, як хто бавіў лета: у ліпені блізу 30 ліцэістаў былі ў летніку на возеры Сьвір.

19 жніўня ўпершыню на ліцэйскі сход завіталі міліцыянты. Некаторыя былі ня ў форме, але ўсё ж знаёмыя твары — усё мінулае лета прабавілі побач. Не абышлося і бяз здымак на відэакамэру. З машыны, дзе сядзелі міліцыянты, зьявіліся й нейкія тры амбалы. Пасядзелі на лавачцы, паназіралі за ліцэйскім сходам, але бліжэй не падыходзілі. Тых, хто ўжо стаяў у пікетах, міліцыя не спалохала.

Навічкі не адчуваюць сябе разгубленымі ў новай абстаноўцы, з малазнаёмымі людзьмі. Для ліцэістаў сёньня ўсё проста: усе, хто з намі, — свае. Таму сыходзяцца вельмі хутка. Марыя паступіла на 3-і курс, ёй давядзецца штодня езьдзіць у Менск на электрычцы з раёну. Бацькоў выбар дачкі не палохае й не спыняе. «Дзеці ў нас самастойныя. Сын — актывіст АГП. Мы ўсьведамляем, на што ідзём», — кажа маці.

Антось паступіў на 4-ы курс. Для Ліцэю такія навучэнцы — вынятак, бо цяжка вучыць апошні год чалавека, які дагэтуль навучаўся па зусім іншых праграмах. Раней вучыўся ў гімназіі на Паўднёвым Захадзе. Гімназія была сьпярша беларускай, але гадоў шэсьць таму стала расейскай. Кажа, што пра Ліцэй ведаў ад сяброў, якія яго скончылі й якія навучаюцца сёньня. Вырашыў пайсьці ў Ліцэй, бо яму спадабалася атмасфэра, якая тут пануе. Бацькі сьпярша былі супраць, але хутка далі сябе ўгаварыць.

1 верасьня а 10-й гадзіне ліцэісты традыцыйна прыйдуць на Дзень ведаў да свайго будынку на вул.Кірава, 21.

**Аркадзь Шанскі**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## «Хочам вучыцца па-беларуску»

А ў 16.00 1 верасьня сябры незарэгістраваных ініцыятываў Задзіночаньне беларускіх студэнтаў, Моладзевая ініцыятыва «Вока» і Моладзь Беларускага ліцэю заклікалі дзяўчат і юнакоў сабрацца на Кастрычніцкім пляцы на масавую акцыю ў падтрымку беларускае мовы пад лёзунгам «Хочам вучыцца па-беларуску». Такія самыя акцыі рыхтуюцца ў Берасьці, Горадні, Віцебску й Слоніме.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

АБВЕСТКА

## Працяг традыцыяў Беларускага ліцэю!

**Выкладнікі, што працавалі ў Беларускім ліцэі, падрыхтуюць Вашых дзяцей да паступленьня ў найлепшыя ВНУ Беларусі й замежжа.**

Вучням школ, якія закончылі сёлета **7 класаў,** прапануюцца бясплатныя кансультацыі ды платныя курсы па ўсіх дысцыплінах сярэдняй школы (праграмы ліцэю). Курсы, якія ладзіць індывідуальны прадпрымальнік Грыневіч Ю.М. (пасьведчаньне №190553728, выдадзенае Менгарвыканкамам 15.07. 2004 г.), разьлічаны на чатыры гады напружанай працы!

Ахвотных *атрымаць эўрапейскую адукацыю па-беларуску* запрашаем тэлефанаваць: 8-029-629-59-03, 8-029-639-27-15, 8-029-633-48-59.

## Увазе прыватных распаўсюднікаў

«Нашу Ніву» для распаўсюду па цане 550 рублёў можна купіць у краме УП «Марат». Менск, вуліца Інтэрнацыянальная, 11А, 2-гі паверх. Ад 9 да 17, перапынак ад 13 да 14, тэл. 226-87-99.

# Будуць «Tanki»

**Галоўнай падзеяй музычнай восені стане выхад доўгачаканага альбому «Нэйра Дзюбелю» «Tanki». Усяго ж у верасьні—лістападзе айчынныя выканаўцы сучаснай музыкі маюць выпусьціць больш за 20 дыскаў.**



**Калі Ірына Дарафеева дае аўтографы, не вытрымлівае нават ахова.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

«Tanki» ў дыскаграфіі першых айчынных панкаў будуць 13-м па ліку, але першым беларускамоўным альбомам. Некаторыя песьні зь яго («Сёма», «Пацалунак», «Таварыш Чэ») прыхільнікі групы чулі на сольных канцэртах групы ды на «Генэралах айчыннага року». Галоўнае адрозьненьне «Tank'аў» ад папярэдніх альбомаў ня ў мове: альбом абяцае быць больш разнастайным па музыцы. У гукавы арнамэнт, акрамя традыцыйнага складу інструмэнтаў, уплецена дуда, дый склад групы абнавіўся, заменены гітарыст і басіст. Але ж пазнавальны прыхардаваны панк-рок застанецца. Канцэпт, вокладка і нават лягатып для фірмовых саколак ужо прыдуманы. Матэрыял — у працэсе падрыхтоўкі. Кулінковіч піша песьні несупынна (нядаўна зьявілася рэгі пад назвай «Не хапае у.а.»). Лідэр групы лічыць, што «Tanki» будуць найлепшым альбомам групы. Рэліз прызначаны на канец кастрычніка.

## Міні-Крамбамбуля

У кастрычніку выйдзе міні-альбом ад «Крамбамбулі» зь песьнямі, напісанымі для будучых дыскаў — «Сьвяточнага» і «Інтэрнацыянальнага». Амаль усе яны гучалі на канцэртах — «23 феўраля», «Дарагія жэншчыны», «Турысты», а таксама «Куранткі» ў выкананьні Гюнэш Абасавай. Адзін зь сюрпрызаў сынглу — «Суседзі», якую Вольскі засьпявае дуэтам з Кузьмом з украінскай групы «Скрябін». Прычым украінская рок-зорка будзе сьпяваць па-беларуску, а Лявон — па-ўкраінску.

З прэзэнтацыяй дыску будзе складаней: плянам «Крамбамбулі» праехацца па гарадах і мястэчках можа перашкодзіць т.зв. «цэнзура на канцэрты», якая ўводзіцца зь верасьня і паводле якой дазвол на выступ мусіць даць мясцовая ўлада.

## Бясконцы «Postcriptum»

Сярод астатніх навінак варта вылучыць дыск «Вандроўка» менскай групы «Postcriptum». Першы альбом групы выйшаў яшчэ ў 1998 г. — тады яшчэ ў «P.S.» сьпявалі тры вакалісткі. У 2001 г. група выдала сынгл «Шчодры вечар» з трыма песьнямі — і прыціхла. Дзьве з трох вакалістак сышлі па справах прыватных, ідэоляг групы гітарыст Вадзім Марголін зьехаў за мяжу… Пазасталыя ж і стварылі альбом, у які ўвойдуць 12 трэкаў: як вядомыя па выступах гурту песьні («Шчэдрык», «Званы»), так і зусім новыя («Мела мамка тры сыночкі», «Ізноў»).

## Пульс Дарафеевай

Свой трэці альбом пад назвай «Пульс маіх хвілін», у які ўвайшлі 14 песень на беларускай мове, запісала Ірына Дарафеева. У дыскарнях ён зьявіцца ў верасьні.

Ня менш чаканым будзе альбом ад групы «Siver», якая запісала музычную частку рок-опэры «Сьцяг брыгады» паводле Аркадзя Куляшова, празаічную ж — ад імя Алеся Рыбкі — агучыць Аляксандар Кулінковіч.

«Partyzone» урэшце скарыстаў свой прыз за выступ на «Басовішчы-2002» і запісаў альбом на польскай студыі. Плытка мае назву «Сьмерці няма».

Абяцаюць скончыць працу над сваім альбомам гомельскія мэталеры з «ТТ-34», што засьвяціліся ў саўндтрэку да расейскага блякбастэру «Начная варта».

## «БМА» да 140-годзьдзя «Аліварыі»

Пры канцы жніўня ў продажы зьявіцца складанка «Наша музыка. Частка другая», што рэпрэзэнтуе айчынных выканаўцаў радыёфарматнага кшталту. Ухіл робіцца на попс-рок — «J-Морс», «Стокс», «Мэдуза», «Таксі», «Stillout» ды да іх падобныя.

Сумесная складанка «БМА-груп» і інтэрнэт-парталу «Тузін гітоў» зьявіцца з двайной нагоды — у кастрычніку праекту «Вольныя танцы» спаўняецца пяць год, «Тузіну» — год. У дыск увойдуць апошнія хіты на беларускай мове.

«БМА-груп» таксама нястомная ў выданьні тэматычных зборнікаў: «Hard Life — Heavy Music» (частка 3-я), «Гардкорманія: чаду!» (частка 2-я) і «Чыста панк!» (частка 1-я), а таксама «Піўны альбом», прымеркаваны да 140-годзьдзя бровару «Аліварыя», з гімнамі бурштынаваму напою. Для апошняга альбому свае песьні даюць «Крама», Тодар, «Крамбамбуля», а «Лепрыконсы» запісалі кавэр на твор «Піце піва, мужыкі» (музыка Міхалая Сацуры, верш Валянціны Аколавай) з рэпэртуару ВІА «Сябры».

Творчая суполка «Дзеці Сонца» рыхтуе сваю складанку. Канцэпцыя — пазытыўная і сьмешная музыка. Кампілятары вітаюць музыку рознную — ад цыганскіх напеваў да хіп-хопу, але дэкляруюць, што расейскаму року, хардн-хэві ды іншай «цямрэчы» там ня будзе месца. Хедлайнэры дыску — «Ляпіс Трубяцкой» і «Саша і Сірожа», а таксама замежныя госьці — Карл Хламкін, «Забароненыя бубначы», «Cabernet Deneuve».

## Восень перавыданьняў

Гэтая восень адзначыцца і вялікай колькасьцю перавыданьняў. Бокс-сэт «Уліcу» зь легендарнымі «Чужаніцай», «Краінай доўгай белай хмары» і «Танцамі на даху» прымеркаваны да 15-годзьдзя «вялікага вандроўніка». «Жорсткае самазабойства ўнівэрсальнай нарэзкай Бэрнэра» ды «Паляўнічы і сайгак» «Дзюбеляў» выйдуць упершыню на дысках ды яшчэ з мультытрэкамі. «Весначуха» ад «Юр'і» вытрымае другі наклад, бо першы стаўся ўжо рарытэтам. «Крама» перазапіша старыя хіты і выдасьць пад назвай «The Best».

Яшчэ восеньню чакайце вялікія канцэрты «Нэйра Дзюбелю», «J-Морсу», «Крамбамбулі» і прэзэнтацыю складанкі «Наша музыка», 15-ты фэст «Рок-кола» і сьвяточны канцэрт, прымеркаваны да гадавіны «Тузіну гітоў».

**Сяргей Будкін**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Басовішча-2004. Гітарыстка гурту «Таксі» атрымала гітару-падарунак з рук Лявона Тарасэвіча.**

---

ДІСКАГРАФІЯ

## Мала агню



«Indiga», 2004, «БМА-group»

Ляўрэат леташняга «Басовішча» прапануе пражыць тыдзень за 28 хвілін. Паводле канцэпцыі альбому, кожны трэк сымбалізуе пэўны дзень тыдня. «Дні» распальваюць адразу «Тры сонцы», аўторак напоўнены каханьнем — «Вер мне», у сераду стомленая гераіня зьбягае ў цемру і зьдзяйсьняе «Начны шпацыр»… Стомленасьць зьнікае толькі ў суботу, калі распачынаюцца «Танцы на краі». Яшчэ адзін намёк на пераемнасьць традыцый — «Цэпэліны» з рэпэртуару «Новага неба». У бэк-вакале гэтай кампазыцыі можна пачуць сёлетніх пераможцаў — гурт «Тарпач».

Альбом быў запісаны ў студыі Беластоцкага радыё — у адрозьненьне ад некаторых іншых мінулагодніх ляўрэатаў, якія аналягічным падарункам так і не скарысталіся. Пісаць тэксты вакалістцы Русі дапамог Андрэй Хадановіч.

Загана альбому — аднастайнасьць песень і адсутнасьць маторнага гіта. «Дні» — прадукт у найвышэйшай ступені некамэрцыйны. Ад гэтага яго вартасьць для сапраўдных знаўцаў толькі павышаецца. Адзінае, што «Дні» пралятаюць хутка: 8 песень — 28 хвілін. Хоць бы гэтак жа хутка ня згасла зорка «Indiga».

**Сяргей Будкін**

## Atlantica




Дуэт «Atlantica». (р) «Вестрекордс-плюс», 2004.

Слухаю ўважліва гэтую музыку і праз увесь час задаюся пытаньнем: а чаму, уласна, яна не нарадзілася гадкоў з 15 таму? Тады такая музыка была модная і гучала вельмі шырока, але на землях блакітнавокай чамусьці ўсё не была здольная запладзіцца. Ну нішто сабе цяжарнасьць — 15 гадоў вытрымкі!

Так, клясна ўсё! Мэлёдыі, увасабленьне, выкананьне — няма прэтэнзій! Моцна зроблена. Нездарма ж, слухаючы гэтыя песьні ў эфіры, слухачы, якім адукаваныя ды-джэі ня лічаць патрэбным называць выканаўцаў, прымаюць гэтую прадукцыю за чыстую заходнюю манэту. Я, дарэчы, таксама «купіўся» б. Магчыма, і самі адукаваныя ды-джэі лічаць тое за імпартны прадукт. А калі даведваюцца, хто гэта і што, разьліваюцца патрыятычнымі салаўямі: вось, маўляў, і нашы могуць ня горш!

І што з таго, што могуць? Хіба ж гэта адкрыцьцё?! Хіба раней не было нікога, хто мог «ня горш»? Былі і ёсьць, толькі іх не заўважаюць аж да тае пары, пакуль яны ня зробяць нешта такое фірмовае, што ад уласна «фірмы» не адрозьніць. І нічога добрага ў гэтым няма, таму што куды складаней стварыць нешта непадобнае на «фірму», арыгінальнае і зьмястоўнае. Але такіх арыгіналаў у нас чамусьці за ўсё проста бачыць і чуць ня хочуць. Нам «фірму» падавай, нас шаблёнам накармі, нам стандарт дай смакам як чупа-чупс! І каб камар хваста не падтачыў.

Вы бачылі ў камара хвост? Вось і я пра тое: ня бачаць, што ёсьць, і раскручваюць тое, што «ня горш». А яно, зь іншага боку, насамрэч «ня лепш», нават калі гэтыя песьні трапяць у брытанскі хіт-парад. Я буду толькі шчыра рады за выканаўцаў, ад якіх усё ж хацелася б у будучыні пачуць нешта сваё.

А пакуль такое адчуваньне, што асобным альбомам былі выдадзены трэкі, якія чамусьці ня трапілі ў трыб'ют «Depeche Mode»…

**Атлянтычны СЛУХАЧ**

# Пэн і Шагал

## або Як стаць мастаком

**Мастацкі музэй да 12 верасьня** запрашае наведаць выставу прац Юдаля Пэна.

Уладзімер Ракіцкі

З пастановы Другога зьезду Саветаў Віцебшчыны ад 28 сакавіка 1927 г.:

«Мастак Пэн — гэта мастак старога габрэйскага гета, старое габрэйскае вуліцы, вечне забітае, цёмнае, вечне галоднае, заскарузлае, каторая корміцца паветрам і рэшткамі сярэднявечча.

Мастак Пэн — гэта пясьняр старога, ужо адміраючага габрэйскага побыту, гэта мастак-гісторык, этнограф, аргіёлаг…

Непараўнальна далёкія дзесяткі ягоных твораў ад Кастрычніка, ад апошніх дзесяці год. Непараўнальна далёкія яны ад хаты селяніна-беларуса.

Але гэта — кавалачак нашае культуры, няхай і стары, гэта цаглінка вялізарнае культурнае пабудовы, каторую закладаюць калектыўнымі высілкамі ўсё насельніцтва Беларусі: і беларусы, і габрэі, і палякі, і расейцы, — а таму яны нам дарагія, а таму яны дарагія рабочым і сялянам, дарагія гаспадару Віцебшчыны — 2-му зьезду Саветаў».

На гэтым зьезьдзе Юдалю Пэну было прысвоена званьне заслужанага габрэйскага мастака Віцебшчыны і вызначана пэнсія.

Як казаў мой дзядзька, «што будзе, то будзе, нешта ды будзе…»

З успамінаў Юдаля Пэна:

«У хедэры я зь вялікай прагаю схапіўся за маляваньне, бо на мае малюнкі знайшліся пакупнікі. Я маляваў цароў, казакаў на конях, займаўся і разьбярствам для вітражоў сынагогі. Плацілі мне за малюнкі гузікамі, таму што ніхто з хлопчыкаў зедэру грошай ня меў, а калі хто й меў, то знаходзіў штонебудзь больш важнае для іх траты. Гузікі я прадаваў і браў капейку за шэсьць штук, іншы раз даражэй. Хутка знайшоўся хлопчык з Коўна, ён гасьцяваў тут у дзядулі. Ен краў грошы і купляў у мяне партрэты, даючы ўжо трычатыры капейкі за штуку. Я ажыў, маючы магчымасьць купіць паперу і алавікі».

З успамінаў Марка Шагала:

Аднаго разу адзін са шкаляроў паказаў свой малюнак.

«Я запытаўся ў яго, як ён здолеў такое зрабіць, дзе ён гэтаму навучыўся. І ён мне прызнаўся, што проста-напроста перамаляваў яго. Пасьля пачутага я выправіўся ў бібліятэку і ўзяўся змалёўваць партрэт кампазытара Рубінштэйна… Я перамалёўваў абсалютна ўсе карцінкі, каторыя траплялісі мне на вока. Аданаго разу да мяне зайшоў мой прыяцель і сказаў: «Дык ты ж сапраўдны мастак!» Слова «мастак» глыбока запала мне ў душу».

Зноў Юдаль Пэн:

«Маляваў я свае партрэты толькі ў профіль, таму што анфас яшчэ не ўмеў. Губы і шчокі рабіў чырвонымі, вочы блакітнымі. Тлумачылася гэта тым, што я меў толькі адзін алавік, які быў з аднаго боку чырвоны, а з другога сіні. А малявац у профіль я пачаў вось чаму: у маёй маці ў буфэце я знайшоў пусты пачак з-пад цыкорыі. Як мне ўспамінаецца, на тым пачку ў мэдальёне быў намаляваны профіль імпэратара Франца-Ёсіфа. І я пачаў змалёўваць гэты партрэт. Але ж хутка, ужо ня памятаю з якой нагоды, я намаляваў і анфас. Ад свае работы я быў у такім захапленьні, што бегаў як звар'яцелы. Я ўсім паказваў намаляваны партрэт і адчуваў, быццам лётаю ў паветры, на галаву вышэй за ўсіх астатніх хлопчыкаў».

Марк Шагал:

«Скруціўшы мае абшарпаныя малюнкі, дрыжачы і хвалюючыся, я іду з мамай у майстэрню Пэна. Падымаючыся па прыступках, я п'янею ад пахаў палатна і фарбаў. Партрэты з усіх бакоў: жонка губэрнатара, сам губэрнатар. Пан і паненка Л., барон і баранэса К. і іншыя. Майстэрня забіта карцінамі ад падлогі да столі. На падлогу звалены ў кучы ролькі паперы. Вольная толькі столь. І там, і тут — паўсюль тырчаць грэцкія гіпсавыя галовы, рукі, ногі, арнамэнты, усялякія рэчы. Усё пакрыта пылам.

Мэтра няма дома. Не буду гаварыць аб пачуцьцях і выразе твару маёй маці, якая апынулася ў майстэрні мастака ўпершыню. Яна глядзела на карціны ва ўсе вочы. І раптам, абярнуўшыся да мяне, амаль умольваючы, але цьвёрда сказала: «Сыне мой, ты бачыш, што ніколі ня зможаш так зрабіць. Пайшлі дахаты». — Пачакай, мама!»



**Юдаль Пэн. Аўтапартрэт. 1922 г.**

Марк Шагал: Калі я і зайздрошчу каму, калі і тужу аб чым, дык гэта ад таго, што Пэн жыве ў Віцебску, а я — заўсёды, заўсёды ў Парыжы...

Марк Шагал правучыўся ў Юдаля Пэна ўсяго два месяцы!

«Ці чулі вы калі-небудзь пра Пэна, майго першага настаўніка, мастака, працаўніка, што заўсёды, заўсёды жыве на вуліцы Гогаля?

Я жыву вось ужо хутка сорак гадоў на зямлі і ні ў аднаго мастака ня бачыў я такой атмасфэры мастацтва. Яго атэльe поўнае карцін — ад падлогі да столі. На падлозе ляжаць горы паперы і палотнаў, толькі на столі поўная воля і павуцíньне. Людзі не выкарыстоўваюць столі — таму я і раскідаў па ёй фігуры са сваіх карцін. Няхай яны сабе там сядзяць.

Апісаць палотны Пэна я не магу. У дзяцінстве я іх слухаў, нюхаў, дакранаўся рукамі, і, хаця мае мары адносілі мяне ў нейкія далёкія, няясныя далі, мне назаўсёды запомніўся яго бедны драўляны парог.

Калі я і зайздрошчу каму, калі і тужу аб чым, дык гэта ад таго, што Пэн жыве ў Віцебску, а я — заўсёды, заўсёды ў Парыжы…»

Зь ліста Юдэля Пэна да сваёй вучаніцы:

«Вось ужо хутка будзе 35 гадоў, як я жыву ў Віцебску і даў гораду нямала мастакоў, пра каторых ведае ўвесь сьвет, — ад Пескавацік да Яновіч і зноў да Елагі. І вось гэты дзяяч, які працаваў 50 гадоў не пакладаючы рук, жыве адзін-адзінюткі, сам гатуе сабе абед і сам яго зьядае, без чыёй-небудзь дапамогі, таму што на дваіх — мала.

Вось мой былы вучань Марк Шагал атрымаў у Парыжы «Ордэн Ганаровага легіёну» і хоча са мною памяняцца, узяць Віцебск і аддаць Парыж. І што вы думаеце? Можа, варта памяняцца зь ім?

Толкам я ні ў чым тут не разьбіраюся і, як жыд старой выкрайкі, проста баюся сунуцца ў справу, якая мне здаецца няпэўнай. Жыў сабе, працаваў і служыў год з шэсьць ці болей пры Савецкай уладзе да шагалаўшчыны і пасьля, і цяпер. Ну і што? Ужо ж не задарма служыў, бо цяпер маю 7 руб. 23 кап. у месяц. Гэта 72 грыўны і яшчэ тры капейкі на запалкі. Выходзіць, што старасьць забясьпечана, і цяпер ламаю галаву, куды і што з гэтай пэнсіяй рабіць? Можа, жаніцца, а ўжо жонка дадумаецца, як зь імі быць».

Юдаль Пэн нарадзіўся ў невялічкай хатцы па вуліцы Шалтупка ў Рывы-Цыпы і Моўшэ Пэна. І быў ён дзясятым па ліку, здаецца, як Юзік Цудоўны.

Марк Шагал гэтаксама нарадзіўся ў маленькай хатцы. «Мне гэтая халупа нагадвала шышку на галаве зялёнага равіна з маёй карціны ці бульбіну, што ўпала ў бочку зь селядцамі і раскісла ад расолу. Гледзячы на яе з вышыні новае «велічы», я моршчыўся і думаў: «Як жа ж гэта я тут ухітрыўся нарадзіцца?» Марк быў першым у Фейгі-Іды і Захара Шагала, як Рувім. Потым была Ганна, Давід, Зіна, Лея, Маруся, Роза, Марыя, Рэвека…

Такім чынам, калі ты хочаш стаць мастаком, неабходна:

Па-першае, нарадзіцца ў бедным беларускім мястэчку, у беднай мнагадзетнай сям'і дзясятым, а лепш першым.

Па-другое, ня трэба баяцца і саромецца маляваць усё, што толькі трапляе на вока. І добра, калі на твае малюнкі знойдзецца пакупнік, няхай нават за гузікі.

І па-трэцяе, калі ты на самай справе бярэшся за маляваньне, то знайдзі сабе добрага настаўніка. Слухай яго карціны, нюхай іх, дакранайся да іх рукамі, і хто ведае, можа, і знойдзеш яшчэ сабе пустое месца на столі.

Так, ледзь не забыўся! Трэба яшчэ, ну хаця б крышачку, быць жыдам. Гаворка не ідзе пра жыда старое выкрайкі, не, але хаця б на развод штосьці павінна быць, бо ніколі так не было, каб нічога не было, як казаў мой дзядзька.

**М**



## • НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ •

### Замкі аднаўляюцца

Да верасьня мае скончыцца аднаўленьне згарэлай вежы Нясьвіскага замку. На версе вежы будзе пакрыты сусальным золатам шар і флюгер з выявай Радзівілаўскага гербу. Рэстаўратары замку ўжо аднавілі ўязны мост, перакінуты цераз роў. Цалкам рэстаўрацыя замку мае скончыцца ў 2006 г. На той самы год прызначана адкрыцьцё першай часткі Мірскага замку: адкрыюцца археалягічная і зброевая кампазыцыі, фрагмэнты інтэр'ераў жылых памяшканьняў, пад'ёмны мост.

### Немэн і Краўчык

У польскім Сопаце прайшоў 41-ы фэстываль песьні. Адкрыўся ён канцэртам «Час плыве, як рака», прысьвечаным памяці Чэслава Немэна. Асобным канцэртам падчас фэсту адзначыў 40-годзьдзе сваёй творчай дзейнасьці Кшыштаф Краўчык.

### Памёр Бэрстайн

У Лос-Анджэласе памёр кампазытар Элмэр Бэрстайн — аўтар музыкі да сотні галівудзкіх фільмаў, у тым ліку вэстэрнаў «Цудоўная сямёрка», «Забіць перасьмешніка». Марш-галёп, напісаны для «Цудоўнай сямёркі», стаў часткай рэклямы цыгарэт «Marlboro».

### Самая прыгожая лесьвіца

Барочная лесьвіца на плошчы Гішпаніі ў Рыме прызнана найпрыгажэйшай у Эўропе. Так вырашыла журы прафэсійных мастацтвазнаўцаў з 25 краін Эўразьвязу падчас апытаньня, зладжанага пад эгідай ЭЗ, ЮНЭСКА і Эўрабачаньня. Другое месца заняла лесьвіца парыскага Манмартру, трэцяе — лесьвіца ў храме Атэны на Родасе (Грэцыя).

### Фэст для Лёлека і Болека

Дзіцячы фэстываль мультфільмаў зь Лёлекам і Болекам — самымі вядомымі пэрсанажамі польскай анімацыі — мае адбыцца ў Вене (Аўстрыя) у 2005 г.

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl**

## Адкрыцьцё рок-сэзону

Рок-сэзон 2004/05 распачнецца пры канцы жніўня перанесенымі канцэртамі. «Ліцэйскі» канцэрт пройдзе ў клюбе «Бліндаж» (вул.Ціміразева, 8). **27 жніўня** там можна будзе пачуць «новую генэрацыю супольнікаў» — навучэнцаў і выпускнікоў Беларускага ліцэю ў праграме «Веру ў цябе!». Падтрымліваць маладых будуць гурты «Zet», «Garadzkija» і, мажліва, «Pomidor/off». Да канцэрту выкарыстаны легендарны слоган фэсту «Рок пасьля вакацыяў», пад якім у Парку Чалюскінцаў штогод давалі чаду ўсе вядомыя айчынныя рок-каманды. Пачатак у 18.00.

На **31 жніўня** ў «Рэактары» прызначаны вялікі сольнік «N.R.M.». Ад шараговых выступаў Вольскага і К° гэты будзе розьніцца тым, што слухачы наўрад ці засьпяваюць «Песьню пра каханьне» ды іншыя гіты. Музыкі абяцаюць сыграць мяшанку абсалютна новых песень і твораў, што звычайна на канцэртах не выконваюцца. Лідэр групы Лявон Вольскі сам адабраў гасьцей канцэрту. Перад выступам «энэрэмаўцаў» люд будуць разаграваць маладыя гурты — «Зьмяя» (яны прайшлі адбор на сёлетняе «Басовішча», але ня здолелі прыехаць) і «Крок». Пачатак а 19-й.

**Сяргей Будкін**




## Заслаўскі кірмаш

**28 жніўня** Заслаўе запрашае на сьвята аматараў рыцарскіх турніраў, танцавальных паказаў і каскадзёраў... Т.: 620-68-74

## DreaMuz

Парк «Dreamland» **29 жніўня** запрашае на музычны фэстываль «DreaMuz». У ім возьмуць удзел гурты «Нестандартны варыянт», «Праліў Дрэйка», «Мэдуза», «Бяз панікі», «LSD», «Шорах вуліц», «Нязмоўкныя». Пачатак а 14-й.

## Опэра

**30** (пн) – «Хаваншчына».
**2** (чц) – «Мадам Батэрфляй».

## Выставы

### Палестынцы і ізраільцяне

**Да 5 верасьня** ў Палацы мастацтваў працуе выстава «Бок у бок альбо твар у твар». Гэта фотарэпартаж швайцарца Жана Мано аб палестынска-ізраільскім канфлікце. Выставу складаюць больш за 50 фатаздымкаў, якія паказваюць будзённае жыцьцё Ізраілю і палестынскіх тэрыторый з 1949 да 2003 г.

### Дзень незалежнасьці Ўкраіны

У музэі сучаснага выяўленчага мастацтва **да 3 верасьня** працуе выстава «Да дня незалежнасьці Ўкраіны», а літаратурны музэй Янкі Купалы запрашае **да 15 верасьня** на выставу «Пайшло слова Тарасова горда, непакорна», прысьвечаную Тарасу Шаўчэнку. Гэтая выстава — своеасаблівы працяг кіеўскай выставы «Ішла доля беларуса з доляй украінца».

### Лялькі

Гасьцёўня В.Галубка запрашае **да 15 верасьня** на выставу мастака Тэатру лялек Яўгена Рачкоўскага. На ёй прэзэнтаваны ягоныя лялькі, эскізы, дэкарацыі...

## Клюбнае жыцьцё

**Рэактар** (229–74–38)
**27** (пт), 18.00 — вялікая рэп-акцыя (адкрыцьцё сэзону) і прэзэнтацыя зборніка «Маладая будучыня».
**31** (аўт), 19.00 — вялікі канцэрт «NRM». Квіткі: 10000 — 12000 руб.

**Графіці** (671–58–65, 266–01–54)
**31** (аўт), 20.00 — канцэрт гуртоў «Князь Мышкін» і «Нагуаль». Т.: 671-58-65.

**Bronx** (288–10–61, velcom: 103 і 105)
**26** (чц), 22.00 — клюбны чацьвер: dj Dust.
**27** (пт), 22.00 — «Live Jazz»: «Flat».
**28** (сб), 22.00 — «Start Party»: dj Box.

**Белая Вежа** (284–69–22, 239–16–00)
**26** (чц), 19.00 — dj Dee, White Tower: dj Top, dj Grizzly.
**27** (пт), 22.00 — «Euroclub», 22.00 — dj Mixell, go-go. Квіткі: 10000 — 20000.
**28** (сб), 22.00 — dj КірылOFF (Масква), go-go show (Масква). Квіткі: 25000 — 35000.
**29** (ндз), 22.00 — dj Alex (europop). Квіткі: 5000.

**Гудвін** (226–13–06)
**26** (чц), 21.00 — жывая музыка.
**27** (пт), 21.00 — жывая музыка.
**28** (сб), 21.00 — жывая музыка.

**Бліндаж** (219–00–10)
**26** (чц), 23.00 — dj's Egor/ Zolart.
**27** (пт), 18.00 — адкрыцьцё канцэртнага сэзону «Рок пасьля вакацыяў». Квіткі: 7000 (танцпол), 10000 (столік). Т.: 649-08-88, 766-24-25, 400-67-74.
**27** (пт). 23.00 — dj's Egor/ Zolart.
**28** (сб). 23.00 — dj's Egor/ Zolart.
**29** (ндз), 23.00 — dj's Egor/ Zolart.

**X-Ray** (223–93–55)
**27** (пт), 22.00 — dj-bar with dj Grizzly.
**28** (сб), 22.00 — dj-bar with dj Bergamo.

**Ямайка** (252–07–26)
**27** (пт), 2.00 — «The Afterparty»: dj Палены, dj Byasha.
**28** (сб), 2.00 — «The Afterparty»: dj Mitya, dj Dasha Pushkina.

## Менская кінаафіша з 27 да 29 жніўня

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Кепскія дзяўчаты»: **27—29** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.
«Троя»: **27—29** (пт—ндз) 17.30 (іл), 20.30.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Чалавек-павук-2»: **27** (пт) 13.30, 16.00, 18.30, 21.00; **28, 29** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Пітэр Пэн»: **27** (пт) 16.00, 18.00 (іл); **28, 29** (сб, ндз) 16.00, 18.00.
«Забіць Біла-2»***: **27, 28** (пт, сб) 20.30; **29** (ндз) 20.30 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Дзяўчына з Джэрзі» (прэм'ера): **27** (пт) 16.40, 18.50, 21.00; **28, 29** (сб, ндз) 14.30 (іл), 16.40, 18.50, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)
«Дзяўчына з Джэрзі» (прэм'ера): **27** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **28, 29** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)
«Чалавек-павук-2»: **27** (пт) 13:30, 16.00, 18.20, 20.40; **28, 29** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.20, 20.40.
«Законы прывабнасьці»: **27—29** (пт—ндз) 17.20, 19.20, 21.20.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Пакуты Хрыстовы»****: **27** (пт) 16.10, 18.40, 21.10; **28, 29** (сб, ндз) 16.10 (іл), 18.40, 21.10.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Забойная парачка: Старскі і Хатч» **27—29** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Чалавек-павук-2»: **27** (пт) 11.00, 13.30, 16.00, 18.30, 21.00; **28, 29** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.30, 16.00, 18.30, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Для дзетак

**опэра**
**3** (пт) — «Пітэр Пэн».

**кіно**

**«Аўрора»**
«У пошуках Нэма»: **27—29** (пт—ндз) 14.30.
«Дзеці шпіёнаў-2: востраў надзей, якія ня спраўдзіліся»: **28, 29** (сб, ндз) 14.00.

**«Берасьце»**
Зборнік мультфільмаў: **21, 22** (сб, ндз) 11.50.

**«Дружба»**
«Канёк-гарбунок»: **27** (пт) 10.30; **28, 29** (сб, ндз) 13.00.

**«Мір»**
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **20—22** (пт—ндз) 12.30.

**«Перамога»**
«Плянэта скарбаў»: **27—29** (пт—ндз) 14.00.

**«Піянер»**
«Тарзан»: **27—29** (пт—ндз) 10.20.
«Агент Кодзі Бэнкс»: **27—29** (пт—ндз) 12.20.
«Як Майк»: **27—29** (пт—ндз) 14.20.

КІНО Ў МЕНСКУ

# Вуліцы недабітых вампіраў

**«Начная варта» («Ночной дозор»)**
Расея, 2004, каляровы, 115 хв.
**Жанр:** Містычны баявік
**Адзнака:** 6,5 (з 10)



Гэтая карціна яшчэ не закуплена менскім кінапракатам празь фінансавыя складанасьці, але ўвагі вартая. Фільм ужо даступны на відэа і DVD.

Здаўна ідзе барацьба паміж сіламі Сьвятла і Цемры. Паводле Сяргея Лук'яненкі, за злом сочыць Начная варта, а за дабром — вядзьмарская Дзённая. Нечаканкай зьяўляецца тое, што сёньняшнія абаронцы дабра служаць у Гарсьвятле, а зло хаваецца ў прыцемку маскоўскіх цырульняў (Ільля Лагуценка) ці выстаўляе сябе на эстрадзе (Жанна Фрыске з гурту «Бліскучыя»).

Сцэнар фільму ўзмоцнены мэлядраматычнай лініяй згубленага й знойдзенага сына, але кіруецца першай часткай аднайменнай кнігі. Антон Гарадзецкі, апэратыўнік Начной варты, палюе на незарэгістраваных вампіраў і на падказкі савы Вольгі суцяшае самотную жанчыну з чорнай варонкай праклёну над галавой. Герой Канстанціна Хабенскага да болю нагадвае чарговага «мянта» з папулярных расейскіх сэрыялаў, толькі замест пісталета ў героя ліхтарык. А вось ягоны шэф — Вялікі Гесэр у выкананьні Ўладзімера Мяншова — гэта тыповы гаспадарнік-вяшчун з мудрымі звычкамі «намесьніка міністра СССР».

Пры такім раскладзе нават галоўны Цёмны, Завулон (Віктар Вяржбіцкі), які рухам рукі перакульвае машыны і робіць гадасьці паводле сюжэтаў кампутарных гульняў, абавязаны пазычаць з крымінальных тэлефільмаў пазнавальную распальцоўку.

Апэратар карціны Сяргей Трафімаў раней здымаў рэкляму, а рэжысэр Цімур Бекмамбетаў вядомы славутымі ролікамі банку «Імпэрыял». Так што насычаныя адмысловымі эфэктамі кадры нагадваюць шыкоўныя кліпы, якім, нягледзячы на імпэт, бракуе цёплай крыві.

«Начная варта», як і фільмы з Джэймсам Бондам, пад завязку набітая статуснымі гандлёвымі брэндамі, пра што навязьліва, але пасьпяхова паклапаціўся Канстанцін Эрнст, прадусар расейскага тэлеканалу ОРТ. Асобныя сцэны карціны ператвараюцца ў разгорнуты — і бляклы — камэнтар да рэклямных ролікаў. Але аднаго стомленага позірку Валер'я Залатухіна — у фільме звычайнага мясьніка і суседа-крывасмока — дастаткова, каб ажывіць зьніякавелы кровазварот. Гэтага нельга сказаць пра лыса-чарнявага Гошу Куцэнку, сталага ўдзельніка баевікоў, а ў «Начной варце» — Сьветлага мага-сэксапіла, якога бачыць у сьне мітусьлівая пасажырка аварыйнага самалёта («Аэрафлёт» ужо выказаў прэтэнзіі).

Густоўная іронія ў карціне выяўляецца праз дэсант звышнатуральнага ў штодзённасьць: кроў на сьняданак вампіры хаваюць у тэрмасе, нячыстая сіла нападае пад мульцяшныя крыкі, што нясуцца з тэлевізара. А для тых, хто выражыць успрымаць іронію сур'ёзна, гурт «Уматурман» на фінальных тытрах па-раздалбайску ўрачыстым рэпам растлумачыць, што адбывалася ў фільме на працягу дзьвюх гадзін.

Беларускі гурт «Drum Extasy» напісаў для «Начной варты» музыку — і яна вельмі дарэчна гучыць у карціне. Але чамусьці на афіцыйным сайце фільму беларускі гурт не пазначаны.

30 рыцараў з наваполацкага вайскова-гістарычнага клюбу «Жалезны воўк» узялі ўдзел у здымках карціны. Варта адзначыць, што сярэднявечныя бойкі, дасьпехі бязь целаў, чорная варонка з крумкачоў зьняты надзвычай відовішчна. Дзіцячая лялька на павуковых ножках (прывітаньне Карпэнтэру) і асабліва хрыбет нячысьціка, які ператвараецца ў меч, зробяць гонар дарагім амэрыканскім блякбастэрам.

Пра фільм пішуць як пра фантастычную прыпавесьць, але я не сьпяшаўся б гэта сьцьвярджаць.

Карціна — безумоўная падзея для расейскай кінаіндустрыі і для масавай сьвядомасьці. Гледачам ужо прапануюць далучыцца да Іншых — Сьветлых ці Цёмных, а ў Інтэрнэце віруе бурапенная дыскусія на гэтую тэму. Вось толькі людзям, траўмаваным імпэрскім досьведам, заўжды наканавана быць адно сыравінаю — ці то ў апэратыўных распрацоўках Сьветлых, ці то ў якасьці ежы для Цёмных.

Дарэчы, у кнізе Лук'яненка пісаў, што Сьветлыя магі ў масавым парадку працавалі ў ЧК — у фільме гэтага няма, але генэтычная повязь з Сыстэмаю неўпрыкмет адчуваецца.

Гэтае відовішчнае расейскае кіно вартае ўважлівага прагляду.

**Андрэй Расінскі**

празаічныя зацемкі...

Уладзімер Арлоў

# Паліхромная



Лёнданскіх галубоў разганяюць з дапамогаю мэгафонаў і адмыслова навучаных сокалаў. Зь пяці тысячаў птушак на пляцы застаецца дзьве сотні самых зацятых, што нагадвае колькасныя суадносіны ўдзельнікаў колішніх і цяперашніх акцыяў роднай апазыцыі.



Эмануэль Свэдэнборг верыў, што пад Лёнданам знаходзіцца яго падземны адбітак — горад з тымі самымі пляцамі, вуліцамі, прытонамі й піўніцамі, але населены нябожчыкамі, якія пакрысе ператвараюцца ў анёлаў або дэманаў.

Трэба меркаваць, што за два з паловаю стагодзьдзі сам вучоны і містык ужо набыў адпаведнае Божай волі канчатковае аблічча і, ня выключана, таксама рухаецца цяпер у такт маім вечаровым крокам па тагасьветным лёнданскім раёне Фінчлі, кіруючыся ў тамтэйшы паб «The Torrington», куды, хочацца спадзявацца, пускаюць як дэманаў, так і анёлаў — каб апошнія не адрываліся ад народу.

У згаданай установе я зь яшчэ большай надзеяю думаю, што зьмены ў гэтых Лёнданах-блізьнятах адбываюцца ўсё ж не сынхронна і няхай хаця б знакаміты швэд засьпее стары ўтульны інтэр'ер з учарнелымі дубовымі панэлямі ды ліпучымі ад «Гінэсу» сталамі, якія — на гэтым сьвеце — чулі некалі галасы Лява Гарошкі, Кастуся Акулы і мой уласны голас, калі ягоны ўладальнік да краёў наліваўся густым і цёмным ірляндзкім пітвом, не падазраючы, што праз дзесяць гадоў убачыць тут нешта накшталт менскай «Крыніцы», якая бруіцца на праспэкце Скарыны трохі наўскос ад КДБ.

Пасьля наведаньня дзясятка пабаў, зь якіх дзевяць ужо зьнявечаныя пад «стандарт», маніцца паслаць на неба блюзьнерскую sms'ку прыкладна такога зьместу: «Госпадзе, якую б іпастась ты ні абраў для мяне, — і анёлам, і дэманам буду антыглябалістам».

* * *

Некалькі ангельскіх прафэсараў-славістаў, якія часам выступаюць як экспэрты ў праблемах Усходняй Эўропы, а значыць, і маёй краіны, уважліва прагледзеўшы відэастужку зь менскімі вулічнымі акцыямі пад бел-чырвона-белымі сьцягамі, з хвіліну занепакоена пераглядваюцца. Нарэшце адзін з вучоных мужоў фармулюе агульнае пытаньне: ці няма ў гэтых дэманстрацыях і мітынгах нечага расісцкага? Адказваю непаразумелым позіркам, і прафэсар тлумачыць: яны ня ўбачылі сярод удзельнікаў ніводнага цёмнага твару.

Адразу ўспамінаецца, што ў клясе, дзе вучыцца сын лёнданскага прыяцеля, усяго трое белых — роўна столькі, колькі было ў вагоне падзямкі, калі ехаў на сустрэчу з экспэртамі.

Захад абавязкова дапаможа маёй сінявокай краіне.

Менскія вуліцы Маркса, Энгельса й Леніна, відаць, аблюбуюць жаўтаскурыя браты па розуме. Учора некалькі дэлегацыяў якраз такога колеру доўга заміналі мне зь сябрамі даступіцца да Марксавага надмагільля на Гайгейцкіх кладах, каб учыніць невялікі пэрформанс з прывезенай здалёк постмарксісцкай газэткай, пляшачкай і, на жаль, без забытага кавалка сала.

Духоўныя спадкаемцы Ўсамы бэн Ладэна, пэўна, атабарацца на Камуністычнай, дзе некалі быў прапісаны Лі Харві Освальд, якому малады Станіслаў Шушкевіч, калега з радыёзаводу, на заданьне начальства даваў урокі расейскай мовы. Цікава, а што прычынілася б, каб Станіслаў Станіслававіч узяўся вучыць амэрыканскага таварыша пабеларуску? Можа, колішні жыхар дому №4 абраў бы прыцэлам ня Джона Кенэдзі, а каго іншага?

* * *

Кожны раз у лёнданскім супэрмаркеце прыгадваю, як Адам Мальдзіс у сваім «Ангельскім дзёньніку» з выдадзенай за савецкім часам кнігі пра літаратуразнаўчыя вандраваньні пісаў пра цяжкую лёнданскую жытку дакладна наступнае: «Мясныя вырабы тут бяруць маленькімі порцыямі — па 50, а то і 20 грамаў». І штораз пачынаю разважаць, чыя рука вывела гэтыя радкі, прасякнутыя нясьцерпным болем за пазбаўлены паўнавартаснага харчаваньня ангельскі люд: ці то куратара кнігі з камітэту дзяржбясьпекі, ці то самога шаноўнага навукоўца, што, мабыць, мог сабе дазволіць у капіталістычным пекле ўзяць на папаску не празрысты мясны скрылёчак, а адразу паўкілі?

* * *

Знаёмы лёнданскі бізнэсовец Васіль (зь ягонага офісу адкрываецца шыкоўны выгляд на сабор Сьвятога Паўла) жанаты з латышкаю Антрай. Зь дзецьмі яны вырашылі размаўляць кожны на сваёй мове. У выніку, упершыню сутыкнуўшыся зь вялікім сьветам за сьценамі роднага дому, старэйшы з нашчадкаў зрабіў адкрыцьцё, якое ўразіла ягоную душу мацней за найшчадрэйшы калядны падарунак. Выявілася, што чалавецтва зусім не падзеленае на дзьве прыблізна роўныя палавіны, адна зь якіх, жаночая, гаворыць па-латыску, а другая, мужчынская, — па-беларуску.

* * *

Кембрыдж застанецца ў памяці залевай, што ўскаламуціла паўнівэрсытэцку засяроджаны Кем зь яго рамантычнымі мастамі. Магілы Фрэнсыса Бэкана ды Ісака Ньютана, папраўдзе, кранулі душу нязьмерна менш, чым жывы, румяны і ўжо слынны ў сваіх колах біёляг Вадзім, што залучыў на сустрэчу зь беларускімі візытантамі ня толькі братоў-славянаў, але й выкладчыка-вэнэсуэльца, які так праняўся нашай праблематыкаю, што выпіў большую частку Вадзімавых запасаў тэкілы й віскі, пасьля чаго, запіўшы іх чырвоненькім, паклікаў мяне на кухню й даў параду на наступных прэзыдэнцкіх выбарах галасаваць за іншага кандыдата.

Аднак мушу нясьціпла й эгацэнтрычна прызнацца: усе падзеі таго дня й не зусім цьвярозай ночы сьцьмелі ў параўнаньні з тым фактам, што першаю кнігай, якую прачытаў па-беларуску малады сьветач айчыннай біялёгіі, былі «Таямніцы полацкай гісторыі».

* * *

Чаго ў ранейшыя прыезды сюды не заўважаў, дык гэта лёнданскіх пальмаў. А ў прыморскім Маргейце наагул можна ўявіць, што ты ня ў Англіі, а дзе-небудзь на Кіпры.

Тут, у Маргейце, жывуць ангелец Джым і беларуска зь Менску Эла, якая зьяўляецца яшчэ адным пацьверджаньнем адвечнай, з часоў Рагнеды, пасіянарнасьці нашых жанчын, што ў дадзеным выпадку выяўляецца, у прыватнасьці, у беларускай мове народжаных у Англіі дачок Алены й Аляксандры.

У садзе пры доме жыве саракагадовая жаўла. Кажуць, гэты від затрымліваецца на сьвеце гадоў на дзьвесьце, таму нельга адназначна сказаць, што людзі трымаюць жаўлу. Магчыма, сама жаўла — і нябеспадстаўна — думае, што гэта яна трымае (ці трывае) чатырох уладальнікаў асабняку — толькі часовых спадарожнікаў ейнага пакуль бясклапотнага юнацтва.

Жаўле няма куды сьпяшацца, і яна адмаўляецца ад вандроўкі ў Дуўр ды лёгкай пачосткі пад акампанэмэнт прыбою. Экраны мабільных тэлефонаў паведамляюць, што мы знаходзімся ўжо ў Францыі. Між тым, дзесьці за марскім далягладам яшчэ ляжаць ангельскія высьпы, якія ў другую сусьветную вайну былі занятыя немцамі. Жыхары высьпаў арганізавана здалі акупантам сваіх габрэяў, пашыліся ў калябаранты і спакойна чакалі вызваленьня.

* * *

Ангельцы чамусьці ня любяць згадваць пра няхай не маштабны, але яўны суўдзел астраўных суайчыньнікаў у Галакосьце. Не выклікаюць прыліву энтузіязму й пытаньні, чаму ў траўні 1945-га старая добрая Брытанія, парушыўшы ўсе канвэнцыі й гарантыі, выдала Савецкаму Саюзу на верную сьмерць казацкі стан атамана Даманава — 20 тысяч чалавек з улікам жонак, дзяцей і старых. Казакі згаджаліся здацца адно брытанцам, і тыя прысягнулі, што бальшавікам іх не аддадуць.

Што праўда, выдалі ня ўсіх — шмат хто пасьпеў скончыць самагубствам або загінуў пры супраціве. З тысячаў выратаваліся адзінкі. 80-гадовага героя першай сусьветнай генэрала Краснова, што, як і большасьць палонных казакаў, ніколі ня быў савецкім грамадзянінам, павесілі ў Маскве. Самога Даманава энцыкляпэдыя «Брытаніка» проста (дакладней, якраз ня проста) ня згадвае, а здрадніцкія паводзіны Лёндану тлумачыць ялцінскімі пагадненьнямі.

Менавіта пра гэтыя пагадненьні піша сьвежы «Лондонский курьер». Аўтар б'ецца над загадкаю: чаму Масква пайшла на вяртаньне Захаду «сваёй» часткі Аўстрыі? Разумела ж, што адкрыюцца вусьцішныя факты. Напрыклад, тое, што ў год перамогі ў Вене не засталося ніводнай не згвалтаванай вызваліцелямі жанчыны.

Ялту журналіст трактуе як першую здраду брытанцаў і амэрыканцаў. Чэрчыль ведаў, што чакае ўсходнеэўрапейскія краіны пад ярмом Масквы, але пагадзіўся аддаць іх Сталіну. Казакі — другая здрада.

Карацей, рэпутацыя брытанскіх джэнтэльмэнаў як самых справядлівых і бесстаронніх на сьвеце ня раз трапляла ў XX стагодзьдзі пад сумнеў. І таму, аддаючыся ў рукі ангельскага правасудзьдзя, Закаеў, безумоўна, рызыкаваў. Аднак гэтым разам Масква прайграла. Суд прызнаў хлусьлівымі паказаньні абсалютна ўсіх сьведкаў абвінавачаньня, улучна з расейскім міністрам, а сытуацыю ў Чачэніі назваў не барацьбой з тэрарызмам, а вайной за незалежнасьць або — грамадзянскай (фармулёўка прысуду дазваляе абедзьве інтэрпрэтацыі).

Застаецца дадаць, што ўжо тут, у Лёндане, Закаеў мог чытаць маё эсэ пра незалежнасьць, перакладзенае летась на чачэнскую мову Зэлімханам Яндарбіевым, што калісьці разам зь Леанідам Галубовічам вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве.

* * *

Адна рэч, калі госьці з, так бы мовіць, мэтраполіі сустракаюцца з эмігрантамі, якія й наладзілі візыт, і зусім іншы каленкор, калі ў цэнт-

...з паэтычным пастскрыптумам

# Брытанія

ры Лёндану арандуецца заля, а абвесткі пра літаратурную вечарыну з платным уваходам разьмяшчаюцца ў мясцовай расейскай, польскай ды ўкраінскай прэсе (беларускай проста няма).

Сэрца кранае мэнтолавы халадок: як паводзіцца, калі ня прыйдзе ніхто? Што ім, у сталіцы Злучанага Каралеўства, няма куды пайсьці і няма чаго ўзяць на вечар? З другога боку, а раптам зьявяцца пэрсоны зусім невядомыя ці, наадварот, вядомыя з партрэтаў на газэтных старонках?

Не, дзівосаў (калі не лічыць, што заля запоўненая) не здараецца. Закаеў зь Беразоўскім занятыя іншымі справамі, хоць, трэба сказаць, кожны мае да маёй разнажанравай пісаніны нейкае дачыненьне. Расейскі алігарх, да прыкладу, некалі кіраваў выканкамам СНД, прычым быў прызначаны на пасаду ў той момант, калі ў 1997-м Беларускі гуманітарны ліцэй адбіваў першы націск уладаў. На менскі стол Барыса Абрамавіча лёг напісаны мною ад імя бацькоў зварот, на які алігарх наклаў рэзалюцыю: разабрацца. Казалі, гэты ход адыграў сваю ролю.

Тамары Віньнікавай у залі таксама няма (ну, хіба што прыйшла з накладной барадой).

Затое прысутнічае нейкі літоўскі кінадзяяч Саўлюс, сэрца якога датуль вярэдзяць праблемы гістарычнай ды этнаграфічнай прыналежнасьці Вільні й Віленскага краю. Наўрад ён разьлічвае знайсьці ў беларускага пісьменьніка гарачую падтрымку, аднак не пасьпяваю раскрыць рот, каб прамовіць нешта талерантнае, як сярод публікі падымаецца тутэйшы прадпрымальнік Тадэвуш, што некалі трымаў там, у Вільні, кавярню. Ягоны сьпіч прымушае Саўлюса ўсклікнуць: «Каким ужасным белорусским шовинизмом повеяло на меня от ваших слов!»

«Беларускі шавінізм» — нешта новае. Можа, гэта ўсьцешлівая прыкмета ачуняньня нацыі?

Але сапраўдным аздабленьнем сустрэчы робіцца выдатна захаваная жыхарка Лёндану — з тых, што ў вайне з Хронасам пераходзяць у пасьпяховыя контратакі і ў семдзесят здаюцца саракагадовымі. Прыгажуня без узросту вельмі празрыста намякае, што пэўны час была музай Андрэя Макаёнка й згадвае, як слаўна яны з Андрэем ды Іванам Пятровічам «куролесили». Для неабазнаных у беларускім літаратурным працэсе дама ўдакладняе, што Іван Пятровіч — наш «классик» Іван Шамякін.

Як потым высьвятляецца, у залі затаіўся і консул беларускае амбасады. «Сьмяяўся там, дзе трэба», — камэнтуе наяўнасьць адказнай асобы перакладчык доктар Дынглі.

* * *

Трафальгарскі пляц выглядае пустэльна й сумна. Мэрыя забараніла турыстам карміць тут галубоў. Птушкам, адпаведна, забаронена на пляцы зьбірацца. Кара (для бяскрылых) — 50 фунтаў. Пастанова грунтуецца на тым, што галубы прыносяць гістарычнай спадчыне шкоду. Чым — нескладана зразумець, калі ўспомніць, як у Менску раз-пораз мыюць з брандспойту засраны помнік таварышу Дзяржынскаму. (Ужо гадоў дзесяць каля яго не даводзілася бачыць аніякіх кветак, адно гаўно.)

Лёнданскіх галубоў разганяюць з дапамогаю мэгафонаў і адмыслова навучаных сокалаў. Прэса піша, быццам з ранейшых пяці тысячаў птушак на пляцы застаецца блізу дзьвюх сотняў самых зацятых, што нагадвае колькасныя суадносіны ўдзельнікаў колішніх і цяперашніх акцыяў роднай апазыцыі.

На поўдзень ад калёны адмірала Нэльсана нібыта ёсьць мясьціна, што юрыдычна не належыць да тэрыторыі пляцу, і туды, як сьцьвярджаюць знойдзеныя птушынымі сябрамі дакумэнты, галубам можна зьлятацца законна й беспакарана. Гэткі тамтэйшы птушыны Бангалёр.

* * *

Галерэя Тэйт, што на пачатку 1990-х здалася своеасаблівым падручнікам авангардызму, пасьпела кланавацца. Новая галерэя, у якую ператвораны карпусы былога заводу ці электрастанцыі, найбольш уражвае інсталяцыяй у галоўнай залі: з тэрасы на другім ярусе гляджу на агромністае «сонца», залацістую смугу, дзе губляецца высачэзная столь, і на сахарскі краявід на доле, пасярод якога, падклаўшы пад галаву заплечнік, прывольна разьлеглася аматарка мастацтва з поклічна раскінутымі нагамі. Не хапае толькі мяне.

* * *

На вячэру да найбуйнейшага ў ангельскамоўным сьвеце спэцыяліста ў беларускай літаратуры прафэсара Арнольда Макміліна мы кіруемся ў кампаніі найбуйнейшага ў сьвеце наагул адмыслоўца ў беларускіх уніяцкіх сьпевах Гая дэ Пікарды. На аўтобусным прыпынку каля гатэлю, дзе некалі спыняўся Ленін (паводле нашага вучонага спадарожніка, «сімбірскі сыфілітык»), спадар Гай зьнячэўку пачынае сьпяваць песьні італійскіх і нямецкіх фашыстаў. Маленькі імправізаваны канцэрт сьведчыць: нялюдзкія ідэалёгіі (хоць Мусаліні супроць Гітлера — гэта як цацачны воўк перад ваўком сапраўдным) нараджаюць вельмі нават мілагучныя творы, якім наканавана жыць шматкроць даўжэй. Ars longa!

* * *

Мне не выпадала спаткаць прафэсара, якога Бог надзяліў бы гумарам шчадрэй за Макміліна. Адна зь вельмі нешматлікіх рэчаў, цалкам сур'ёзна паведамленых гаспадаром падчас вячэры, — той факт, што ён толькі што скончыў у сваёй гісторыі сучаснай беларускай літаратуры разьдзел, прысьвечаны паэзіі Анатоля Сыса.

Першая жонка Макміліна, ангелька, у разводным пратаколе напісала, што сабак муж любіў болей за яе. Шлюб з другой, Сьвятланай зь Пецярбургу, склаўся, як выглядае, больш шчасьліва. Магчыма, і з тае прычыны, што нідзе ў Англіі іхняя традыцыйная страва — засмажаная барановая нага — не была згатаваная нам настолькі смачна.

* * *

Пра гэта ня надта хочацца, але трэба напісаць: у лёнданскай Беларускай бібліятэцы імя Францішка Скарыны, дзе ўчора я гартаў сьвежы нумар «Нашай Нівы» і «Кроніку Эўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваніні (Кракаў, 1581), усё часьцей агортваюць сумневы й трывога. Што будзе зь бібліятэкай і з усёй Беларускай каталіцкай місіяй, зь лёнданскім «Домам марыянаў»?

Айцец Аляксандар Надсан у сваіх публікацыях давёў, што беларуская ахвярнасьць марыянаў — шмат у чым, на жаль, толькі прыгожы міт, пачынаючы ад, далікатна кажучы, непрыстойнай гісторыі з дыямэнтавым кальле Магдалены Радзівіл (княгіня-мэцэнатка мусіла нават прыгадаць сёмае Божае прыказаньне) да перадачы Ватыкану набытай на сродкі беларускіх эмігрантаў зямлі й маёмасьці Каталіцкай місіі.

Пры ўсім даволі хваравітым стаўленьні да апошняй хвалі эміграцыі, хочацца кінуць на яе позірк, поўны надзеі, верачы, што паміж гэтых людзей ня толькі аматары выгодна ўладкавацца й выкрадальнікі Скарынавых выданьняў, але і тыя, дзякуючы каму яшчэ праз дзесяць гадоў на парозе дому №37 на Holden Road у раёне Фінчлі мяне не сустрэне ліпучы позірк тамтэйшага магамэтаніна, зь якім нават ня вып'еш захопленую ў дарогу пляшку «Беларускага бальзаму».



*P.S.*

## У Англіі

У Англіі ёсьць каралева
і ветлівыя палісмэны.
У Англіі
жывуць шэрыя вавёркі
і гарадзкія лісіцы.
У Англіі
смачныя пірагі з ныркамі.

У Англіі
ёсьць магіла Карла Маркса,
якую можна засласць
газэтай «Советская Б.»
і выпіць,
каб капіталісты ўсіх краінаў
зьядналіся.

У Англіі
растуць магноліі,
а на сьнядан бываюць
сьвежыя суніцы.

Але ў Англіі
няма цябе,
і твайго
зьлёгку санлівага позірку,
і тэлефонаў з тваім голасам.

У Англіі
няма прэзыдэнта
і Таварыства ангельскай мовы.
У Англіі
няма плаўленых сыркоў
і бурштынавага напою «Крыжачок».

Але ў Англіі
няма цябе,
і тваіх нестандартных ножак,
і адважнай фрызуркі,
што марыць
зусім не пра грабеньчыкі.

У Англіі
ёсьць магчымасьць застацца
і піць каву на Пікадылі,
стаць сваім сярод галубоў
Трафальгарскага пляцу
і паіць «Гінэсам»
знаёмую лісіцу
ў раёне Фінчлі.

Але ў Англіі
няма цябе,
і твайго шэпціку,
сатканага з самых пяшчотных
і самых грубых слоў,
што казычуць вуха
пёркамі дзівосных фантазій.

А таму
я куплю для нас зь лісіцай
пляшку ірляндзкага лікёру
і мы абыходзімся
бяз закусі.
Лісіцы ня плачуць,
толькі даверліва глядзяць у вочы.

Пад белымі скаламі Дуўру
нецярплівы чакае паром,
дзе я вып'ю за тое,
што пада мною свойскі Ля-Манш,
які рыфмуецца са словам «наш»,
а тады накіруюся ў WC, каб,
пабыўшы алегорыяй крыніцы,
учыніць дэфлярацыю
цнатліва белай ангельскай сьцяны.
Аднак гэта ўжо зробіць да мяне.
О, жывы подых радзімага кантынэнту!
На ім няма Англіі,
Але ёсьць ты,
і дзесьці за Францыяй і Галяндыяй,
за Бэрлінам і Варшавай,
за Івацэвічамі й Койданавам
ты сташ ля акна
з келіхам у тонкай
цёплай руцэ
і чуеш, як родны памежнік
кажа мне:
«Здравствуйте!»

## НОВЫЯ КНІГІ

**Беларуская культура сёньня'2003:** Гадавы агляд / М-ва культуры; Дзярж. інт праблем культуры. — Менск: БелДІПК, 2004. — 260 с. 300 ас.

Агляд засьведчыў няспынны рост колькасных і якасных паказьнікаў у галіне культуры: павялічваюцца заробкі бібліятэкараў і артыстаў, маладым талентам аказваецца «рэальная фінансавая дапамога», матэрыяльная база ўстаноў культуры робіцца ўсё больш «стабільнай і трывалай», а кінамастацтва ўвогуле ператвараецца ў «пазытыўны вэктар сацыяльнай палітыкі».

**Даклад аб чалавечым разьвіцьці-2004: Культурная свабода ў сучасным разнастайным сьвеце** / Выдадзена для Праграмы разьвіцьця ААН. — Менск: Тэхналёгія, 2004. — 286 с.: іл. 500 ас.

На якім месцы знаходзіцца Беларусь паводле рэйтынгу чалавечага разьвіцьця? Што за фактары вызначаюць гэты паказьнік? Які зьмест укладаецца сёньня ў панятак «культурная свабода»? Ці магчымая пабудова дэмакратычнага грамадзтва й эканамічны росквіт у краіне, дзе няма роўнае павагі да мовы, рэлігіі й нацыянальнага самавызначэньня яе мясцовага насельніцтва, так і меншасьцяў? Ці ёсьць узаемасувязь паміж узроўнем сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця дзяржавы й ступеньню культурнай свабоды грамадзян? Гэты «Даклад» — шматаспэктнае незалежнае дасьледаваньне, у якім моваю фактаў адстойваюцца «прынцыпы паважлівага стаўленьня да разнастайнасьці й пабудовы грамадзтваў, дзе ёсьць месца ўсім». Аналітычныя агляды, карты, схемы, паказьнікі, табліцы, багатыя на інфармацыю.

**Камоцкі А. Наспадзяванае:** Вершы і песьні. — Менск: Радыёла-плюс, 2004.

Паліграфія ўражвае: афсэтная папера, шаўковая лясэ, скругленыя карэньчык, уклееныя ўручную каляровыя мастацкія здымкі. Пад цьвёрдым пераплётам сабрана напісанае Камоцкім пры канцы мінулага стагодзьдзя. Філязофскія развагі стаяць поруч з анакрэантычнымі матывамі, рэфлексіі самотніка — з элегічнымі шкадаваньнямі, лірычныя замалёўкі — з самаіранічнымі досьціпамі. А яшчэ ёсьць у зборніку такая дасканалая субстанцыя, як цішыня.

**Мілінкевіч А. Воўчынская гісторыя.** — Горадня, 2004.

Менавіта ў Горадні 25 лістапада 1795 г. закончыўся манархаў шлях Станіслава Панятоўскага. Пасьля гэтага ён заставаўся ў горадзе амаль два гады, але быў фактычна вязьнем Новага замку. Памёр пры цару Паўлу І у Пецярбургу 12 лютага 1798 г. Тады й пачаўся трагічны лёс труны зь целам былога караля. Шыкоўнае развітаньне, 18-тысячная пахавальная працэсія — і знаходжаньне парэшткаў у напаўразбураным Троіцкім касьцёле ў Воўчыне, што на Берасьцейшчыне.

Цікавасьць выклікаюць разьдзелы кнігі, у якіх гаворка вядзецца пра збор доказаў сапраўднасьці труны з парэшткамі караля. Першыя дасьледаваньні былі зробленыя ў 1987 г. гісторыкам Міхасём Ткачовым, рэстаўратарам Уладзімерам Кісьлым, Аляксандрам Мілінкевічам і яго сынам-школьнікам Сашам.

Зьвесткі краязнаўцаў надалі штуршок справе перавозу парэшткаў Станіслава Панятоўскага ў Польшчу 14 сьнежня 1988 г. Аляксандар Мілінкевіч і Ўладзімер Кісьлы былі ўзнагароджаны ордэнамі «Заслужаны для польскай культуры».

Усё пра Панятоўскага — у новай кнізе.

**Пілецкі В. Генэзыс выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў гісторыі Беларусі:** Манагр. — Менск: БДПУ, 2004. — 237 с. 100 ас.

У кнігарні «Веды» 5000 руб.

**Шылько Т. Скажы па-беларуску:** Дапам. для выхавальнікаў і бацькоў. — Менск: УП «Рэдакцыя нав.-мэтад. час. "Пачатковая школа"», 2004. — 56 с. 2000 ас.

Аўтарка прапануе «гульнёвыя» заняткі для навучаньня малечы беларускаму слову. У садках і дома дашкаляты змогуць засвоіць лексыку, якая адлюстроўвае зьявы жыцьця: поры году й месяцы, дні тыдня, колеры вясёлкі, адзеньне, абутак, ежу, посуд, назвы свойскіх і дзікіх жывёл. Дзеткі навучацца называць сваё імя, распавядаць пра сям'ю. Цана 2300 руб.

**Эўрапейскі Саюз: Што гэта такое?:** Кароткі інфарматар / Беларускае Шуманаўскае таварыства; Польскі фонд Рабэра Шумана; Пад рэд І.Лялькова. — Менск–Варшава, 2004. — 80 с.

**Долготович Б. Адмиралы земли белорусской** / Под ред. В.Пастухова. — Минск: Технопринт, 2004. —140 с. 500 ас.

Кніга пра беларусаў, што зьвязалі лёс з морам. Упершыню сыстэматызаваныя зьвесткі пра адміралаў беларускага паходжаньня. Выдана пры падтрымцы Беларускага саюзу вайсковых маракоў. У «Акадэмкнізе» 9050 руб.

**Тацяна Вабішчэвіч, УС, Антон Лабовіч**

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У №30 аўтарства кнігі «Ад каранёў да кроны» прыпісана пісьменьніку, крытыку, стваральніку неадназразова перавыдаванага «Буквара» Анатолю Клышку. Насамрэч гэты таленавіты паэтычны зборнік — плён шматгадовай працы кандыдата тэхнічных навук Алеся Клышкі, супрацоўніка Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту. Прыносім выбачэньні за памылку.

АЛІМПІЯДА ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Юлімпіяда



Падзеі апошняга тыдня далі падставу для карэкцыі дзяржаўнага гімну: мы, беларусы, ня мірныя, а хуткія людзі.

Тузін мэдалёў, атрыманых беларускімі атлетамі, вярнулі інтарэс беларускага абывацеля да Афінаў. Але дастаткова было аднаго. Мэдаля, які ўзяла Юлія Несьцярэнка ў спрынце. Так выйшла, што прэстыжная катэгорыя спорту, акалічнасьці перамогі і асоба чэмпіёнкі прыйшліся да густу ўсім слаям нацыі.

Задаволеныя ўлады. Трыюмф Несьцярэнкі сымбалічна кампэнсуе правал першых дзён спаборніцтваў і відавочны аблом з устаноўкай на 25 мэдалёў. Цяпер няцяжка прыкінуць, як будзе адбывацца пасьляалімпійскі разбор палётаў. Ня будзе татальнага лякаўту трэнэрскага складу і пэрсанальнага славеснага апускалава: «Я цябе на памойцы знайшоў, а ты…» Галоўны сябар беларускіх фізкультурнікаў, натуральна, пажурыць лузэраў, а потым пяшчотна павіншуе Юлію. Іх парны здымак будуць доўга смакаваць.

Задаволеная апазыцыя. Праблемы з уключэньнем Несьцярэнкі ў склад зборнай далі падставу Старыкевічу назваць спартоўку «апальнай». Цяпер можна юзаць тэму, што рынкавы сацыялізм ня здольны разгледзець талент. А вось калі б у нас быў рынак і інвэстыцыі!

Задаволеныя левыя. Сям'я чэмпіёнкі сьвету ня мае асабістай кватэры і жыве ў інтэрнаце (!), што цэмэнтуе міт аб тым, што соль нацыі — ня нобілі, якія шпуляюць боўлінг-шары ў «Мэдысан-клюбе», а звычайныя людзі.

Задаволеныя правыя. «Я веру ў Бога і думаю, што Бог, убачыўшы ўсе мае намаганьні, вырашыў мне дапамагчы», — з цытаты Юліі на прэс-канфэрэнцыі. Без камэнтароў.

Задаволеная буржуа. На фоне відавочнага дэфіцыту яскравых асоб на беларускай сцэне фотагенічная Несьцярэнка — проста скарб. Сваім візуальным прыкладам яна можа выклікаць масавы інтарэс да спажываньня таго ці іншага прадукту. Цікава, якія білборды з выявай Юліі і спартшоты да іх мы ўбачым найбліжэйшым часам?.. «Бягу з чэмпіёнскай хуткасьцю, каб падпісацца на «Беларусь сегодня» і пяць дадаткаў да яе» або «Адзінае, чаго я не магу перагнаць, — «Фальксваген-Бора»?

Ня дай, натуральна, Бог — «Я веру ў Прэзыдэнта. Таму я галасую за трэці тэрмін».

Нават нэафашысты — такія далёкія ад спорту чувакі — у стане сатысфакцыі. Напярэдадні Алімпіяды, тусуючыся ў Англіі, прачытаў заклік «Брытанскай нацыянальнай партыі» не падтрымліваць зборнай яе Вялікасьці з прычыны перадозу ў яе складзе чорнаскурага элемэнту. Цяпер вэбфорумы нэанацыкаў канчаюць: «Дык здольная ж Бэн Джонсанаў сваіх і спрытных на ногі Льюісаў раса белая раджаць!»

Задаволены, мяркую, нават калгасьнікі, якія ў экстазе рэкордных тэмпаў уборкі збожжа некасьцярожна выклікалі алімпійцаў на спаборніцтва. Маштабы подзьвігаў аграрных Гераклаў выклікалі насьцярогу нават у Яго, ня кажучы пра дзяржкантроль.

Фэномэн грамадзтва відовішча — цяпер Юлія самы ўплывовы чалавек у краіне. Яна можа стаць першай прыгажуняй краіны (кастынг яшчэ працягваецца), дэпутаткай палаткі, кандыдаткай ад апазыцыі на выбарах 2006 г.…

Выбар за «беларускай ракетай».

**Лёлік Ушкін**

Запрашаем у падарожжа
**на Крапівенскае поле**
**4—5** верасьня
з заездам у **Белую Царкву, Смаляны і Воршу;**
**12** верасьня
па маршруце:
**Менск—Полацак—Верхнядзьвінск—Сар'я—Асьвея—Мёры—Менск.**
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал).

КАІСА

## Гульня ціхіх імпэрыялістаў-2

Некаранаваны чэмпіён краіны па го працуе інжынэрам на паліграфкамбінаце. 50-гадовы Аляксандар Супонеў навучыўся расстаўляць чорныя і белыя камяні ў 1985 г., цяперака мае першы дан, што адпавядае ўзроўню моцнага аматара. Выступаў на двух чэмпіянатах сьвету — у 2002 і 2004 г. На чэмпіянаце Эўропы займае месца ў другой сотні.

Іншыя беларусы адстаюць сама менш на чатыры прыступкі, маючы чацвертае кю. Аднак у апошнія пару гадоў го разьвіваецца бурна, беларусы шмат гуляюць у Інтэрнэце. 8-гадовы Дзіма Здановіч заняў трэцяе месца ў дзіцячым Чэмпіянаце Эўропы (сярод падлеткаў да 12 год).

Вось што расказаў для «НН» А.Супонеў:

— У сярэдзіне 1980-х у Менску ўтварылася група аматараў го, мы зьбіраліся ў Палацы шахмат і шашак. З пачатку 1990-х я кірую незарэгістраванай фэдэрацыяй го Беларусі, якая ў 2001 г. уступіла ў сусьветную. Два разы на тыдзень ладзім гульні ў БДУ.

Го падабаецца мне багацьцем вобразаў. Шмат якія хады называюцца вельмі паэтычна: «скачок малпы», «любаваньне кветкай лётасу». Як правіла, найпрыгажэйшая расстаноўка камянёў — самая эфэктыўная. Яшчэ цікава, што ў го нічыя — выключны выпадак (бадай, адзін на 10000 гульняў). Увогуле гульня можа скласьці канкурэнцыю шахматам: прызы ў эўрапейскіх го-турнірах пастаянна павялічваюцца.

**ВР**




**5** верасьня
запрашаем у вандроўку
**Старажытны Тураў**
Палескія краявіды і дух старажытнага гораду
Старадаўнія сьвятыні і сучасныя сьвяты
Усё гэта толькі разам з намі!
Т.: 222-88-76 http://altusplus.narod.ru
Кошт: 25000 рублёў

«Наша Ніва» дзякуе Ігару Хаменку, Вераніцы Кудравец, Дзянісу, спадарыні К., Вользе Б., Андрэю, Аляксею Я., Андрэю С. і Зьмітру П. (усе зь Менску) за ўчасную дапамогу.

## Як бы вы згулялі?

**Партыя Гільгевіч – Войцех (Менск, 1960) нагадвае расстаноўку ў го: белыя атачылі чорнага караля. Ход белых, і яны абвяшчаюць мат за 3 хады.**



Адказ на гэтае заданьне: 1. Сh5+! Кре6 2. f5+! Крd5 3. Фd4X.

САМІ ТАКІЯ

# То кіно

«Канфеткі, бараначкі!» — у каторы раз за вечар, глынуўшы прэпарату «Мэзым», пяе цётка-ненажэра. У вясковай хаце ля тэлевізара сабралася ўся сям'я.

— От баба гадкая — не люблю я яе, — дзеліцца ўражаньнямі ад рэклямы бабуля.

— Чаму? — дзівяцца маладзейшыя.

— Хай бы яна што харошае сьпела, а то ўсё канфеткі-бараначкі!

* * *

— Бач ты, страшыдлы, а шкадуюць адно аднаго! — кажуць старыя падчас прагляду фільму «Кінг-Конг жыве».

* * *

«Дорогой, у тебя перхоть!» — зь нечуванай трагедыяй у голасе прамаўляе дзяўчына з экрану. П'янаваты дзядзька на канапе ня можа не адгукнуцца на чужое гора:

— Ну, калі ўжо радзіўся пархатым, нічога тут не паробіш.

* * *

«Все мы, бабы, стервы!» — пяе-захліпаецца Ірына Алеграва.

Немаладога веку тэлеглядачка ня мае моцы трываць абразы. Яна падскоквае да тэлевізара і пачынае ў экран дулі круціць:

— На табе, на табе! Сама сьцерва, сама такая! А я ня сьцерва, я ўсю жызьню на фабрыцы чэсна работала.

* * *

Сустрэліся дзьве аднаклясьніцы, у мінулым вучаніцы школы для разумова адсталых. Абедзьве прыхільніцы вяшальнай праграмы абласной тэлевізіі. Адна і хваліцца:

— Я ж у Магілёў пісьмо напісала: я маці-адзіночка, люблю вашу праграму, прашу выслаць мне тысячу даляраў і двух мядзьведзяў ды паказаць гэтых мядзьведзяў па тэлевізары.

— Ці ты дурная? — пытаецца другая. — Сама падумай, які ў іх там зарплаты, дзе яны табе тысячу даляраў возьмуць? Дый як мядзьведзяў праз тэлевізар пераслаць можна?!

* * *

Ідзе рэклама селядцоў «Маціас». Чарнявы, укормлены хлапец у акулярах ня першы месяц ласуецца селядцамі на вачах усёй краіны.

— І калі ўжо той жыд наесца? — пытае са скрухаю стары вясковец.

* * *

11 верасьня 2001 году заўзятых грыбнік прыехаў на пабыўку ў родныя мясьціны. Дзень па лесе хадзіў. Увечары пад'еў, трохі выпіў і сеў свае грыбы перабіраць. Аж чуе, сястра з залі на ўсю хату гукае:

— Братка, братка! Амэрыку бамбяць!

— То кіно, — спакойна кажа грыбнік, выцягваючы з кошыка чарговую балацянку.

**Тацяна Барысік, Магілёў**

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІТАНЬНІ

**Віншуем Чарняеву Марыю** з выбарам на карысьць сям'і. Нагадуй з мужам як мага болей дзетак-беларусікаў. 98-ГІС

**Аршанскія прыхільнікі** творчасьці У.Арлова віншуюць яго з днём народзінаў

**Крапіўна-2004** чакае. Фэст адбудзецца 4 верасьня. Пачатак а 18-й гадзіне

**Віншуем Сяргея Патаранскага** і Кацярыну Тычыну з нараджэньнем Эўфрасіньні Менскай!

**Другую ліцэйскую сям'ю** — Патаранскіх і Тычынаў — віншуем з нараджэньнем дачкі Эўфрасіньні!

**Нашаніўцы** віншуюць Беларусь з нараджэньнем Эўфрасіньні Менскай!

КНІГІ

**Набуду** «Энцыклапэдыю гісторыі Беларусі» (1, 3, 4, 5 тамы ці ўсе разам), «Археалёгію Беларусі» (т.1). Прадам збор твораў Кандрата Крапівы (т.3—5), «Лексычны атляс беларускіх народных гаворак» (т.3, 5), «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (т.13, 15, 18, 19), «Рэканструкцыю неба» В.Гапеевай. Т.: 8-029-707-40-01, 234-93-71

**Да 850-годзьдзя Мазыра!** Юбілейныя майкі і кубкі з гербам гораду. Беларускія CD і аўдыё. Т.: 73-307-13

**Бясплатная раздача** добрых беларускіх кніжак за падпіску на «Наша слова» ды «Новы час», іншыя прапановы па кнігах, часопісах, відэа, аўдыё, значках, майках, CD на Румянцава, 13 (Таварыства беларускай мовы) з панядзелка па пятніцу (11.30—17.00). Т.: 8-029-707-40-01. Запытвацца ў Сержука Гуркова

**Кнігаабмен**. Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Прапаную: «У нашай Лівоніі», «Мэтрыкіяна», «Леў Сапега» і інш. Распаўсюд. Выдавецкія праекты. Т.: 8-029-753-91-96

КОТКА

**Шукаю новага гаспадара** для маёй коткі. Вымушаны, бо ў мяне алергія. Калі ласка, дапамажыце! Т.: 232-23-09, 686-07-27

ПАКОЙ

**Дзьве студэнткі** здымуць пакой у Менску. Т.: (8-01561) 20-812

ПРАПАНУЕМ ПРАЦУ

**Тэрмінова шукаем** жанчыну для догляду нецяжкахворай на некалькі гадзін у тыдзень, у раёне Аўтазаводу. Тэлефанаваць з 20.00 да 22.30. Т.: 284-36-59, Тацяна

**Ангельская і швэдзкая мовы** зь беларускамоўнай рэпэтытаркай! Вопыт выкладаньня, замежныя стажыроўкі. Т.: 202-97-20. Наста

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Зьмітру П.** Пра Апета ня будзем друкаваць.

**Міхасю Б. з Магілёва і Ўладзімеру Л. з Слоніму.** На пальцах адной рукі можна пералічыць трэнэраў, што выкладаюць правілы шахматаў па-беларуску. Таму шахматная тэрміналёгія дагэтуль не ўсталялася. Побач зь «пешкай» і «жаўнерам» фігуры «латнік», побач з «ладзьдзёй» і «турой» — «вежа», «тур». «Усе гэтыя назвы варта прапагандаваць як альтэрнатыўныя», мяркуюць філёлягі С.Запрудзкі і У.Рагойша. Час сам вырашыць, як лепей называць фігуры. «НН» будзе трымацца таго варыянту, які выбраны, пакуль няма адпаведнага нарматыўнага рашэньня мовазнаўцаў.

**А.У. з Гомеля.** Ваш ліст перадамо Юліі Несьцярэнцы.

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фота-рэдактар — Арцём Лява
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 4367. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 21.00 25.08.2004.

Замова № 5238.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а